**История (отечественная и всеобщая)**
**Тэма: Гуманістычная і асветніцкая гістарыяграфія**

**1.** Гуманістычная гістарыяграфія Італіі
**2.** Гуманістычная гістарычная думка ў іншых краінах Еўропы.
**3.** Брытанская гістарычная думка эпохі Асветніцтва.
**4.** Французская гістарычная думка у век Асветніцтва і Вялікай французскай рэвалюцыі.
**5**. Гісторыка-філасофская думка нямецкага асветніцтва.

**Літаратура.**


Макьявелли Н. История Флоренции. – Л., 1973.
Вольтер. Избранные произведения. – М., 1947.
Волгин В.П. развитие общественной мысли во Франции в XVIII в. – М., 1977.
Руссо Ж.-Ж. Трактаты. – М., 1969.
Монтескье. Избранные произведения. – М., 1955.
Попов Б.С. Эдуард Гиббон – историк, писатель и мыслитель эпохи Просвещения // Новая и новейшая история. – 1993. - № 3.
Барг М.А. Юм как методолог истории // Новая и новейшая история. – 1993. - №1.


**1** Гуманістычны светапогляд аказаў вялікі ўплыў на ўсе вобласці культуры і навуковых ведаў, у тым ліку і на гістарычную навуку, у перыяд пераходу ад феадалізму да капіталізму. Новы светапогляд быў перш за ўсе свецкім і варожа ставіўся да чыста тэалагічнага тлумачэння свету, якое панавала ў сярэднія вякі. Для гуманістычнага светапогляду было характэрна імкненне растлумачыць усе працэсы, якія адбываліся ў прыродзе і грамадстве з пункту гледжання розуму (рацыяналізму). Гуманісты адвяргалі сляпы аўтарытэт веры, на якім грунтавалася сярэдневековая навука. Яны прыўзналі чалавечую асобу, як вышейшае тварэнне прыроды, носьбіта розуму. Дзейнасць чалавека мысліцеля і стваральніка супрацьпастаўлялася сляпой сіле божскага промыслу. Для гуманістычнага светапогляду быў характэрны індывідуалізм. Асаблівасць гуманістычнага індывідуалізму ў тым, што ён меў на ўвазе актыўную грамадскую дзейнасць, і яму быў чужды эгаізм. У эпоху Адраджэння, эпоху панаванння гуманістычнага светапогляду тэндэнцыя ўзмацнення цікавасці да антычнай культуры стала дамінуючай у культурным жыцці.

Гуманістычная гістарыяграфія ў рамках ідэйнай плыні гуманізма пачала развівацца з пачатку 15 ст. Гісторыкі-гуманісты рашуча адмовіліся ад тлумачэння гісторыі праз божскі промысел. Яны надалі гісторыі свецкі характар. Гісторыя разглядалася як вынік дзейнасці людзей. Зыходзячы з гэтага, гісторыкі-гуманісты імкнуліся даць рацыянальнае тлумачэнне гістарычнаму працэсу. Праўда, ўзровень рацыянальнага даследавання гісторыі ў гуманістаў яшчэ не дасягаў вялікай глыбіні. Яны, як правіла, абмяжоўваліся прагматычным апісанннем падзей і ўстанаўленнем самых простых прычынна-наступствавых сувязей. Такія гісторокі-

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

гуманісты, як Макіавелі, Бодэн шукалі ўнутр заканамернасці гісторыі ў логіцы палітычнай барацьбы, ва ўплыве прыродных умоў.

Высвятліўшы з гістарыяграфіі правідэнцыяналізм гуманісты рашуча адверглі тыя неверагодныя факты і цуду, якімі сярэдневек. Гісторыкі ілюстравалі нібыта божскае умяшанне ў гісторыю. У сувязі з такім падыходам, гуманісты вельмі крытычна ставіліся да сярэдневяковых хронік і інш. крыніц. Яны ўпершыню сталі шырока выкарыст. непісьмовыя крыніцы, у прыватн. археалагіч. Менавіта з асяродз. гуманістаў выйшлі першыя археолагі.

Гуманістычная гістарыяграфія паклала пачатак сучаснай перыядызацыі сусветнай гісторыі. У сярэднія вякі была прынята перыядызацыя гісторыі чалавецтва па 4-х манархіях: Асіра-Вавілонская, Міда-Персідская, Грэка-Македонская, Рымская. Гуманісты ж падзялілі гісторыю на тры перыяды: старажытная, сярэдневековая, новая. Пад апошняй яны мелі на ўвазе свой час. Робячы такую перыядызацыю гісторыі, гуманісты зыходзілі з культурна-гістарычнага зместу кожнай эпохі. Асноўную цікавасць гуманістаў выклікала палітычная гісторыя. Іх гістарычныя працы – гэта перш за ўсе апісанне ваенных і палітычных падзей. Значна меней увагі гуманісты ўдзялялі сацыяльна-эканамічным працэсам. Іх значымасць у гісторыі яшчэ не была асэнсавана.

Гуманісты, як правіла, разглядалі гісторыю як вынік дзейнасці гістарычных асоб. У такім падыходзе праявіўся індывідуалістычны характар гуманістычнага светапогляду Гісторыкі-гуманісты абмяжоўваліся апісаннем выключна палітычных падзей. Для іх былі характэрныя некрытычныя адносіны да антычных традыцыі. Такі падыход штурхаў гуманістаў да ахвяраваннння гістарычнаю дастаўернасцю дзеля надання гістарычнага пафасу той ці іншай падзеі. Прыўзносячы антычную гісторыю, яны зняважліва ставіліся да гісторыі сярэднявечча, бачачы ў ёй толькі упадак культуры і ведаў. Не была яшчэ выпрацавана і ідэя прагрэсу ў гісторыі. Перавагу меў пункт гледжання аб кругавароце, цыклічн. развіцці гісторыі. На змену варварству сярэдніх вякоў прыйшоў новы час, але ён як бы адраджэнне залатога века антычнасці, вяртанне да яго. Па сутнасці, менавіта гуманісты паклалі пачатак навуковаму падыходу да гісторыі.

У Італіі гуманістычная гістарыяграфія развівалася з пачатку 15 ст. Першай у пачатку 15 ст. у Фларэнцыі ўзнікла "палітыка-рытарычная школа". Заснавальнікам палітыка-рытарычнай школы быў **Леанарда Бруні**, па мянушцы **Авіцэна** (1370-1444 гг.). Яго галоўная праца – "Гісторыя Фларэнцыі" т. 1-12. Асноўная паліт. ідэя, якой прасякн. работа, - гэта перавага рэспубл. формы кіраваннння над тыраніяй. Гэты тызіс аўтар адстайвае, параўноўваючы дзяржаўны лад Рымскай рэспублікі, Фларэнційскай рэспублікі з дзяржаўным ладам краін, дзе ўсталявалася аднаасобная форма кіравання, - Рымскай імперыяй, Міланскім герцагствам. Фларэнцыю Бруні лічыць нашчадкам старажытнарымскіх свабод, іх галоўным аплотам у сучаснай яму Італіі Яго сімпатыі на баку сярэдніх слаёў Фларэнцыі, якія ён лічыць аплотам рэспублікі і свабоды. Адпаведна ён асуджае грандаў і найбольш заможныя слаі бюргерства за іх імкненне ўсталяваць алегархічную форму кіравання. Адначасова ён супраць народных паўстанняў, што яскрава бачна пры знаёмстве з апісаннем паўстання Чомпі ў 1378 г.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

У сваёй “Гісторыі Фларэнцыі” Бруні рашуча парваў з сярэдневяковаю гістарычнаю традыцыяй. Ён лічыць, што з падзення Заходняй Рымскай імперыі пачалася новая эпоха ў гісторыі чалавецтва. Г.з. вылучае сярэднявечча, хоць і не ўжывае гэты тэрмін. Ён адмаўляе ролю божскага промыслу ў гісторыі Фларэнцыі і адмятае сярэдневяковыя легенды аб разнастайных цудах, якія нібыта адбываліся ў гісторыі Фларэнцыі. Асноўны змест гісторыі рэспублікі ён бачыць у паступовым развіцці прынцыпу грамадзянскай свабоды ва ўмовах панавання сярэдніх класаў.

Палітычныя пазіцыі аўтара моцна ўплываюць на змест “Гісторыі Фларэнцыі” і часта прыводзяць да тэндэнцыйнай і суб’ектыўнай інтэрпытацыі падзей. Бруні моцна падражае антычнай гістарыяграфічнай традіцыі. Яго праца мае рытарычны характар. Гісторыя ў яго напісанні выступае як драма, а гістарычныя асобы – як драматычныяыя героі, якія з’яўляюцца носьбітамі тых ці іншых добрадзецеляў ці недахопаў. Захапленне рыторыкай гістарычных герояў, іх учынкамі, пераважна вяло да таго, што Бруні пакінуў па-за межамі даследавання эканоміку, фінансы, быт. У цэлым, тыя метады гістарычнага даследавання, якія прымянялі гуманісты – гісторыкі палітыка-рытарычнай школы, не давалі магчымасці стварыць цэльную і поўную карціну рэчаіснасці. Гэтаму перашкаджала палітычная заангажыраванасць, рытарычны характар іх твораў, і тое, што па-за ўвагай даследчыкаў заставаліся шматлікія аспекты жыцця грамадства.

Другая школа італьянскіх гісторыкаў-гуманістаў – “эрудыцкая крытычная школа”. Прадстўнікі гэтай школы былі менш звязаны з палітычнымі сімпатыямі і антыпатыямі. Для іх быў характэрны больш крытычны падыход да антычнай гістаріяграфіі. Прадстаўнікам гэтай школы не было характэрна рытарычнае выкладанне гісторыі. Усе крыніцы яны падвяргалі крытычнаму аналізу. Праўда, крытыка насіла павярхоўны элементарны характар. Пасутнасці яна зводзілася да выяўлення фальшывак і выкрыцця цудаў, якімі былі багаты сярэдневяков. хронікі. У адрозненні ад прадстаўнікоў палітыка-рытарычнай школы, гісторыкі эрудыцка-крытычнай школы пазбягалі спроб зрабіць якое-небудзь абагульненне гістарычнага матэрыялу. Яны толькі паслядоўна яго выкладалі.

Заснавальнікам эрудыцкай крытычнай школы быў **Флавіо Біондо** (1392-1463), які больш за 30 год праслужыў у папскай курыі дробным чыноўнікам. Яго галоўная праца – гэта шматтомная гісторыя сярэдніх вякоў “Дэкады гісторыі з часоў падзення Рымскай імперыі”. Праца ахоплівае перыяд з 412 па 1440 г. і датычылася пераважна Італіі. Біондо выразна адмяжаваў гісторыю сярэдніх вякоў. У “Дэкадах...” сабрана вялікая колькасць звестак па гісторыі сяррэдніх вякоў. Прычым звесткі гэтыя маюць вялікую ступень дакладнасці.

Вялікую ўвагу Біондо ўдзяляў праблеме крытычнага аналізу гістарычных крыніц. Ён спрабаваў распрацаваць агульныя прынцыпы крытыкі гістарычных крыніц. Галоўнымі крытэрыямі іх дакладнасці Біондо лічыў: 1) праўдападабенства і рэальнасць апісваемых падзей; 2) найбольш старажытнае паходжанне крыніцы, яе максімальная блізасць да апісваемых падзей. Канешне, гэтыя крытэрыі вельмі суб’ектыўныя і недастатковыя, але сама спроба падвергнуць гістарычную крыніцу крытычнаму аналізу была значным крокам наперад у параўнанні з сярэдневяковаю гістарыяграфіяй.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

Выдатным прадстаўн. эрудыцкай крытычнай школы з’яўляўся **Лэрэнцо Вала** (1407-1457). Праўда, некаторыя аспекты яго даследчыцкай дзейнасці набліжаюць яго і да палітыка-рытарычнай школы. Найбольш вядомым творам Л.Вала з’яўляецца трактат “Разважанні аб подложным выдуманым дарэнні Канстанціна”.(1440г.) Трактат быў накіраваны супраць папства, дакладней, супраць свецкай улады папы. У першай частцы сваёй працы Вала даказвае, што існаваннне свецкай улады папы з’яўляецца адной з галоўных прычын палітычн. раздробленасці Італіі, якая прыносіць краіне незлічонныя бедствы.

У другой частцы трактата падвяргаецца крытычнаму даследаванню гістарычны дакумент, вядомы як “Канстанцінаў дар”. Згодна з ім імператар Канстанцін у 4 ст. нібыта перадаў пад уладу папы заходнюю частку Рымскай імперыі з цэнтрам у Рыме. Абапірпючыся на гэты дакумент рымская курыя на працягу доўгага часу адстойвала свае прэтэнзіі на вярхоўную свецкую ўладу ў Італіі і нават ва ўсёй Заходняй Еўропе.

Вала крытыкаваў “Канстанцінаў дар” з некалькіх накірункаў. Спачатку ён указаў на неразумнасць такога дарэння з боку імператара. Потым указаў, што ніякія іншыя крыніцы, даціраваныя 4-8 ст., не утрымліваюць якой-небудзь інфармацыі аб папскай дзяржаве, створанай Канстанцінам. Далей Вала прааналізаваў. мову і літаратурны стыль “Канстанцінава дара” і прйшоў да высновы, што яны не адпавядаюць прынятым у афіцыйных дакументах 4 ст., а падобныя на тыя, што выкарыстоўваліся ў хрысціянскай літаратуры больш позняга часу. Мова дакумента моцна адрознівалася ад класічнай латыні, на якой у 4 ст. пісаліся афіційныя дакументы, але затое яна блізкая да варварскай сярэдневяковай, склаўшайся значна пазней. У выніку Вала зрабіў выснову, што “Канстанцінаў дар” быў складзены значна пазней 4 ст. Праўда дату з’яўлення падробкі Вала вызначыць не змог. Пазней было доказ., што “Канстанцінаў дар” быў складзены ў папскай курыі ў 8 ст.

Палітыка-рытарычная школа паступова вызвалялася з-пад уплыву рыторыкі і ў 16 ст. узнялася на новую ступень свайго развіцця. Узнікшы накірунак гістарыяграфіі атрымаў назву новая палітычная школа. Яе найбольш вядомымі прадстаўнікамі з’яўляліся **Мікола Макіявелі** і **Франчэско Гвічардзіні**. (1469-1527, 1483-1540). Для іх, як і для прадстаўнікоў палітыка-рытарычнай школы, была характэрна палітычная тэндэнцыйнасць. Але ў іх з’яўляецца імкненне скарыстаць гістарычны вопыт для вырашэння праблем тагачаснай Італіі. Гэта прымушала прадстаўнікоў новай палітычнай школы шукаць больш глыбокія асновы гістарычных падзей, заканамернасці гістарычнага развіцця. Яны адыходзяць ад рыторыкі, падражання антычным узорам, пачынаюць выкарыстоўваць італьянскую мову замест латыні.

Макіявелі быў ідэолагам сярэдніх слаёў Фларэнцыі і стаяў на антыклерыкальных і рэспубліканскіх пазіцыях. Ён лічыў, што інтарэсы дзяржавы, якія ён ставіў вышэй інтарэсаў асобы ці асобных партый, павінны ажыццяўляцца ўсімі магчымымі сродкамі. Мэты практычнай палітыкі, а менавіта ажыццяўленне аб’яднанання Італіі, за што актыўна выступаў Макіявелі, прымушалі яго, насуперак сваім рэспубліканскім сімпатыям, рабіць стаўку на моцнага гасудара, здольнага ажыццявіць гэтае аб’яднанне. Адсюль і супярэчлівасць яго поглядаў, выкладзеных

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

у розных творах. У 1513 г. ён піша тракт "Гасудар", дзе апраўдвае неабмежаваную манархічную ўладу аж да адкрытай тыраніі, бо яна неабходна для барацьбы з цэнтрабежнымі сіламі ў дзяржаве. У гэтай барацьбе ў імя вышэйшых дзяржаўных інтарэсаў гасудар можа прымяняць самыя амаральныя метады, калі ў іх есць неабходнасць.

Галоўнай працай Макіявелі з'яўляецца "Гісторыя Фларэнцыі" (1520-1526 гг.). Бачачы ў рэспубліцы свой ідэал, ён на аснове вывучэння гісторыі Фларэнцыі робіць выснову, што Фларэнцыйская рэспубліка аказалася няздольнай забяспечыць ні ўнутранае адзінства, ні аб'яднаць Італію. Адсюль Макіявелі лічыць, што неабходна абсалютная ўлада гасудара, якая толькі і можа забяспечыць краіне неабходнае адзінства.

Макіавелі адзначае, што для Фларэнцыйскай рэспублікі характэрны пастаянныя ўнутраныя раздоры, якія вядуць да аслаблення дзяржавы. Макіявеллі разглядае ўсе падзеі ў гісторыі выключна як вынік дзейнасці людзей. Але пры гэтым ён адзначае, што людзі не ў стане прадбачыць ўсе наступствы сваёй дзейнасці.

У "Гісторыі Фларэнцыі" Макіявелі імкнецца не проста расказваць гісторыю, але і адкрыць рухаючыя яе законы. Адзін з галоўных такіх законаў ён бачыў у палітычнай барацьбе, якая характэрна для ўсіх дзяржаў, але перш за ўсе для рэспублік. У ходзе гэтай барацьбы змагаючыеся групоўкі імкнуцца забяспечыць толькі свае інтарэсы і не лічацца з інтарэсамі дзяржавы. Другую заканамернасць гісторыі Макіявелі бачыў у адбываючымся кругавароце палітычных форм: ад манархіі, да арыстакратычнага праўлення, потым да рэспублікі, і зноў да манархіі. Галоўнаю рухаючай сілай, абумоўліваўшай гэты кругаварот, з'яўляецца палітычная барацьба, якая суправаджаецца насіллем. Але унутраныя прычыны гэтай барацьбы раскрыць у поўнай меры Макіявелі не змог. На яго думку ў палітычнай барацьбе як правіла вузкапартыйныя інтарэсы атрымліваюць перавагу над агульнадзяржаўнымі. У гэтым выпадку рэспубліка ідзе да свайго ўпадку. І з яго адзінае выйсце – тыранія. Гісторыя Італіі прадстаўлялася яму як ланцужок страчаных магчымасцей дасягнуць палітычнага аб'яднання. Галоўнай прычынай раздробленасці Італіі ён лічыў эгаістычную палітыку папства.

Такім чынам, для гістарычных прац Макіявелі характэрна імкненне да абагульнення, рэлістычнага расказу, адсутнасць рыторыкі. Гэтым ён пераўзышоў іншых гісторыкаў-гуманістаў. У той жа час для яго твораў, як і для ўсей тагачаснай гістарыяграфіі характэрна абмежаванне выключна палітычнымі падзеямі, перабольшванне ролі асобных палітычных дзеячаў.

Палітычныя сімпатыі Гвічардзіні былі на баку фларэнцыйскай алегархіі. Яго ідэал - алегархічная Венецыянская республіка. Ён песімістычна ацэньваў будучае Італіі, не верачы ў яе хуткае аб'яднанне. Для Гвічардзіні быў характэрны скептыцызм і цынізм у палітычых і маральных пытаннях. Галоўнаю рухаючай сілай у палітыцы ён лічыў не блага дзяржавы, а асабістыя выгоды і імкненні чалавека да спакойнага жыцця.

Свае адносіны да сучаснасці Гвічардзіні пераносіў і на гісторыю. Ім створаны дзве асноўныя гістарычныя працы "Гісторыя Фларэнціі з1378 па 1509 г." і "Гісторыя Італіі." (першая надрукаваная ў сярэдзіне 19 ст., другая пры жыцці). Яго

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

працы адрознівае шырокае выкарыстанне разнастайных крыніц. Гэта дало магчымасць даць шырокую карціну гісторыі. Фларэнцыі і Італіі. Для Гвічардзіні характэрны інтарэс і да фінансавп-эканамічных праблем. Гэта звязана з яго перакананнем, што людзьмі не ў апошнюю чаргу рухаюць і матэрыяльныя інтарэсы.

Для Гвічардзіні не характэрна імкненне выявіць агульныя законы гістарычнага развіцця. Ён імкнецца тлумачыць падзеі прыватнымі прычынамі. Палітычная барацьба для яго не закон гісторычнага развіцця, а толькі выпадковая гульня асабістых страсцей і меркантыльных інтарэсаў. Гвічардзіні вельмі тэндэнцыёзны гісторык. Усе падзеі і палітычных дзеячаў ён ацэньвае з пункту гледжання іх карысці для складвання алегархічнай сістэмы кіравання. У творах Гвічардзіні яскрава гучыць скептыцызм у адносінах да чалавека. Яму прыпісваецца мала станоўчага і многа адмоўнага. З гэтага пункту гледжання працы Гвічардзіні ўяўлялі сабой ужо пэўны адыход ад традыцыйнай гуманістычнай гістарыяграфіі.

**2.** У Францыі гуманістычная гістарыяграфія выкарыстоўвалася як ідэйная зброя змаючыміся дваранскімі групоўкамі і трэццім саслоўем і насіла палітычную афарбоўку. У гэтай краіне найбольш выдатным прадстаўнікам гуманістычнай гістарыяграфіі з'яўляўся **Жан Бодэн** (1530-1596). Яго працы моцна паўплывалі на развіццё гістарычнай навукі ў 17 - 18 ст. Бодэн быў рашучым прыхільнікам абсалютнай манархіі, але адлюстроўваў інтарэсы трэцяга саслоўя. Ён лічыў, што манарх не можа парушаць права ўласнасці сваіх подданых, у прыватнасці, уводзіць падаткі без іх згоды. Найбольш вядомыя яго творы – гэта трактаты "Метад лёгкага азнаямлення з гісторыяй" і " Шесць кніг аб дзяржаве". У іх ён адстайвае думку аб наяўнасці ў гісторыі ўнутраных аб'ектыўных заканамернасцей. Да іх ліку ён адносіў уздзеянне на гісторыю геаграфічнага асяроддзя, якое на яго думку вызначала псіхалагічны склад розных народаў, а апошні, ў сваю чаргу, моцна ўплываў на іх гістарычны лёс. Разам з тым, Бодэн не лічыў уплыў геаграфічнага фактару вызначальным. На яго думку, разумныя законы і заснаваная на іх дзяржава, могуць змягчыць і нават ліквідаваць поўнасцю негатыўны ўплыў навакольнага асяроддзя.

Бодэн выступаў з ідэей аб прагрэсе ў гісторыі, якая супрацьстаяла цыклізму Макіявелі і гістарычнаму песімізму Гвічардзіні. Бодэн падкрэсліваў перавагу сучаснай яму эпохі не толькі над часам дзікасці і варварства, але і над антычнасцю, якую іншыя гуманісты лічылі вяршыняю развіцця чалавецтва. Ён указваў, што новы час мае перавагу над антычнасцю ў сэнсе развіцця навук, мастацтва, шырані геаграфічнага кругагляду людзей, у ваенай справе і развіцці прамысловасці. У гэтым, а таксама ў пастаноўцы пытанння аб метадах гістарычнага даследавання, ён значна апярэдзіў свой час. Але з другога боку Бодэн яшчэ не адмовіўся ад ідэі аб уплыве магічных сіл на гістарычны працэс, нярэдка звяртаўся да алхіміі, астралогіі.

У Англіі найбольш значнымі гісторыкамі-гуманістамі, блізкімі да палітычнай школы, былі **Томас Мор** (1478-1535) і **Фрэнсіс Бэкан** (1561-1626). Уласна гістарычнай працай Т. Мора з'яўляецца "Гісторыя Рычарда III" (1514-1518) Галоўная ідэя кнігі – гэта асуджэнне тыраніі, прыкладам якой з'яўляецца праўленне караля-узурпатара Рычарда III. У адрозненні ад Макіявелі, Мор настайвае на неабходнасці для правіцеля захоўваць высокія маральныя прынцыпы

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

ў любых абставінах. На прыкладзе Рычарда III ён імкнуўся паказаць, што іх парушэнне вядзе да гібелі і дзяржавы, і правіцеля. Мор карыстаўся даволі шырокім колам крыніц. Але не заўсёды ён праяўляў аб'ектыўнасць пры іх талкаванні. Гэта было звязана з імкненнем стварыць адназначна адмоўны вобраз Рычарда III і паказаць гібельнасць імкнення да неабмежаванай улады. Палітычная заангажыраванасць і рыторыка перашкаджалі Мору стварыць аб'ектыўную карціну гісторыі.

Бэкан сваю гістарычную працу "Гісторыя Генрыха VII" напісаў у 1621 г. пасля таго, як быў Якавам І адпраўлены ў адстаўку з пасады канцлера. Бэкан выступае прыхільнікам моцнай улады, дапускае яе амаральныя дзеянні, калі гэта неабходна для агульнага блага. Кніга пранізана палітычнай тэндэнцыёзнасцю. Але Бэкан больш рэалістчна і ўсебакова, чым Мор, падыходзіць да асвятлення англійскай гісторыі. На-прыклад, ён гаварыць не толькі аб тыранізме Рычарда III, але і аддае належнае его моцным бакам як правіцеля. Бэкан хоча бачыць на троне правіцеля-асветніка, які абапіраецца на парады мудрых і адукаваных людзей. Вялікае значэнне надае аўтар парламенту і саветнікам. Ён удзяляе шмат увагі эканаміцы і фінансам. Бэкан асуджае народныя паўстанні, як мецяжы, але пры гэтым імкнецца высветліць аб'ектыўныя ўмовы, якія іх параджаюць. Ён выдзяляе два асноўныя віды мецяжоў 1)ад буйства - сепаратысцкія паўстанні знаці; 2) ад беднасці – народныя паўстанні, якія разглядае перш за ўсё як антыпарадакавыя. Да агароджванняў Бэкан ставіцца адмоўна, лічачы справядлівымі законы Генрыха VII, накіраваныя супраць іх. Бэкан, як і ўсе гісторыкі-гуманісты, вялікую ўвагу ўдзяляў гістарычным асобам, але імкнуўся і даць прычынна-наступствавыя тлумачэнні ходу гісторыі, вызначаюць умовы, у якіх нараджаецца і развіваецца падзея.

У Германіі 16 ст. у сувязі з вострай сацыяльна-палітычнай. і рэлігійнай барацьбой эпохі Рэфармацыі і Сялянскай вайны гістарыяграфія, у тым ліку і гуманістычная, служыла ідэйнай зброяй для разных сацыяльных груп. У нямецкай гістарыяграфіі 16 ст. значнае месца займалі сачыненні змешанага тыпу: па форме падражаўшыя гуманістычным работам, а па сутнасці блізкія да сярэднявяковых хронік. Уласна гуманістычных работ было мала і яны не былі шырока вядомымі. Спалучэнне сярэдневяковай традыцыі з гуманістычнай характэрна і для работ аднаго з буйнейшых нямецкіх гісторыкаў той эпохі **Себасцьяна Франка** (1499 – 1542). Ён выступае як выразіцель ідэй найбольш радыкальнай часткі бюргерства. Асноўны гістарычны твор Франка "Хроніка, Летапіс і Гістарычная Біблія" (1531г.). Франк прызнае божскі пачатак у гісторыі, лічыць, што бог разліты ў свеце, увасоблены ў кожным чалавеку і ажыцаяўляе гісторыю праз дзейнасць неасэнсоўваючых гэта людзей. Разліты ў свеце бог увасабляе добры пачатак, але пэўныя людзі могуць выкарыстаць яго ў злых мэтах. Таму божскі план рэалізуецца ў гісторыі толькі ў канчатковым варыянце, а людзі, вывучаючы гісторыю павінны браць з яе вопыт для сябе.

Франк часта разглядае гісторыю з пункту гледжання сацыяльных нізоў. Так, ён асуджае прыватную ўласнасць як крыніцу насілля багатых над беднымі. У дзяржаве ён бачыць сілу, якая хутка пасля свайго узнікнення аказалася на баку богатых і дапамагае ім прыцясняць бедных. Каталіцкую царкву Франк крэтыкуе за тое, што яна адыйшла ад прынцыпаў ранняга хрысціянсва. Прычыны сялянскай

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

вайны 1525 г. Франк бачыць у прыгнечаным становішчы сялянства, росце феадальных павіннасцей. Але саму вайну, як і паўстанні ў прынцыпе, ён асуджае і выказвае меркаванне, што народ павінен чакаць выратавання ад бога. Ад гуманістаў Франка аддаляе і некрытычнае стаўленне да гістарычных крыніц.

**3.** У XVII ст гісторыя яшчэ не склалася ў Англіі як самастойная навуковая дысцыпліна У грамадскай свядомасці яна яшчэ не аддзялілася ад іншых галін ведаў аб чалавеку і складала частку цэльных гуманістычных ведаў. Незадоўга да пачатку рэвалюцыі ў Кембрыджскім і Оксфардскім універсітэтах былі створаны кафедры грамадзянскай гісторый. На развіццё англійскай гістарыяграфіі XVII ст. вялікі ўплыу аказалі філасофскія і гістарычныя погляды Фрэнсіса Бэкана. Абапіраючыся на яго ідэі, гісторыкі маглі перайсці ад падзейна-апавядальнай гістарыяграфіі да аналітычнай. Англійская рэвалюцыя сярэдзіны XVII ст. дала моцны штуршок ідэйнай барацьбе. Цэнтральнае месца ў грамадска-палітычнай палеміцы займала пытанне аб паходжанні зямельнай уласнацсі і ўлады, што ў практычнай палітыцы азнача адказ на пытанне аб тым, ці ў праве людзі працівіцца існуючай уладзе і вызначаць форму кіравання. Прыхільнікі неабмежаванай каралеўскай улады даказвалі незыблімасць існуючых парадкаў, спасылаючыся на божскае паходжанне каралеўскай улады. Права караля на неабмежаваную ўладу яны выводзілі з Біблії, сцвярджалася, што ён з'яўляецца прамым нашчадкам Адама, і таму яго ўлада не падлягае ніякаму амежаванню. Такі пункт гледжання адстойваў такія відныя прадстаўнікі раялісцкай грамадска-палітычнай думкі і гісторык, як **Эдуард Хайд (лорд Кларэндон)** (1609-1674).

Гістарычная канцэпцыя Э. Хайда найбольш поўна выкладзена ў працы “Гісторыя мяцяжу”. Першая частка яго кнігі носіць характар хронікі падзей. У другой выкладанне фактаў спалучаецца з асаблістымі ўспамінамі. Аўтар не змог узняцца да ўзроўню аналізу і абагульнення гістарычнай рэчаіснасці. На думку Хайда, развіццё Англіі напярэдадні рэвлюцыі было паспяховым. У краіне панавау матэрыяльны дабрабыт. Палітыка Карла I не давала істотных падстаў да незадавольнення. Гэта значыць руэльных прычын для мецяжу не было. Да яго прывяла дзйнасць клікі інтрыганаў, якія пасеялі смуту. У Кромвелі ён бычаць толькі забойцу і тырана. З рэстаўрацыяй Сцюартаў у каріне андавіліся спакой і парадак. Гэатая схема на доугі час стала пануючай у кансерватыўнай тарыйскай гістарыяграфіі.

Прадстаўнікі другога накірунку ў палеміцы аб паходжанні ўлады і ўласнасці супрацьпастаўлялі ідэі аб божскім паходжанні ўсялякай улады канцэпцыю натуральных правоў і дагаворнага характару паходжання дзяржавы. Яны сцверджалі, што чалавек ад прыроды надзелены некаторымі неадрыўнымі правамі, якія не могуць бычь адняты ніякай уладай. Адным з заснавальнікаў гэтага, як яго сталі называць вігскага, напрамку ў гістарыяграфіі з'ўляўся **Джон Мільтон** (1608-1674). Гістарычнай працай Мільтана з'яўляецца “Гісторыя Брытаніі”, у якой выкладзена гісторыя краіны са старажытных часоў да нарманскага заваяванння. Распавядаючы палітычную гісторыю, Мільтан вельмі даверліва ставіцца да крыніц, не падвяргае іх крытычнаму аналізу. У выніку ў працу трапілі многія вымыслы храністаў. Дзяржава, на думку Мільтана, прыходзіць на змену натуральнаму стану людзей і ўзнікае ў выніку грамадскага дагавору. Апошні, уручыўшы ўладу каралю,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

абмежаваў яе законамі, абавязковымі для ўсіх. Ён падтрымліваў ідэю народнага суверенітэту, але ў паняцце палітычны народ уключаў толькі лепшых людзей Рэспублікі. Мільтан лічыць лепшай формай кіравання менааавіта рэспубліку.

З тэарэтычным абгрунтаваннем перавароту 1688 г. выступіў яшчэ адзін прадстаўнік вігскай гістарыяграфіі **Джон Лок** (1632-1704). У сваіх трактатах "Аб рэлігійнай цярпімасці", "Два трактаты аб уладзе" ён працягваў развіваць ідэі аб натуральным стане старажытных людзей і ўзнікненні дзяржавы ў выніку грамадскага дагавору. На першы план ён вылучае пытанне аб уласнасці. Дзяржава на яго думку ўзнікае дзеля абароны права чалавека на прыватную уласнасць, асабістую свабоду і бяспеку. Лок падверг крытыцы абсалютную манархію і андым з першых абгрунтаваў неабходнасць падзелу ўладаў Лок, зыходзячы з ідэі народнага суверэнітэту, прызнаваў права народа на супраціўленне тыраніі. Ён асуджаў абсалютызм Сцюартаў, прызнаваў законнасць паўстанння парламента супраць караля. Але ў той жа час асуджаў і крайнасці кравапралітнай рэвалюцыі сярэдзіны XVII ст. Яго ідэал – "слаўная рэвалюцыя".

Англійскія асветнікі надавалі вялікае значэнне разціццю гістарычных ведаў. Адзін з англійскіх асветнікаў лорд Болінгброк адзначаў, што гісторыя – гэта філасофія, якая вучыць нас з дапамогай прыкладаў. На працягу XVIII ст. у англійскай гістарыяграфіі складаецца ўжо цэльнае прадстаўленне аб мінулым сваёй і іншых краін. Па-ранейшаму асноўнымі крыніцамі для гістарычных даследванняў заставаліся сведчанні відавочцаў, сучаснікаў і ўдзельнікаў падзей. Падыход да іх як правіла быў не крытычны і змешчанныя ў іх звесткі поўнасцю прымаліся на веру. Надаючы першаснае значэнне сведчанням сучаснікаў падзей, гісторыкі XVIII ст. мала ўвагі ўдзялялі гістарычным абагульненням. У XVIII ст. у англійскай гістарыяграфіі ўжо цвёрда ўкаранілася традыцыя падраздзяляць гісторыю на старажытную, або класічную, сярэднявечча і новую. Вывучэнне новай гісторыі зводзілася ў асноуным да палітычнай і канстытуцыйнай гісторыі. У 1724 г. у Оксфардскім і Кембрыджскім універсітэтах былі створаны прафесарскія кафедры новай гісторыі. Услед за англійскімі універсітэтамі кафедры сусветнай гісторыі з'явіліся і ў шатландскіх універсітэтках – Глазго (1716), Эданбург (1719).

Адным з віднейшых англійскіх філосафаў і гісторыкаў XVIII ст. з'яляўся **Дэвід Юм** (1711-1776 гг.). Згодна з філасофіяй агнастыцызму Д. Юма, чалавек не ведае і не можа ведаць, ці існуе аб'ектыуны свет, бо чалавек успрымае свет толькі як свае ўяўленні і сам будуе прычынна-наступстваыя сувязі наміж рэчамі і з'явамі. Адпаведна нельга аб'ектыўна пазнаць і гістарычнае мінулае.

Асноўнай гістарычнай працай Д. Юма з'яўляецца васьмітомная "Гісторыя Англіі ад ўварвання Ю. Цэзара да рэвалюцыі 1688 г.". У цэнтры ўвагі Юма, згодна з гістарыяграфічнай традыцыяй тых часоў, праблемы палітычнай гісторыі. Хаця ён закранае і пытанні рэлігіі, нораваў эпохі, культуры. У аснову перыядызацыі Юм паклаў праўленне дынастый і асобных каралёў. Рухаючая сіла грамадскага развіцця, лічыць Юм, - гэта прагрэс ідэй, ведаў і маралі. Па канцэпцыі яго праца блізкая да тарыйскай гістарыяграфіі. Яна з'яўляецца ўсхвален. англійскай манархіі. Англійская рэвалюцыя сярэдзіны XVII ст. асуджаецца як мяцеж. Але ва ўмовах XVIII ст. Юм ужо адмовіўся ад крайняга манархізма Кларэндона і ў якасці ідэала разглядае асветніцкую канстытуцыйную манархію.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Як і іншыя асветнікі, Юм варожа адносіцца да багаслоўя і царквы, асуджае праяўленне рэлігійнага фанатызму. Ён рэзка крытыкуе пурытан за рэлігійную нецярпімасць. У сувязі з засіллем царквы ў сярэднявечча, ён разглядае яго як перыяд варварства, бачыць у ім перарыў у духоўным развіцці чалавецтва. На гісторыю, на думку Юма, уплываюць самыя разнастайн. Фактары – геаграфічнае становішча, клімат, эканаміка, дзяржаўныя ўстановы, рэлігія, заканадаўства. Да ліку недахопау сачынення Юма як навуковай працы можна аднесці тое, што ён як правіла задавальньецца пераказам іншых гістарычных сачыненняў. Прычым падыходзіць да іх не крытычна.

Аналіз работы Юма дазваляе зрабіць выснову, што ён разглядае гісторую як комплекс разрозненых фактаў. Гістарычны працэс – гэта сукупнасць змяняючых адна другую канкрэтных сітуацый. Рухавіком гістарычнага развіцця выступае гістарычная асоба. Праз вывучэнне дзейнасці буйных гістарычных асоб, Юм бачыць шлях для да прычыннага тлумачэння гісторыі. У тамах свайго даследавання, якія прысвечаны тюдораўскаму перыяду ў гісторыі Англіі, Юм пераносіць асноўную ўвагу ад героеў на павольна мяняючыеся струкртуры – інстытуты грамадства, права. Права не толькі кантралюе, але і ўдасканальвае грамадства. Для Юма гісторыя – гэта перш за ўсё канстытуцыйная гісторыя. Сапраўдная гісторыя, лічыць Юм, павінна канцэнтравацца на тым, што з’яўляецца найбольш важным, а не на тым, што з’яўляецца найбольш цікавым. Ён не лічыў гістарычны працэс звязаным і пераймальным. Ён распадаўся на абасобленыя адзін ад аднаго перыяды. Гісторыя развіваецца цыкламі, якія не звязаны паміж сабою.

Буйнейшым гісторыкам Англіі эпохі Асветніцтва быў **Эдуард Гібан** (1737-1794). Гібан як гісторык лічыў сваёй важнейшай задачай не апісанне падзей і фактаў, а вывучэнне разнастайных з’яў культуры, якія напаўняюць развіццё грамадства. Пры гэтым культура разумелася вельмі шырока. Яна ахоплівала эканамічнае і сацыяльнае жыццё, навуку і мастацтва, мараль. Гісторыя, згодна Гібану, - гэта звязанае выкладанне прычын і наступстваў, узятых у правільных суадносінах. Задачу гісторыка ён бачыў у тым, каб раскрыць значэнне канкрэтных гістарычных фактаў. Чалавек павінен асэнсаваць свой гістарычны вопыт, а затым перабудаваць на яго аснове грамадскае жыццё. Гібан выкладае матэрыял у праблемна-гістарычнай паслядоўнасці. Вялікая заслуга яго ў тым, што ён першым у гістарыяграфіі паставіў пытанне аб паходжанні і развіцці хрысціянства.

Галоўная праца Гібана – “Гісторыя ўпадку і гібелі Рымскай Імперыі”. Даследаванне гісторыі Рымскай імперыі прадстаул. Гібону вельмі актуальн. Праз працу Гібана праходзіць чырвонаю ніццю асноўная ідэя – вялізарныя імперыі не могуць быць даугавечнымі. “Гісторыя упадку і гібелі Рымскай Імперыі” – адзін з лепшых узораў асветніцкай гістарыяграфіі. Праца Гібана ахоплівае перыяд, пачыныючы з II ст. н.э. і заканчваецца падзеннем Канстанцінопаля ў 1453 г. У цэнтры ўвагі аўтара – гісторыя палітычных падзей і рэлігія. Менш увагі ўдзяляецца сацыяльным і эканамічным праблем. У адрозненні ад большасці іншых гісторыкаў эпохі Асветніцтва, Гібан пры напісанні сваёй працы абапіраецца на шырокае кола крыніц.

Э. Гібан лічыў, што эпоха Рымскай імперыі – гэта час, калі становішча чалавечага рода было найбольш шчаслівым і працвітаючым. Галоўную прычыну

гібелі Рымскай імперыі ён бачыў у хрэсціянстве. Гібан адзначаў, што поспехі хрысціянства аблегчылі заняпад політэізма, рост скептыцызму ў грамадстве, нарастанне ўсеагульнай дэстабілізацыі ў жыцці. Сацыяльнай базаю ранняга хрысціянства былі ніжэйшыя слаі грамадства. Прынящце імператарам канстанцінам хрысціянства Гібан лічыць адной з галоўных прычын гібелі імперыі. Яно садзейнічала знікненню воінскага духу рымлян, зацвярджала дух пасіўнасці і смірэння. Падзенне Рыма, па Гібану, - гэта перамога варварства і рэлігіі. Да важнейшых прычын гібелі рымскай імперыі Гібан аднёс тое, што ён назваў наступствам прзмернага ўзвышэння. Сярод дасягнутай велічы выспяваў заняпад, прычыны разбурэння памнажаліся па меры пашырэння заваяванняў, і грамадны будынак рухнуў пад уласным цяжарам.

Шмат увагі Гібан удзяляў палітычнай эвалюцыі рымскага грамадства як адной з прычын яго падзення. Ён лічыць, што склаўшаяся ў эпоху рэспублікі раўнавага паміж выканаўчай, заканадаўчай і судовай уладамі потым была парушана. Яшчэ адна прычына падзення Рымскай імперыі – прагрэсуючае аслабленне рымскай ваеннай сістэмы. Яна канчаткова рухнула пры імператары Канстанціне. Знешні фактар, які прывёў да падзення Рымскай імперыі – гэта нашшэсце варвараў. Яно не было аднамомантным актам, нарастала ад года да года, і па меры накаплення колькасных змен прывяло да якаснага паыва – да гібелі Рымскай імперыі.

Падзел імперыі на Заходнюю і Усходнюю прывяло да яе аслаблення: узніклі супярэчнасці паміж грэкамі і лацінянінамі, для Усходняй імперыі была характэрна вельмі вострая палітычная барацьба. Але само заснаванне Канстанцінопаля не столькі садзейнічала гібелі Захаду, колькі захоўвала ад гібелі Усход, праўда толькі на час. Гібан зусім не шмат увагі ўдзяліў нарастаўшаму сацыяльна-эканамічнаму крызісу як аднаму з фактараў падзення імперыі.

Як і іншыя дзеячы Астветніцтва, Гібан лічыў сярэднявечча часам варварства і цемры і называў гэтую эпоху крававым і злачынным бязумствам. Ён акцэнтуе ўвагу на крайне адмоўным уплыве царквы і манаштва на жыццё сярэдневяковага грамадства, рэзка асуджае іх духоуную уладу ў той час. Асабліва негатыўнымі былі адносіны Гібана да нецярпімасці і фанатызму царкоўнікаў. Дзеячаў Рэфармацыі ён асуджаў за іх нерашучасць у барацьбе з каталіцкаю царквой, за тое, што яны часта ішлі на кампраміс з царквой. Асаблівае асуджэнне Гібона выклікала тая нецярпімасць да іншадумства, якая была перанята дзеячамі Рэфармацыі ў каталіцкай царквы. У той жа час Гібон быў і праціўнікам атэізму. Ён лічыў рэлігію карыснай і неабходнай для маральнага ўдасканалення чалавецтва, але хацеў, каб яна ачысцілася ад суявер'яў.

У XVIII ст. філасофа-гістарычная школа сфарміравалася вакол Эдзінбургскага універсітэта. Яе вядучым прадстаўнікам з'яўляўся **Джон Мілар** (1735 - 1801). Характэрнай рысай гэтай школы з'являлася павышаная цікавасць, у параунанні з іншымі гісторыкамі, да сацыяльна-эканамічнай праблемы. Гэта было звязана з хуткім эканамічным ростам Шатландыі ў той час. Прадстаўнікі эдзінбургскай школы імкнуліся стварыць цэласную навуку аб чалавеку. Што датычыцца гісторыі, то канкрэтна-гістарычны матэрыял выкарыстоўваецца імі ў якасці ілюстрацыі да глабальных гісторыка-сацыялагічных пабудоў. Яны

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

спрабавалі вывесці агульны закон “Сацыялагічнай механікі”, з дапамогай якога раскрыць заканамернасці развіцця чалавечага грамадства. Развіццё грамадства яны разглядалі як заканамерны працэс.

Цэнтральная задачай, якую імкнуўся выращычь у сваіх гістарычных працах Д. Мілар, - гэта зразумець сувязь паміж матэрыяльным жыццём грамадства з аднаго боку і ўстановамі, законамі і духоўным жыццём з другога боку. Мілар лічыў, што для тлумачэння разніцы ў законах, якія дзейнічаюць у розных краінах, неабходна ў першую чаргу звярнуцца “да розніцы ў становішчы, якое падказала жыхарам розных краін розныя погляды і матывы дзеянняў”. Да фактараў, якія вызначаюць розніцу ў становішчы розных краін, ён адносіў “пладароднасць, ці беднасць глебы, характар прадуктаў, віды працы, неабходныя для падтрымання існавання, колькасці людзей, аб’яднаных у грамадства. Гэтая розніца ў жыцці народаў дае розныя накірункі іх схільнасцям і дзейнасці і нараджае тыя ці іншыя звычаі, характар і спосабы мыслення.

З’яўленне культуры Мілар звязваў з ростам матэр’яльнага добрабыту грамадства. З’яўленне багацця, на яго думку, суправаджалася яго нераўнамерным рамеркаваннем паміж людзьмі і вяло да ўзнікнення няронасці ў іх грамадскім становішчы. Узнікненне ўлады ён звязваў з узнікненнем уласнасці, а розныя формы ўлады выводзіў, з розных форм уласнасці. Англія і інш. краіны Заходняй Еўропы да канца XVIII ст. прайшлі праз дзве формы ўлады: федальная арыстакратыя, калі ўся ўлада была сканцэтравана ў руках буйной арыстакраты; і праз этап феадальнай манархіі, калі ўся паўната ўлады перайшла ў рукі караля. Затым пад уплывам развіцця гандлю і прамысловасці Англія ўступіла ў трэці перыяд, які характэрызуецца, па Мілару, развіццём духоўнай свабоды. Такім чынам, Мілар пайшоў значна далей, чым яго сучаснікі ў справе вызначэння ролі матэрыяльная вытворчасці ў гістарычным развіцці. Аднак першаасновай гістарычнага працэсу ён лічыў духоўныя з’явы, а крыніцай усяго існуючага – бога.

**4.** Крытыка сучаснага ім грамадства падштурхоўвала французскіх асветнікау да крытычнага пераасэнсавання гістарычнага мінулага сваёй краіны. Напрылад у “Энцыклапедыі” Дзідро і д’Аламбара было каля 6 тыс. артукулаў на гістарычныя тэмы з агульнай колькасці ў 60 тыс. Асветнікі лічылі, што шляхам стогай рацыянальнай крытыкі крыніц гісторык можа дасягнуть даставернасці, ці хаця б высокай ступені верагоднасці атрыманых ім ведаў, але ўсё ж гістарычныя веды не могуць быць такімі дакладнымі, як веды навук аб прыродзе, бо іх нельга праверыць эксперэментальна. Французскія асветнікі значна пашырылі паняцце гістарычнай крыніцы, вельмі вялікую ўвагу ўдзялялі крытычнаму аналізу крыніц. Кіруючыся прынцыпамі рацыяналізму, яны лічылі важнейшым крытэрыем пры вызначэнні даставернасці крыніцы здравы сэнс.

Французскія асветнікі лічылі, што гісторыі дзейнічаюць заканамернасці, якія выцякаюць з прыроы рэчаў і могуць быць спасцігнуты розумам. Яны зыходзяць з пастулата аб нязмен. прыродзе чалавека і на яго аснове вылучылі прынцып гістарычнага ўніверсалізму. Згодна з гэтым прынцыпам французскія асветнікі разглядалі гісторыю як ўсеагульную гісторыю, якая ахоплівае ўсе плямены і народы, якія жывуць цяпер і жылі раней. У гісторыі яны імкнуліся ўбачыць у першую чаргу агульныя з’явы, якія лічылі праяўленнем універсалізму чалавечай

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

прыродны. Калі французскіе асветнікі і звярталіся да гісторыі асобных народаў, то рабілі гэта не з мэтай выявіць іх асаблівасці, а каб, нават на суперак кідаючымся ў вочы адрозненням, выявіць адзінства ва ўсё той жа чалавечай прыродзе. У выніку яны ўпускалі, што агульныя заканамернасці па-рознаму праяўляюцца ў розныя гістарычныя эпохі і ў розных народаў. Французскія асветнікі імкнуліся не да паглыбленай распрацоўкі Яе асобных сюжэтаў, а да выпрацоўкі новага разумення гістарычнага працэсу ў цэлым, у пераасэнсаванні вопыту сусветнай гісторыі.

У гістарычным поглядзе французскіх асветнікаў адлюстроўваецца і ідэі прагрэсу. Яны лічылі безумоўным, што адбываецца бесперапынны, хоць і вельмі нераўнамерны у розныя эпохі прагрэс чалавечых ведаў. Што датычыцца прагрэсу ў жыцці грамадства, то яго бесперапыннасць выклікала ў асветнікаў сумненні. Гэта звязана з тым, што ў гісторыі адбывалася гібель высокаразвітых цывілізацый, перыяды ўпадку і тыраніі, якія несумяшчальны з розумам і правамі людзей. У той жа час, асветнікі лічылі непазбежным перамогу розуму ў будучым і з ёй звязвалі прагрэс грамадства ў цэлым. Гісторыя ўяўлялася хоць і працяглай і цяжкай, але пэўнай дарогай да будучага разумнага парадку. Дактрыне правідэнцыяналізму дзеячы эпохі Асветніцтва супрацьпаставілі палажэнне аб тым, што пры вывучэнні гісторыі трэба шукаць натуральныя прычыны падзей, што у гісторыі дзейнічаюць натуральныя і ніякія іншыя заканамернасці.

Вялікую цікавасць выклік у французскіх асветнікаў і праблема паходжання сацыяльна-палітычных установ Францыі і французскай нацыі. Пачатак вострай палеміцы па названай праблеме паклала гісторычная спрэчка паміж **Анры дэ Буленвільe** і абатам **Дзюбо** ў перш. 1/3 XVIII ст. Буленвільe абгрунтаваў германісцкую тэорыю, згодна якой паходжанне французскага грамадства і дзяржавы ёсць наступства германскага заваявання Галіі. У выніку яго заваёўнікі – франкі сталі гаспадарамі, а пераможанныя гала-рымляне – простанароддзем. Такім чынам законнасць прывелей і зямельных манаполій французскіх арыстакратаў бярэ пачатак у праве пераможцаў. Гэта права перадавалася ад пакалення да пакалення дваранства. Толькі кров., знатнае паходжанне даюць дваранства. Ні кароль, ні якая-небудзь установа не могуць гэтага зрабіць. Адпаведна створанае манархіяй дваранства мантыі ён адносіў да III саслоўя, а абсалютызм Буленвільe лічыў папраннем законных правоў дваранства. Пры гэтым ён спасылаўся на часы Хлодвіга і яго пераймальнікаў, калі каралі выбіраліся арыстакратамі і былі толькі першымі сярод роўных.

Абат Дзюбо супрацьпаставіў германісцкай тэорыі Булінвільe раманскую. Ён адвяргае сам тэзіс аб заваяванні Галіі, падрываючы тым самым аснову германісцкай канцэпцыі. Дзюбо даказвае, што адбылося зусім не заваяванне, а арганічнае зліццё ісконнага насельніцтва Галіі і прышэльцаў франкаў. Таму не можа быць і гаворкі аб пераможцах і пераможных. Франкская манархія – арганічны працяг Рымскай імперыі. Пастулова, у выніку ўзаемадзеяння розных плямён і культур узнікла французская нацыя. Дваранскія прывілеі - гэта вынік узурпацыі правоў народа і каралеўскай улады, ажыццёўленае арыстакратыяй. За гэтай дыскусіяй. стаяла пытанне аб абгрунтаванасці прытэнзій дваранства на пануючае становічша ў грамадстве. Калі Буленвільe адстойваў гэта права, то Дзюбо рашуча выступаў супраць.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Адным з буйнейшіх прадстаўнікоў французскага асветніцтва з’яўляецца **Шарль Луі Монтескье** дэ Секонда, барон дэ ла Брэд (1689-1755). Мантэскье адзін з заснавальнікаў геаграфічнага накірунку ў грамадазнаўстве новага часу. Ён даказваў, што геаграфічнае асяроддзе – клімат, глеба, месцазнаходжанне – рашаючым чынам уплываюць на грамадскі лад. Прыродныя ўмовы фарміруюць характар і “дух” народа, уплываюць на яго эканамічную дзейнасць і рэшце рэшт вызначаюць існуючыя ў розных народаў формы дзяржаўнай улады. Так, напрыклад, з уздзеяннем памяркоўнага клімату Брытанскіх астравоў, ён звязваў станоўчыя моманты англійскага дзяржаўнага ладу. А спякотны клімат на столькі аслабляе цела і дух, што людзі там выконваюць свае абавязкі толькі пад страхам пакарання. У такіх краінах рабства менш супярэчыць розуму. Існаванне абшырных імперый у Азіі Мантэск’е звязваў з рэльефам мясцовасці, наяўнасцю тут вялікіх па плошчы раўнін. Таму тут захаваць цэласнасць краіны можа толькі дэспатычная ўлада. Указваючы на ролю глебы, Мантэск’е адзначаў, што пладародная глеба Лакамедона парадзіла арыстакратычнае праўленне, а бедная глеба Атыкі – народнае праўленне. Монтэскье імкнуўся звязваць уплыў прыродных фактароў з тым ці іншым спосабам здабычы сродкаў для жыцця, які і ўплываў на ўтварэнне і змену палітычных форм. Тут прасочваюцца ужо некаторыя элементы матэрыялізму. Мы маем падставу лічыць Мантэск’е адным з актыўных прыхільнікаў канцэпцыі геаграфічнага дэтэрменізму.

Адной з важнейшых катыгорый грамадскага жыцця Мантэскье лічыў законы. Яны з’ўляліся вынікам адвольнай творчасці розуму. У народаў, дасягнуўшых высокага ўзроўня цывілізацыі, заканадаўства пачынае іграць рашучую ролю, адсоўваючы на другі план прыродныя фактары. Ён лічыў, што рымскае заканадаўства адыграла важнае значэнне ў узвышэнні Рыма, але ў перыяд яго ўпадку, у новых гістарычных умовах перастала іграць станоўчую ролю. Трактат “Аб духу занонаў” Мантэскье завяршае нарысам гісторыі феадальных установ Франц. Ён прыняў у цэлым германісцкую канцэпцыю і рэзка крытыкаваў Дзюбо. Ён лічыў дваранства неабходным элементам французскай сацыяльнай сістэмы, бо яно, валодаючы ад нараджэння асаблівым прыстыжам і прывілеямі, з’яўляецца натуральным паборнікам асабістай свабоды і праціўнікам тыраніі. Але Монтэск’е не падзяляў поўнасцю дваранскай тэорыі Буленвілье. Ён лічыў, што ўтварыўшаеся ў выніку франкскага заваявання грамадства ўвабрала не мала і рымскіх элементаў. Прыгонніцтва на думку Мантэск’е, не было непасрэдным вынікам заваявання. Яно ўзнікла паступова, элементы яго сустракаюцца яшчэ да заваявання. Сістэма дваранскіх прывілей таксама склалася не толькі дзякуючы заваяванню, а ў выніку і складанага працэсу.

Мантэск’е разглядае матэрыяльную падплёку войн і адвяргае падыход да вайны як выпадковага прадукта праізволу манархаў ці рэспубліканскіх правадыроў. Ён робіць выснову аб залежнасці характару вайны ад палітычнага ладу ваюючых дзяржаў.дыспатызм прыводіць да несправядлівых і грабітельскіх войнаў, ад якіх терпять народныя масы. Шкоднасць феадальных войнаў Мантэск’е бачыць у тым, што яны падрываюць гандаль.

Мантэск’е адвяргаў пры вывучэнні гісторыі як хрысціянскі правідэнцыяналізм, так і падыход да гісторыі як да скаплення выпадковых падзей.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Ён лічыў, што існуюць агульныя прычыны, якія дзейнічаюць у кожнай дзяржаве, і гэтым прычынам падначалены ўсе выпадковасці ў гісторыі. У сваёй рабоце "Развaжанні аб прычынах велічу і падзення рымлян"бачыць прычыну магутнасці рымлян у іх грамадзянскай дабрадзецелі. Яна праяўлялася ў самаахвярнасці да айчынны. Гэта было звязана з наяўнасцю ў рымлян грамадзянскіх свабод і рэспубліканскай формы праўлення. Усталяванне дыспатычнага праўлення імператара пацягнула за сабою аслабленне грамадзянскай дабрадзецелі. У выніку чаго рымляне праз некалькі стагоддзяў аказаліся нездольнымі супрацьстаяць варварам і былі пераможаны. Мантэскье паказаў неабгрунтаванасць тэзіса многіх хрысціянскіх аўтараў, якія лічылі, што Рым паў пад цяжарам грахоў, якія накапіліся за час панавання тут паганства. Апошняе з яго культам грамадзянскай дабрадзецелі, на думку Мантэск'е, хучэй умацоўвала дзяржаву, чаго не магло рабіць хрысціянства з яго ідэяй сусветнай святасці. Да прычын узвышэння рымлян Мантэск'е таксама адносіць іх здольнасць пераймаць вопыт і дасягненні іншых народаў і раўнамернае размеркаванне зямельнай уласнасці. Гэты дэмакратызм забяспечваў забяспечанасць кожнага грамадзяніна ў абароне рэспублікі. Мантэск'е ідэалізуе антычнасць і супрацьпастаўляе яе недасканалай сучаснасці. У сваім даследаванні, як бачна ўжо з назвы, Мантэск'е не проста апісваў падзеі, а ставіў і вырашаў навуковую праблему.

Адным з буйнейшых гісторыкаў-асветнікаў з'яўляўся **Мары Франсуа Аруэ Вольтер** (1694-1778). Яму належыць вялікая колькасць Яго найбольш фундаментальная гістарычная праца "Дослед аб норавах і духу народаў і аб галоўных гістарычных падзеях" ахоплівае перыяд ад Карла Вялікага да Людовіка XIII. Задачу гісторыі ен бачыў у тым, каб не проста збіраць факты і выкладаць падзеі, але ў тым, каб крытычна асэнсаваць матэрыял з пункту гледжання розуму. Вальтер вялікае значэнне надаваў крытыцы гістарычных крыніц. Ён выступіў адным з заснавальнікаў тэорыі гістарычнага прагрэсу. Ён не падзяляў ідэялізацыю першабытнага "натуральнага стану" чалавецтва. Першасным і вызначаючым імпульсам прагрэсу ва ўсіх сферах чалавечай дзейнасці Вальтер лічыў чалавечы розум, поспехі асветы і веды. Названыя поспехі абумоўлівалі і маральнае ўдасканаленне чалавека, дасягненні мастацтва. Вальтер не лічыў прагрэс рухаючымся ў неадаліма-прамалінейным накірунку. Прагрэс ажыццяўляўся выбарачна, увасабляўся у асобных перыядах, якія выдзяляюцца на цемным фоне і часта адстаяць адзін ад другога доўгімі вякамі невуцтва. Далей Вальтер зазначаў, што калі і патрэбна вывучаць гэтыя вякі, то толькі для таго, каб імі пагарджаць. У сувязі з гэтым Вальтер крайне нецярпіма ставіўся да сярэдневечча. Для яго гэта час варварства. Феадальнае кіраванне на яго думку – гэта хаос, у якім моцны падаўляе слабога, а народ празябае ў рабстве.

Вальтэр выступаў як прыхільнік дэтэрменізму ў гісторыі. На яго думку нішто ў гісторыі не адбываецца без прычыны. У той жа час у ранніх творах Вальтэра аддае даніну і выпадковасці ў гісторыі. Асаблівае значэнне мае выпадковае з'яўленне «вялікага чалавека». «Вялікія людзі» даюць штуршок развіццю чалавецтва, асабліва, калі ў іх руках аказваецца вярхоўная ўлада. У больш позніх працах Вальтэр змяншае ролю вялікіх асоб у гісторыі. Вальтэр імкнецца даць гісторыю цывілізацыі, у якой факты палітычнага жыцця і ваенныя дзеянні маюць

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

падначалены характар. Ён выказвае цікавасць і да матэр'яльных фактараў грамадскага жыцця: характар працы людзей, іх побыт, характар гандлёвых сувязей. Але галоўным фактарам гістарычнага развіцця Вальтэр лічыць погляды людзей. Развіццю чалавецтва садзейнічаюць усе народы. Няма абраных народаў.

Гісторыя, на думку Вальтэра не павінна абмяжоўвацца толькі выкладаннем дакладна выверанных фактаў. Гісторык павінен умець аддзяліць важнае ад няважнага, адкінуць дробязі, месца якім не ў гістарычных працах, а ў даведніках. Гісторыя павінна быць абагульняючай, філасофскай і несці павучальны элемент.Гісторыя павінна выкладаць усе злачынствы ўладароў чалавецтва. Такі падыход вёў да таго, што Вальтэр пераносіў ацэнкі, правільныя для сучаснасці, на мінулае. Так, ён не змог зразумець прагрэсіўнасці пераходу ад антычнага грамадства да феадальнага, не змог ацаніць значныя заслугі каталіцкай царквы ў культурным развіцці Еўропы ў пэўныя гістарычныя эпохі. Для яго ўся гісторыя чалавецтва – гэта барацьба царкоўнага фанацізму і дэспатызму за ўладу. Вальтэр адмаўляў старажытную гісторыю чалавецтва, лічачы, што ў гісторыкаў няма дакладных крыніц, кааб яе напісаць. У сваіх работах Вальтэр не прытрымліваўся прынцыпу, гістарызму.

Асуджаючы феадалізм і дэспатызм, Вальтер быў супраць таго, каб лічыць неабходным сілай мяняць існуючы стан рэчаў. Адсюль і яго стаўлянне да буйнейш народных выступленняў – Жакерыі, паўстання Уота Тайлера, Сялянскай вайны ў Германіі. З аднаго боку ён лічыў, што гэтыя выступленні былі вынікам прыцяснення з боку феадалаў, але з другога асуджаў паўстанне за прымяняемае імі насілле. Найлепшым шляхам вырашэння наспеўшых грамадскіх праблем ен лічыў рэформы, ажыццяўл. адукаваным манархам, філосафам на троне. Шукаючы ў гісторыі станоўчыя прыклады адукаванага абсалютызма, Вальтэр, насуперак сваім заявам, што ен хоча пісаць гісторыю людзей, а не каралёў, вельмі вялікую цікавасць праяўляў менавіта да гасудараў. Яго працы прысвечаны цараванням Людовіка XIV, Карла XII, Пятра I.

Карл XII для Вальтэра не быў ідэальным манархам, і яго гісторыя павінна была паказац, якім не павінен быць манарх-асветнік. А вось Пётр I быў для Вальтэра ўвасабленнем новай Расіі. Ён паказаў рускага цара як вялікага рэфарматара, які знішчаў старыя феадальныя парадкі і за кароткі час ператварыў "варварскую" Расію ў першакласную еврапейскую дзяржаву.

Сведчаннем пашырэння геаграфічных межаў гістарычнага даследвання ў век Асветніцтва з'яўляецца праца **Гійома Рэйналя** (1713-1796) "Філасофская і палітычная гісторыя ўстаноў і гандлю еўрапейцаў у абодвух Індыях" (1780). Раней еўрапейскія гісторыкі абмяжоўваліся пераважна еўрапейскай гісторыяй, а таксама гісторыяй народаў, якія ўзгадваліся ў Бібліі. У працы Рэйналя ўпершыню даследуецца з асветніцкіх пазіцый гісторыя еўрапейскай каланіяльнай палітыкі ў Азіі, Афрыцы, Амерыцы. Даволі выразную форму набывае ў сачыненні гісторыка-матэрыялістычныя тэндэнцыі. Важнейшай рухаючай сілай цывілізацыі Рэйналь лічыў развіццё рамесел, мануфактур і асабліва гандлю. З ім Рэйналь звязваў велізарныя перамены, адбыўшыеся ў Еўропе ў XV-XVI ст.

Рэйналь асуджае феадалізм і ў яго працах ужо на многа слабей, чым у Вальтэра, гучыць спадзяванне на правядзенне рэформ з дапамогай адукаванага

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

манарха. Рэйналь вітае вопыт вайны англійскіх калоній у Паўночнай Амерыцы за незалежнасць. Вялікую цікавасць у Рэйналя выклікаюць Нідэрландская і Англійская рэвалюцыі. Ён лічыць бунт дапушчальным сродкам у барацьбе супраць тыраніі, але не лепшым спосабам вырашэння грамадскіх праблем. Ён рашуча асуджае ураўняльныя тэндэнцыі, характэрныя для многіх народных рухаў. Праца Рэйналя адна з першых, дзе разам з асуджэннем феадалізму прысутнічае і асуджэнне спосабаў першапачатковага накаплення капіталу. Ён, у прыватнасці лічыў, што павінна быць ліквідавана каланіяльная сістэма.

**Жан-Жак Русо** (1712-1778) не займаўся спецыяльна гісторыяй, але яго ідэі аказалі значны ўплыў на развіццё гэтай навукі. Імкнучыся высветліць прычыны няроўнасці і яе паходжанне, Русо звяртаецца да гістарычнага мінулага чалавецтва. Гістарычнае развіцце Русо звязваў з паступовым удасканаленнем людзьмі спосабаў здабывання неабходных прадуктаў. Ён лічыў найбольш счаслівым перыядам у гісторыі чалавецтва першабытны лад. З развіццём апрацоўкі метала і земляробства ўзнікае найвялікшае, на думку Русо, зло – прыватная ўласнасць. Яна разбурае роўнасць і параджае ўсе парокі. Пачынаецца барацьба паміж багатымі і беднымі і для аховы сваёй улады і маёмасці багатыя дамагліся стварэння грамадскай улады і законаў на аснове грамадскага дагавору паміж людзьмі. Пры гэтым форма ўлады залежыць ад размеркаванай уласнасці. Там, дзе вылучаўся багаццем адзін чалавек – усталёўваецца манархія, дзе некалькі сем'яў – арыстакратычнае праўленне, дзе размеркаванне ўласнасці было больш менш раўнамерным сярод вялікай колькасці ўласнікаў – дэмакратыя. Страціўшы сваю натуральную свабоду, бедныя не набылі свабоду палітычную. Гістарычны працэс Русо, як і іншых асветнікі, разгляд. як адзіны і заканамерны. У яго даследаванні яскрава абазначаны элементы гістарызму і матэрыялізма. Русо ставіць змену і ўзнікненне грамадскіх форм у цесную сувязь з развіццём матэрыяльнага жыцця, са з'яўленнем новых прыёмаў вытворчай дзейнасці.

Русо адрозніваецца ад іншых асветнікаў і ў ацэнцы грамадскага прагрэсу. Ён даказвае, што развіццё навук, мастацтва не з'яўляецца абсалютным благам, бо адначасова назіраецца аддзяленне чалавека ад прыроды, рост няроўнасці, падзенне маралі. Ён лічыў, што чалавецтва ўжо ўступіла ў перыяд драхласці. Ён лічыў магчымым затрымаць гэты працэс. Для гэтага людзям неабходна вярнуцца да прыроды, да прастаты, г. з. вярнуць чалавеку тыя прынцыпы і законы, якія дадзены яму прыродай.

Рэвалюцыя рашуча асудзіла раней існаваўшы ў Францыі стан рэчаў і разбурыла многія яго элементы, важныя для развіцця гісторыі як навукі. У 1792 г. былі прыняты спецыяльныя дэкрэты, якія прадпісвалі знічшэнне гістарычных дакументаў з прыватных архіваў дваранскіх сем'яў, бумаг сеньяральнай адміністрацыі. У 1793 г. была закрыта Французская Акадэмія, ліквідаваны старыя ўніверсітэты. Разбураючы многія ранейшыя навуковыя і архіўныя установы, французская рэвалюцыя стварыла і новыя. Так, упершыню была створана агульна-нацыянальная сітэма архіваў, быў абвешчаны свабодны доступ у архівы ўсіх грамадзян.

Асветніцкую лінію ў французскай гістарыяграфіі ў час рэвалюцыі працягваў **Жан Антуан Кондэрсе** (1743-1794). Яго галоўны твор "Эскіз гістарычнай карціны

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

прагрэсу чалавечага розума”. Кондэрсе імкнецца развіць агульную гісторыю чалавецтва, намеціць схему яе паслядоўных этапаў і вызначыць месца ў гэтым працэсе Французскай рэвалюцыі. Вядучай ідэяй гістарычнай канцэпцыі Кондэрсе з’яўляецца ідэя прагрэсу. Згодна Кондэрсе, уся гісторыя чалавецтва – гэта паслядоўны і ўсе больш паскараючыся рух да ўсе больш разумнага, адпавядаючага законам прыроды стану рэчаў. Галоўныя крытэрыі прагрэсу – развіцце розуму і навуковага пазнання свету, поспехі ў дасягненні свабоды.

Гэты прынцып пакладзены Кондэрсе ў перыядызацыю гісторыі чалавецтва на 9 этапаў. Першыя пяць ахопліваюць развіццё чалавецтва ад першабытнай эпохі да антычнасці. Перыяд, наступіўшы ў Еўропе ў першыя часы пасля падзення Рымскай імперыі, Кондэрсе лічыў эпохай глыбокага ўпадку. Але элементы асветы ўсё ж існавалі, і гэта прадвызначыла яе далейшае адраджэнне. У 7-ю эпоху, ад XI ст. да вынаходніцтва кнігадрукавання, чалавечы розум зноў набывае страчаную раней энергію, адбываюцца важныя вынаходніцтвы, у гарадах і нават некаторых дзяржавах з’яўляюцца парасткі свабоды. Асаблівае паскарэнне прагрэсу адбываецца ў 8-ю эпоху, пасля вынаходніцтва кнігадрукавання і да сярэдзіны XVII ст. У гэтую эпоху чалавечы розум падрыхтоўвае і паскарае момант уласнай свабоды. Нарэшце з сярэдзіны XVII ст. у 9-ю эпоху розум канчаткова разбівае свае ланцугі. Людзі нарэшце прыходзяць да разумення сваіх натуральных правоў і іх абарона павінна стаць галоўнай функцыяй грамадства і дзяржавы.

Задачу рэвалюцыі Кондорсе бачыць ва ўсталяванні вялікіх прынцыпаў розуму і свабоды і лічыць рэвалюцыю абумоўленую аб’ектыўнымі прычынамі. На яго думку, Французская рэвалюцыя павінна была ахапіць усе сферы жыцця грамадства, змяніць эканамічныя, палітычныя і сацыяльныя адносіны. За рэвалюцыяй, як лічыў Кандорес, павінна была наступіць дзясятая эпоха ў гісторыі чалавецтва – эпоха прагрэсу чалавечага розуму. Лінейнае развіццё прагрэсу павінна прывесці да панавання розуму і свабоды.

Арыгінальную гістарычную канцэпцыю распрацаваў ў час рэвалюцыі **Антуан Барнаў** (1761-1793). У 1792 г. ён стварыў сваю асноўную праца “Уводзіны ў Французскую рэвалюцыю”. Ён робіць спробу даследаваць прычыны і значэнне рэвалюцыі. Барнаў зыходзіў з заканамернасці і прагрэсіўнасці развіцця чалавецтва. Вызначаючы аб’ектыўна дзейнічаючые сілы гістарычнага прагрэсу, ён указвае на першаснаю ролю матэрыяльных, эканамічных фактараў, такіх, як рост насельніцтва і звязаннае з ім павелічэнне матэрыяльных патрэбнасцей, зменаў спосабаў здабычы жыццевых благ і змен форм уласнасці. Менавіта уласнасці Барнаў прыдаваў асаблівае значэнне, калі шукаў прычыны змены розных палітычных форм грамадства. Так, ён лічыў, што панаванне зямельнай уласнасці непазбежна вядзе да ўтварэння арыстакратычнага ці феадальнага праўлення. Дальнейшае натуральнае развіццё павелічэнне насельніцтва і развіццё сродкаў задавальнення матэрыяльных патрэб вядзе да заснаванне мануфактур, гандлю і ўзнікнення прамысловай уласнасці. Ў выніку рыхтуецца рэвалюцыя і ў палітычных законах. Новая размеркаванне багацця параджае новыя формы ўлады. Галоўным наступствам развіцця прамысловай уласнаці Барнаў лічыў умацаваныя сілы народа і падзення сілы арыстакратыі. У рэвалюцыі ў Англіі, Франціі ён бачыў дэмакратычны ўзрыў накіраваны супраць арыстакратыі. Ён прызнаваў па сутнасці

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

барацьбу классаў – арыстакратаў і трэцяга саслоўя, але адмауляў наяўнасць сацыяльных супярэчнасцей унутры трэцяга саслоўя. Барнаў лічыў, што прырода прамысловай уласнасці такая, што вядзе да змягчэння крайнасцей беднасці і багацця. Ён быў першым і адзіным з сучаснікаў, хто паспрабаваў звязаць Французскую рэвалюцыю з працэсамі не только духоўнымі і палітычнымі, але і сацыяна-эканамічнымі.

Галоўнае ў асветніцкай гістарыяграфіі Францыі – гэта пошук агульных заканамернасцей гістарычнага развіцця, абгрунтаванне ідэі прагрэсу, з’яўленне элементаў матэрыялістэрыялістычнага разумення гісторыі.

**6.** Фарміраванне германскай гістарыяграфіі 18 ст. вызначалася такімі момантамі германскай рэчаіснасці, як дзяржаўная раздробленасць і наяўнасць моцных феадальных перажыткаў, якія перашкаджалі паспяховаму развіццю капіталізму, вынікі Рэфармацыі. Яна вылучыла у цэнтр яе ўвагі і багаслоўскія праблемы, забяспечыла доўгае і беспадзельнае панаваннне тэалогіі, што вяло да рэлігійнай трактоўкі гістарычнага працэсу. Тэрытарыяльная раздробленасць Германіі спрыяла канцэнтрацыі інтарэсаў яе перадавых мысліцеляў на праблемах нацыянальнага адзінства, на найбольш вострых у тагачасных умовах праблемах дзяржаўнага права. Заснавальм навукі аб адзіным дзяржаўным праве з`яўляўся **Іоган Якоб Мозер** (1701-1785). Ён разумеў гісторыю як частку г.з. адзінай дзяржаўнай навукі, г.з. гісторыю разглядаў не столькі як самастойную навуковую дысцыпліну, колькі як уводзіны у навуку нямецкага дзяржаўнага права. Разуменне гістарычнага працэсу філосафамі нямецкага асветніцтва было ідэалістычным. Ідэалістычная нямецкая філасофія эпохі Асветніцтва унесла свой уклад у выпрацоуку дыалектычных метадаў гістарычнага даследавання.

Вяршыняй філасофскай думкі нямецкага Асветніцтва з`явілася творчасць **Імануіла Канта** (1724-1804). Кант зыходзіў з прызнання таго факту, што ў жыцці грамадства дзейнічаюць пэуныя законы. Указваючы на несупадзенне асабістых мэт і грамадскіх вынікаў, Кант лічыў, што толькі ў агульным ходзе гісторыі можна разглядзець адзіную для ўсяго чалавецтва разумную мэту. Яе Кант бачыў у ўсталяванні ўсеагульнага прававога грамодзянскага становішча, пры якім кожны валодае поунай свабодай, сумяшчальнай аднак са свабодай іншых. Згодна Канту, гісторыю рухаюць супярэчнасці паміж людзмі. Але гэтыя супярэчнасці прымушаюц ьлюдзей ствараць рэгулюючы орган – дзяржаву.

Кант лічыу, што любы првіцель будзе злоўжываць сваёй уладай, калі над ім не апынецца орган, кантралюючы яго на аснове закона. Сусветная гісторыя для Канта была развіваючайся сістэмай, ступенямі развіцця якой з`ўляліся Старажытная Грэцыя, Рымская імперыя, Германскія народы. Кожная з гэтых ступенек уяўляла крок наперад у паляпшэнні дзяржаўнага ладу. Кант прадстауляе гістарычнае развіццё як прагрэсіўны і заканамерны працэс. Пры гэтым вялікую ролю ў яго ходзе ён адводзіў працы.

Т.ч. важнейшы ўклад Канта ў развіццё гістарычнай думкі заключаўся ў тым, што ён сфармуляваў ідэю аб цэласнасці і заканамернасці гістарычнага працэсу, паказаў яго прагрэсіўны характар. Кант для тлумачэння гістарычнага развіцця ўпершыню скарыстаў законы дыаклектыкі. Ён разглядаў грамадскія прцэсы ва

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

ўзаемасувязі і ўзаемазалежнасці і лічыў супярэчнасці паміж людзмі важнейшай крыніцай развіцця.

Буйны нямецкі паэт і драматург **Іоган Фрыдрых Шылер** (1759-1805) быў і значным для свайго часу гісторчкам. Галоўнай рысай гісторыі чалавецтва Шылер лічыў культурны і навуковы прагрэс і падкрэсліваў, што поспехі ў барацьбе супраць духоўнага дэспатызму тыранаў вылучылі сярэдняе бюргерскае саслоўе на ролю творцы ўсёй германскай гісторыі. Гісторыя на думку Шылера, прывучае чалавека разглядаць сябе ў сувязі з усім сваім мінулым і падрыхтоўвае яго да вывадаў у адносінах да будучага. Шылер падкрэслівае, што гісторыя ўключае ў сябе ўвесьмаральны свет і ўвёў у вывучэнне мінулага ідэю адказнасці чалавека перад грамадствам. Важнейшыя гістарычныя творы Шылера – гэта “Гісторыя адпадзення Аб`яднаных Нідэрландаў ад іспанскай кароны“ і “Гісторыя Трыцацігадовай вайны“.

Нідэрландскую рэвалюцыю Шылер паказаў фрагментарна. Галоўнай сілай у барацьбе нідэрландскага народа супраць Іспаніі Шылер лічыў буржуазію. Ён падкрэсліў, што саюз абяднеўшых дваран-гёзаў мог ваяваць супраць іспанцаў толькі таму, што абапіраўся на фінансавую падтрымку пратэстанскіх гандляроў. У боль шырокім плане вывад Шылера зводзіўся да таго, што ў любым вызваленчым патрыятычным руху кіруючая роля павінна належыць саюзу дваранства і буржуазіі пры перавазе апошняй. Але гэты саюз можа выканаць сваю задачу толькі пры наяўнасці ў яго такой якасці, як памяркоўнасць у барацьбе за вырашэнне задач нацыянальнага вызвалення.

У гісторыі Трыццацігадовай вайны шылерам разгледжана толькі яе першая палова, а апошнія 13 год ачэрчаны бегла. Прычынай вайны Шылер лічыў рэлігійныя супярэчнасці. Ён выказваў сімпатыі пратэстантызму і падкрэсліваў велізарную гістарычную ролю Рэфармацыі. Вельмі многа ўвагі ён удзяляў дзейнасці лідэра пратэстантаў – шведскага караля Густава Адольфа. У асвятленні вайны ў Шылера на першы план выступаюць асабістыя матывы правіцілей, чыста суб`ектыўныя і выпадковыя моманты ходу падзей. У той жа час аўтар з велізарнай мастацкай сілай паказаў тыя жахі і пакуты, якія несла з сабой вайна. Для гістарычных прац Шылера характэрны падыход з пазіцый маралі і псіхалогіі, якія на яго думку з`яўляюцца рухавікамі прагрэсу.

Навыя моманты ў развіццё нямецкай гістарыяграфіі ўнёс **Іаган Гонфрыд Гердэр** (1744-1803). Яго асноуная праца – “Ідэі да філасофіі гісторыі чалавецтва“. Гердэр робіць спробу асэнсаваць увесь працэс развіцця чалавецтва і яго гісторыю як працяг гісторыі прыроды. Ён рашуча выступаў супраць тэалагічнага разумення гісторыі і падкрэсліваў, што ў гісторыі патрэбна шукаць не некі божскі промысел, а зямныя прычыны. Галоўная ідэя працы Гердэра – гэта ідэя заканамернага і прычынна абумоўленага развіцця чалавецтва. Ён адыйшоў ад прадстаўлення французскіх асветнікаў аб развіцці як аб прамалінейным безперапынным працэсе і вылучыу на першы план ідэю прагрэса, развіваючагася не плаўна, а скачкападобна, з магчымымі адхіленнямі і зігзагамі. Змест прагрэсу заключаўся па Гердэру, у нараджэнні, умацаванні і развіцці ідэй гуманнасці. Гэта Гердэр лічыў рысай, якая адрознівала свет чалавека ад свету жывёл. У той жа час Гердэр падкрэсліваў, што для асобных эпох і народаў характэрны пэўныя асаблівасці. Радзімай чалавецтва

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

Гердэр лічыу Азію, адкуль пайшло развіццё культуры чалавецтва. Наступны этап у развіцці чалавецтва, па Гердэру, адбыўся на аснове германскай культуры. Менавіта яна вызначала пргрэсіўнае развіццё Еўропы. У той жа час Гердэр з павагай ставіўся і да культурных дасягненняў іншых народаў.

Гердэр адвяргаў гістарыяграфію, якая зводзілася да праслаўлення каралёў, палкаводцаў. Ён лічыў, што ў цэнтр гістарычнага даследавання павінен быць пастаўлены народ. Дзяржаву Гердэр разглядаў як машыну прыгнечання, якая павінна знікнуць, калі народ зможа выпрацаваць здольнасць да самакіравання. Упершыню ў гісторыі Гердэр паставіў пытанне аб тым, што Біблія – гэта прадукт народнай творчасці.

Буйнейшым прадстаўніком Гецінгенскай школы, з дзейнасцю якой звязана імкненне ператварыць вывучэнне гіст.у самастойную навуковую дысцыпліну, быў **Аўгуст Людвіг Шлёцэр** (1735-1809). Ён высока цаніў дзейнасць Екацерыны II; Іосіфа II; Фрыдрыха II як манархаў-асветнікаў. Галоўным прадметам даследаванняў Шлёцэра з`яўлялася дзяржава, якую ён разглядаў як найбольш эфектыўны інструмент прагрэсу. У сваіх працах па сусветнай гісторыі Шлёцэр не абмяжоўваўся толькі палітычнымі і ваеннымі падзеямі. Ён імкнуўся ўлічыць і эканамічны фактар, паказаць, што асобныя галіны гаспадарчай дзейнасці людзей развіваюцца не ізалявана, а ў цеснай узаемасувязі. Так, ён многа ўвагі ўдзяляў наступствам адкрыцця агню, вынаходства пісьма, пораху, кнігадрукавання.

Імкненне ахапіць многія бакі сацыяльнай рэчаіснасці, прыдаюць усеагульнай гісторыі сапраўды сусветны характар было найбольш моцным бакам работ Шлёцэра. Ён зыходзіў з таго, што ўсе народы і ўсе гістарычныя эпохі, аб якіх маюцца гістарычныя звесткі, заслугоўваюць дасканалага навуковага вывучэння. Вялікую цікавасць праяўляў Шлёцэр да рускай гісторыі. Некаторы час ён працаваў у Расійскай Акадэміі навук. Вялікая яго заслуга ў зборы, вывучэнні і выданні рускіх летапісаў. Пры гэтым ён крытычна падыходзіў да звестак, якія ў іх утрымліваліся і імкнуўся ўстанавіць іх сапраўднасць. Шлёцэр прытрымліваўся нарманскай тэорыі паходжання рускай дзяржавы. Але ён указваў, што значэнне варагаў у далейшай гісторыі Расіі было невялікім і не наклала на яе значнага адбітку. Творчасць Шлёцэра з`явілася як бы мастом паміж нямецкай гістарычнай думкай эпохі Асветніцтва і ліберальнай германскай гістарыяграфіяй першай паловы IXX ст.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

## ТЭМА: ЕЎРАПЕЙСКАЯ ГІСТАРЫЯГРАФІЯ ЭПОХІ РАМАНТЫЗМУ

1. Французская гістарыяграфіі першай паловы XIX ст.
2. Германская гістарыяграфіі першай паловы XIX ст.
3. Англійская рамантычная гістарыяграфія.

**Літаратура.**

Карлейль Т. Французская революция. История. – М., 1991.
Костикова И.В. Философско-социологические взгляды Т.Карлейля. – М., 1983.
Далин В.М. Историки Франции XIX – XX веков. – М., 1981.- 325 с.
Ерофеев Н.Л. Английская историческая мысль 30-40-х гг. 19 в. // Маркс – историк. – М., 1968.
Реизов Б. Г. Французская романтическая историография (1815-1830). - Л., 1956.
Гизо Ф. История Английской революции. В 2т. – Ростов-на-Дону, 1991.
Федосова Е.И. Франсуа Гизо: историк и государственный деятель // Новая и новейшая история. – 1997. №2.

Перыяд рэстаўрацыі стаў у многім пераломным у справе развіцця гістарычнай навукі ў Францыі. Гэты перадом быў у многім звязаны з характэрнай для рамантычнага светапогляду ўзмацненнем цікавасцю да мінулага, а таксама з тым, што гісторыя стала важнай зброяй ідэйна-палітычнай барацьбы ў Францыі. У гэтай ідэйнай барацьбе ў якасці цэнтральнай была вылучана праблема аб адносінах да Французскай рэвалюцыі і яе спадчыны. Рамантычная плынь у французскай культуры, у тым ліку і гістарыяграфіі, сфарміравалася ў самым канцы XVIII – пачатку XIX ст. у многім як традыцыяналісцкая рэакцыя на Вялікую французскую рэвалюцыю. Найбольш яскрава ідэі кансерватыўнага рамантызму адлюстраванны ў працах Жозэфа дэ Мэстра і Луі дэ Банальда.

**Жозэф дэ Мэстр** (1753-1821) у 1796 г. надрукаваў працу "Меркаванні аб Францыі", якая рашуча была накіравана супраць рэвалюцыі. Але большую вядомасць атрымалі напісаныя ім ўжо ў час рэстаўрацыі сачыненні "Аб папе" і "Пецярбургскія вечары". Для дэ Мэстра характэрны пісімістычны погляд на чалавека. Людзі маюць шмат заганаў. Таму законам існавання свету з`яўляюцца зло, несправядлівасць, а непазбежным наступствам гэтага – забойствы, войны, злачынствы. Для ўтаймавання чалавечых заганаў для кіравання грамадствам патрэбна непрыракаемая ўлада дзяржавы і царквы, патрэбны жорсткасць і насілле, інквізіцыя і палач. Лепшая форма дзяржавы, згодна дэ Мэстру, – гэта абсалютная ўлада караля, які абапіраецца на дваранства. Але вяшэй караля на Зямлі ўлада каталіцкай царквы, увасобленая ў папе.

Дэ Мэстр абгрунтоўваў тэзіс аб немагчымасці пераўтварэння грамадства і дзяржавы з дапамогаю напісаных у духу разуму законаў і канстытуцый. не засноўваюцца канстыт-ямі. Сутнасць дзяржавы, лічыў ён, у народным духу. У сваёй гісторыі людзі падначальваюцца сілам, якімі з`яўляюцца норавы, звычаі, забабоны. Яны пануюць над людзьмі незалежна ад іх волі, а не рацыянальныя законы.

Французскую рэвалюцыю дэ Мэстр асэнсоўваў з пазіцый рэлігійна-правідэнцыяналісцкага погляду на гісторыю. Хоць рэвалюцыя была справай сатанінскай, пісаў ён, але ў ёй яскрава бачна рука правідзення. Рэвалюцыя з`явілася карай, якую бог абрушыў на ўпаўшых ў грэх французаў. Гэтае страшнае пакаранне было адзіным сродкам выратавання Францыі. Канкрэтныя прычыны рэвалюцыі ён звязваў з развіццём крытычнай думкі, філасофіі і навукі ў XVII-XVIII ст., якія

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

расшаталі рэлігійную веру і ўвесь стары парадак. Дальнія вытокі разбуратьнай філасофіі дэ Мэстр бачыў у Рэфармацыі, вучэннях Кальвіна і Лютэра.

Да поглядаў дэ Мэстра былі блізкімі і гістарычныя канцэпцыі **Луі дэ Банальда** (1754-1840). Яго асноўны твор – "Тэорыя палітычнай і рэлігійнай улады ў грамадзянскай супольнасці, заснаваная на розуме і гісторыі"(1796 г.). Згодна дэ Банальду, грамадскі парадак трымаецца на трох асновах: панаванне рэлігіі, саслоўная няроўнасць, абсалютная манархія. Неабмежаваная манархія выцякае з агульнага законупабудовы сусвету. У свеце ўсё збудавана манархічна: бог правіць светам, душа – чалавекам, бацька – сямьёй. Усялякае пасягненне на манархію ёсць пасягнене на натуральны стан рэчаў. Англію з яе канстуцыйнай манархіяй дэ Банальд лічыў самай адсталай краінай. Хартыю 1814 г., па якой у Францыі былі ўсталяван.элементы канстытуцыйнага кіраванага, ён лічыў "дзецішчам бязумства і змроку". Дэ Банальд лічыў, што да пачатку рэвалюцыі Францыя пасля 14 стагоддзяў гісторыі валодала выдатнай манархічнай канстытуцыяй, а французскі народ быў шчаслівы як ніколі раней. Рэвалюцыя ж з`явілася пакараннем за грэхападзенне французаў. Гэтае грэхападзенне ён звязваў з ідэямі французскага Асветніцтва, Яна Гуса і мысліцеляў эпохі Рэфармацыі.

Кансерватыўнай гістарыяграфіі супрацьстаяла ліберальная гістарычная школа часоў рэстаўрацыі, буйнейшымі прадстаўнікамі якой з`уляліся О.Цьеры, Ф. Гізо, Ф. Мінье, А. Цьер. Яны ў пэўнай ступені працягвалі традыцыі асветніцкай гістарыяграфіі, успрынялі яе антыфеадальную накіравнасць, гістарычны аптымізм, перакананасць у прагрэсіўным развіцці чалавецтва. Але для ліберальнай школы быў характэрны гістарызм, уяўленне аб арганічным развіцці грамадства. У гэтым плане яны ішлі ў русле рамантызма. Адстойваючы ідэю аб прастаўнічым праўленні, яны імкнуліся ў гісторыі сярэднявечча выявіць зараджэнне буржуазіі і адпавядаючых яе інтарэсам палітычных ўстаноў. Важным укладам ліберальных гісторыкаў у развіццё гістарычнай думкі была распрацоўка канцэпцыіі класаў і класавай барацьбы. Цэнтральнай праблемай, якую вывучалі гісторыкі ліберальнай школы эпохі рэстаўрацыі, была Французская рэвалюцыя, буржуазныя рэвалюцыі ўвогуле. Даследуючы гэтую праблему, многія з іх займаліся пошукам каранёў рэвалюцыі, актыўна вывучаючы гісторыю сярэднявечча. Вялікую цікавасць у іх выклікала гісторыя Англіі з яе канстытуцыйна-манархічнай формай праўлення, у якой яны бачылі ўзор для Францыі.

**Агюстэн Цьеры** (1795-1856) адносіўся да ліку заснавальнікаў ліберальнай школы. Сярод гісторыкаў гэтай школы для Цьеры найбольш характэрны рысы рамантызму. Ён рэзка крытыкаваў абстрактнае выкладанне гісторыі ў духу рацыяналізму, характэрнае для асветнікаў. Важнай задачай гісторыка ён лічыў аднаўленне мінулага ў яго непаўторнай своеасаблівасці, пранікненне ў дух часу з дапамогай мастацкага ўялення і інтуіцыі. Цьеры з'яўляецца адным з аўтараў канцэпцыі класавай барацьбы ў французскай гістарыяграфіі. Ідэю барацьбы саслоўяў, розных народаў ён паклаў у аснову сваёй канцэпцыі гісторыі Францыі. Утварэнне французскай дзяржавы ён звязваў з франскім заваяван., у выніку якога ўзніклі дзве ўзаемна непрымірымыя "расы", два народы: заваёўнікі-франкі, стаўшыя дваранамі і заваяванае гала-рымскае насельніцтва, з якога выйшла 3-е саслоўе. Іх барацьба пранізвае ўсю далейшую гісторыю краіны. Яе важнейшыя

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

вехі: камунальная рэвалюцыя XII і Французская рэвалюцыя XVIII ст. З рэстаўрацыяй барацьба аднавілася. Яе вынікам, лічыў Цьеры, павінна стаць канчатковая перамога 3-га саслоўя. Ізлюбленнай тэмай Цьеры была барацьба гарадскіх камун супраць феадалаў ў XI-XII ст. Ён лічыў яе сапраўднай сацыяльнай рэвалюцыяй, гістарычным пралогам Французскай рэвалюцыі XVIII ст. Сама рэвалжцыя была канчатковым рэваншам пераможаных. Класавая барацьба носіць у Цьеры своеасаблівую расавую форму, выступае як узнікшая ў выніку заваявання барацьба розных нацыянальнасцей. Але па сутнасці гаворка ідзе аб сацыяльнай барацьбе дваранства і 3-га саслоўя. Унутры 3-га саслоўя ён не бачыў сацыяльных супярэчнасцей і сацыяльнай барацьбы.

У гады рэстаўрацыі былі створаны буйнейшыя гістарыяныя працы другім прадстаўнікам ліберальнай школы **Франсуа Гізо** (1787-1874). Гізо таксама вывучаў пераважна гісторыю сярэдневяковай Францыі, шукаючы ў ёй прычыны Французскай рэвалюцыі. Гізо імкнуўся да стварэння "філасофскай", г.з. абагульняючай гісторыі, каб вылучыць асноўныя тэндэнцыі ў гістарычным развіцці. У гэтым плане ён развіваў вальтэраўскую традыцыю. Гізо адстойваў ідэю грамадскага прагрэсу, які бачыў ва ўдасканаленні грамадства і маральным развіцці чалавецтва. Разам з Цьеры, Гізо быў адным са стваральнікаў канцэпцыі класавай барацьбы. Ён лічыў, што барацьба паміж саслоўямі напаўняе ўсю новую гісторыю, з яе, можна сказаць,"нарадзілася навейшая Еўропа". Гэтую барацьбу Гізо лічыў вынікам германскага заваявання. У Францыі, на яго думку заваяваны народ на працягу 13 стагоддзяў змагаўся за звяржэння іга народа-пераможцы. Французская рэвалюцыя стала рашаючай бітвай гэтай барацьбы. У выніку яе былы пераможаны народ стаў народам пераможцай і ў сваю чаргу заваяваў Францыю. У шэрагу сваіх работ Гізо даваў больш глыбокае тлумачэнне барацьбы сасловій, не звязваючы яе з заваяваннем. У цэнтр барацьбы ставіліся пытанні развіцця маёмасных адносін, перш за ўсё ўласнасці. Гізо зазначыў, што для таго, каб зразумець палітычныя ўстановы, неабходна вывучыць розныя грамадскія слаі і адносіны паміж імі. А каб зразумець гэтыя розныя грамадскія слаі, трэба знаць прыроду адносін уласнасці.

Азначаны вышэй прынцып прыярытэту сацыяльных адносін адступае ў Гізо на другі план пры практычным ажыццяўленні гістарычных даследаванняў. У яго канкрэтна-гістарычных пабудовах вядучым пачаткам выступае барацьба паміж абстрактнымі палітычнымі прынцыпамі. Так, палітычную барацьбу ў Францыі XVII-XVIII ст. ён тлумачыць барацьбой паміж прынцыпам абсалютнай манархіі і прынцыпам свабоды. У адрозненні ад Цьеры, Гізо не лічыў 3-е саслоўе адзіным. Ён адзначаў, што ўжо ў час камунальнага руху ў нізах 3-га саслоўя існавала варожасць ў дачыненні да багатых. На яго думку толькі маёмасныя слаі з`яўляліся сапраўднымі носьбітамі духу 3-га саслоўя. Буржуазія валодае асобымі ўласцівасцямі розуму і характару, што дазваляе ёй стварыць капітал і ісці па шляху прагрэсу. Узвышэнне буржуазіі – гэта галоўны змест наступнай гісторычнай эпохі. Гізо прадвызначаў мэту гістарычнага развіцця Францы і ўсёй еўрапейскай цывілізацыі ва ўсталяванні канстытуцыйнай манархіі.

Найбольш вядомыя работы Гізо – гэта "Гісторыя ыывілізацыі ў Еўропе" і "Гісторыя цывілізацыі ў Францыі". У іх адлюстравана імкненне аўтара наблізіцца да разумення заканамернасцей гістарычнага працэсу. Ён выказаў пункт гледжання,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

што старое грамадства ніколі не распадзецца раней, чым у яго асяроддзі не ўзнікне новае. Гаворачы пра еўрапейскую цывілізацыю, Гізо адзначаў, што яна існуе ўжо 15 стагоддзяў і ўвесь час знаходзіцца ў стане прагрэсу. Прытрымліваючыся пнцыпу гістарызму, Гізо сцвярджаў, што ў гісторыі не было ні адной выпадковай, ці пазбаўленай сэнсу эпохі.

У 1826-1827 гг. Гізо выдаў два томы "Гісторыі Англійскай рэвалюцыі". На яго думку, Англійская рэвалюцыя складалася з 4 актаў: 1) цараванне Карла I і яго барацьба з доўгім парламентам; 2) рэспубліка на чале з Кромвелем; 3) рэстаўрацыя Сцюартаў; 4) канчатковае падзенне Сцюартаў і ўступленне на трон Вільгельма Аранскага. Такім чынам, па Гізо рэвалюцыя цягнулася з 1625 па 1688 г. Ён даказваў, што Англійская рэвалюцыя, нягледзячы на яе абасобленасць, аднатыпна з Французскай. На думку Гізо, ў Англійскай рэвалюцыі рэлігійная і палітычная барацьба хавалі сацыяльнае пытанне і барацьбу розных класаў за ўладу і ўплыў. Ён паказаў сацыяльныя перадумовы рэвалюцыі. Гізо ўказваў, што ў той час, як англійская манархія імкнулася да абсалютызму, а прыйшоўшая ў заняпад вышэйшая арыстакратыя зблізілася з дваранствам, у глыбіні грамадства адбываўся супрацьлеглы пераварот. У гарадах хутка развіваліся гандаль і прамысловасць, зямельная ўласнасць пераходзіла ў рукі простага дваранства, фрыгольдэраў, гараджан, якія багацелі і авалодалі сапраўднымі крыніцамі ўлады. У выніку англійскі абсалютызм пазбавіўся рэальнай апоры. Такім чынам, прычыны Англійскай рэвалюцыі Гізо звязваў у многім з развіццём у краіне капіталістычных .адносін, у выніку чаго адбылося пераразмеркаванне зямельнай уласнасці, і новыя ўласнікі патрабавалі ўдзелу ў кіраванні краінай. Ён бачыць тры важнейшыя вынікі Англійскай рэвалюцыі: 1) каралеўская ўлада была абмежавана парламентам; 2) у парламенце ўлада належала палаце абшчын, г.з. новаму дваранству; 3) у Англіі ўсталявалася поўнае і канчатковае панаванне пратэстантызму.

Ліберальныя гісторыкі эпохі рэстаўрацыі стварылі важныя працы, у якіх даследавалі непасрэдна Вялікую французскую рэвалюцыю. У 1824 г. з`явілася "Гісторыя Французскай рэвалюцыі" **Франсуа Агюста Мінье** (1796-1884). Рэвалюцыю ён лічыў падзеяй неабходнай, заканамернай і станоўчай для Францыі. Ідэя неабходнасці рэвалюцыі займае цэнтральнае месца ў працы. Яна, на думку Мінье, была пераломным момантам у гісторыі Францыі. Да рэвалюцыі ў Францыі яшчэ існавалі сярэдневяковыя формы грамадства. Гэты стары парадак рэвалюцыя замяніла новым, больш справядлівым і больш адпавядаючым патрабаванням часу. Рэвалюцыя змяніла не толькі палітычную ўладу, але зрабіла пераварот ва ўсім стане нацыі. Рэалюцыя разбурыла старое грамадства, а пры імперыі ўсталявалася новае. Гісторыю рэвалюцыі Мінье разглядаў як барацьбу розных класаў. Усе гады рэвалюцыі прайшлі ў імкненні аднаго з класаў, складаўшых нацыю, усталяваць сваё панаванне. Мінье вызначыў у рэвалюцыі тры асноўныя змагаючыяся сілы. Прывілегіраваныя класы імкнуліся ўсталяваць свой парадак супраць двара і буржуазіі. Сярэдні клас, ці буржуазія, адстойвала прынцып свабоды і змагалася супраць прывілегіраваных і супраць народных мас. Яе інтарэсы ўвасобіла Канстытуцыя 1791 г. Народ адстойваў прынцып роўнасці. Спробай масы захапіць уладу была Канстытутуцыя 1793 г. і якабінская дыктатура. Ён лічыў закнамернымі

РЭПАЗІТОРЫЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

і гістарычна апраўданымі дзеянні якабінцаў, але падкрэсліваў іх нядзольнасць справіцца з цяжкасцямі, якмя тады перажывала Францы.

Міньe быў перакананы, што ўлада павіна належаць забяспечанаму і адукаванаму класу. Гэтаму адпавядалі пераўтварэнні Устаноўчага сходу і Канстытуцыя 1791 г. Ён шкадаваў, што ракавая сіла абставін прывяла да ўлады якабінцаў. Але ён лічыў заканамернымі і неабходнымі ўсе этапы рэвалюцыі. Кожны з іх, у тым ліку і якабінская дыктатура, выконвалі ў ёй пэўную ролю. Крайнасці якабізма былі выкліканы контррэвалюцыяй і вайной. Без іх немагчыма было перамагчы. Міньe зыходзіў з таго, што гістарычнага дзеяча нельга судзіць на аснове абстрактных маральных прынцыпаў, а трэба улічваць абставіны яго дзейнасці і яе вынікі. Таму адно і тое ж дзеянне можа быць апраўдана з пункту гледжання палітыкі, але асуджана з пазіцыі маралі. Так на думку Міньe, дзейнасць якабінцаў была неабходнай для рэвалюцыі, але для дасягненя мэты яны выкарыстоўвалі сродкамі, недапушчальныя з маральнага пункту гледжання.

У асноўным з тых жа пазіцый, што і праца Міньe, была напісана “Гісторыя французскай рэвалюцыі” **Адольфа Цьера** (1797-1877) Цьер, як і Міньe зыходзіў з ідэй аб неабходнасці, хутчэй нават фатальнай абавязковасці рэвалюцыі і кожнага з яе этапаў. Рэвалюцыю ён разглядаў як цэласны блок заканамерных узаемазвязаных падзей і працэсаў. У адносінах да гэтых падзей і працэсаў ён займаў тыя ж пазіцыі, што і Міньe.

Ліпеньская рэвалюцыя 1830 г. Усталявала ў Францыі буржуазную манархію. Ішоў працэс зрашчвання зямельнай і фінансавай арыстакратыі. У новых умовах на першы план ужо выйшлі сацыяльныя супярэчнасці унутры былога трэцяга саслоўя. Усе гэтыя з’явы знайшлі адлюстраванне у французскай гістарыяграфіі 30-40 гг. У 30-40-я гг. XIX ст. гісторыкі ліберальнай школы часоў рэстаўрацыі прыйшлі да высновы, што з усталяваннем ліпеньскай канстытуцыйнай манархіі барацьба класаў зжыла сябе. О. Цьеры менавіта ў 40-я гады стварыў сваю найбольш значную гістарычную працу “Вопыт гісторыі паходжання і поспехаў трэцяга саслоўя”, у якой яскрава адлюстравалася змена гістарычнай канцэпцыі ліберальнай гістарыяграфіі. Захаваўшы ідэю аб ролі барацьбы класаў у гісторыі Францыі, Цьеры істотна змягчыў яе ранейшую вастрыню. Ён палічыў цяпер патрэбным указаць на гістарычныя заслугі дваранства. Да іх ён адносіў ваенную доблесць, патрыятызм. Асабліва настойліва Цьеры праводзіў думку аб значэні саюза паміж каралеўскай уладай і трэцім саслоўем. Дзякуючы яму, як пісаў Цьеры і ўзнікла сучасная Францыя.

У гады ліпеньскай манархіі шырокую вядомасць набылі погляды палітыка, пісьменніка і гісторыка **Алексіса дэ Токвіля** (1805-1859) дзкуючы працы “Аб дэмакратыі ў Амерыцы”. Галоўная праблема, якую ставіць у сваёй працы Таквіль: як ва ўмовах дэмакратыі (г.з. ва ўмовах палітычнай і грамадская роўнасці) забяспечыць свабоду. А свабоду ён разумее перш за ўсё як гарантыю для меншасці супраць тыраніі большасці. Ва ўмовах той эпохі меншасць, аб правах якой клапаціўся Таквіль, выступала як меншасць, валодаўшая маемасцё і атрымаўшая адукацыю. Таквіль бачыў неабарачальнасць эгалітарна-дэмакратычнага працэсу і апасаўся яго наступстваў. Небяспеку яго ён бачыў у тым, што ўсталяванне палітычнай і грамадзянскай роўнасці, знішчэнне саслоўных і прывілееў можа

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

прывесці да страты свабоды і ўсталявання цэзарысцкага рэжыму. Усталяванне банапартысцкага рэжыму ў Францыі пасля рэвалюцыі Таквіль лічыў наступствам ўсталяваннай рэвалюцыяй дэмакратыі.

Разглядаючы амерыканскія палітычныя інстытуты, Таквіль адзначыў і адмоўныя бакі грамадскага жыцця ў ЗША: маёмасныя кантрасты, прадажнасць палітыкаў. Ён з разуменнем ставіўся да тых дзяржаўных інстытутаў, якія абмежоўвалі ўплыў сацыяльных нізоў і маглі ўберагчы амерыканскае грамадства ад рэвалюцыі. Да ліку стабілізуючых элементаў палітычнай сістэмы ЗША Таквіль адносіў двухпалатны парламент, Вярхоўны суд, шырокія правы прэзідэнта. Таквіль аддаваў перавагу Амерыканскай рэвалюцыі у паразнанні з Французскай з-за таго, што яна адбывалася ў цэлым у рамках парадку і законнасці, захавала цесную сувязь паміж рэлігійным духам і духам свабоды.

Дэмакратычная плынь у французскай рамантычнай гістарыяграфіі знайшла сваё ўвасабленне ў працах **Жюля Мішле** (1798-1874). Ён у сваёй важнейшыя працы "Гісторыя Францыі" імкнуўся у духу рамантызму да жывога ўваскрашэння мінулага, пранікнення у "дух" народа. У адрозненні ад ліберальнай школы, галоўнай сілай французскай гісторыі Мішле лічыў не буржуазію, а народ. Пад народам ён разумеў дробных уласнікаў-працаўнікоў, перш за ўсё сялян. Супрацьпастаўленне народа буржуазіі мае ў яго не столькі сацыяльна-эканамічны, колькі сацыяльна-культурны сэнс. Мішле лічыў, што у адрозненні ад буржуазіі і ад адукаваных людзей увогуле, народ захоўвае натуральную дасканаласць. Ён кіруецца ў сваёй дзейнасці не некімі мудрагелістымі разважаннямі, а "магутным народным інстынктам". Для яго харатктэрны любоў да радзімы і самаахвяраванне.

"Гісторыя Французскай рэвалюцыі" Мішле – гэта спроба напісаць гісторыю рэвалюцые знізу, з пункту гледжання барацьбы народных мас. Мішле ўлавіў глыбокую народную аснову рэвалюцыі і даў яркія карціны масавых народных выступленняў. Надаючы асабліваe значэнне "наіўнаму інстынкту" народа, ён паказаў, што менавіта народ адыгрываў рашаючую ролю ў важнейшыя моманты рэвалюцый. У аснове рэвалюцыі, на думку Мішле ляжалі не матэрыяльныя інтарэсы, а ідэі справядлівасці, братэрства і свабоды. Мішле супрацьпастаўляў неадукаваную, але моцную сваім верным інстынктам народную масу буржуазіі, палітычнм дзеячам і партыям. У той жа час Мішле даказваў, что ў гады рэвалюцый не было ніякіх прычын для канфлікту паміж буржуазіі і народам. Найбольшыя сямпатыі ў Мішле выклікаў Дантон за яго імкненне да прымірэння партый. У якабінцах ён бачый нешта накшталт інквізытараў, карпарацыю, варожную інтарэсам народа. Вышэйшым дасягненнем рэвалюцыі ён лічый паустанне 10 жніўня 1792 г. і ўсталяванне рэспублікі.

**2.** Разгарнуўшаяся пасля Венскі кангрэсу ідэйная барацьба знайшла адлюстраванне і ў тагачаснай нямецкай гістарыяграфіі. У ёй праявіліся дзве асноўныя тэндэнцыі: кансерватыўна-рамантычная, меўшая перавагу ў Прусіі і іншых дзяржавах Паўночнай Германіі, і ліберальная на паўднёвым-захадзе краіны. Вялікі ўплыў на развіццё германскай гістарыяграфіі аказала ў гэты час нямецкая класічная філасофія Яна ўзброіла гістарычную навуку новымі тэарэтычнымі канцэпцыямі, новай метадалогіяй.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Ідэі прадстаўнікоў нямецкай класічнай філасофіі знайшлі завяршэнне ў творчасці **Георга Вільгельма Фрыдрыха Гегеля** (1770-1831). Гегель упершыню паспрабаваў прыменіць дыялектычны метад да вывучэння сусветнай гісторыі, разглядаючы яе як прагрэсіўны працэс, развіваючыся праз барацьбу супрацьлегласцей. Сусветную гісторыю Гегель разумеў як самаразвіццё першаснага сусветнага духа, заключаючагася ў няспынным расце асэнсаванай свабоды. Сусветны дух у Гегеля – гэта ўсё чалавецтва ў цэлым. Гегель увёў паняцце гістарычных і негістарычных народаў. На яго думку ў кожны гістарычны перыяд з`яўляецца той ці інш. народ, які адыгрывае вядучую ролю ў гісторыі. Але не існуе якога-небудзь раз і на заўсёды абранага народа.

Гегль прыйшоў да высновы, што не столькі вялікія асобы ствараюць гісторыю, колькі сама гісторыя стварае сваіх героеў. Развіццё грамадства не з`яўляецца вынікам суб`ектыўных імкненняў правіцелей, а падначалена аб`ектыўным заканамернасцям, якія можна пазнаць навукова. Будучы ідэалістам, Гегель шукаў рухаючую сілу прагрэсу ў сферы грамадскай свядомасці. Ён лічыў, што прагрэс заключаецца ў асэнсаванні свабоды. Па вучэнню Гегеля свабода ўпершыню нараджаецца на Усходзе, але была задушана дэспатамі. Далей сусветны дух перамясціўся ў Старыжытную Грэцыю. Тут ужо з`явілася асэнсаванне свабоды як каштоўнасці, але толькі нямногія сталі свабоднымі. Неабходнай умовай свабоды ў антычных народаў была яе супрацьлегласць – рабства. Таму і там прынцып свабоды быў толькі прыкрыццём яе папрання. Пачатак трэцяга этапу ў гісторыі чалавецтва Гегль звязваў з узнікненнем хрысціянства і яго распаўсюджваннем у германскіх народаў. Тады пачаў зараджацца прынцып: чалавек ёсць свабодны. Пакуль што ён толькі асэнсаваны. Яго ж укараненне ў жыццё і прадстаўляе змест новай гісторыі. Такім чынам, змест і сэнс гісторыі ў Гегля заключаецца ў няспынным руху ад прыроднага рабства да сапраўднага чалавечага жыцця пад абаронай свабоды, увасобленай у дзяржаве. Тэорыя Гегеля адлюстровае толькі палітыка-юрыдычны бок сусветнай гісторыі.

Ён лічыў, што войны нельга ліквідаваць з гісторыі чалавецтва. Вайна, на яго думку, не павінна разглядацца як абсалютнае зло, ці выпадковая з`ява. Менавіта войны правяраюць трываласць дзяржаўнай сістэмы, сувязь яе элементаў. Спасылаючыся на прыклад вайны Прусіі з Напалеонам, Гегель падкрэслівае, што паражэнне прымусіла Прусію асэнсаваць урокі і аздаравіць сваю дзяржаўную пабудову шляхам рэформаў. Дзяржава была той формай, у якой развіваўся прынцып свабоды, таму менавіта пазітыўнае развіццё дзяржавы выходзіць для Гегеля на першы план. Найлепшай формай дзяржаўнага ладу Гегель лічыў канстытуцыйную манархію. Яна прадстаўлялася больш устойлівай, бо ў адрозненні ад тараніі і дэмакратыі ўраўнавешвала інтарэсы большасці і меншасці. Ён крытыкаваў сацыяльныя язвы нараджаўшагася капіталізму і лічыў, што яны могуць быць ліквідаваны шляхам паступовых рэформаў зверху. Галоўная заслуга Гегеля ў развіцці гістарычнай навукі заключаецца ў тым, што ён прынёс у яе дыялектычную метадалогію.

На мяжы XVIII-XIX ст. у нямецкай гістарычнай навуцы ўсё шырэй пачынаюць распаўсюджвацца ідэі рамантызму. У гістарыяграфіі рамантызм выступаў у двух варыянтах: рэакцыйны і ліберальны. Не прымаючы буржуазных адносін, нямецкія

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

рамантыкі звярталіся да мінулага, як да ідэальнай сутнасці ўсяго чалавецтва, да царства не разуму і разліку, а царства пачуццяў, фантастыкі, містыкі. Аднак ідэалізацыя сярэднявяковага феадальна-саслоўнага ладу яшчэ не азначала, што рамантыкі выступалі за вяртанне да сярэдневяковых парадкаў. Яны выступалі за кансервацыю таго, што яшчэ засталося ад сярэдневяковых парадкаў, перш за ўсё паўабсалютысцкіх рэжымаў і саслоўнага ладу германскага грамадства. Прыхільнасць нямецкіх рамантыкаў да кансерватызму спалучалася з заклікамі да сацыяльнай справядлівасці. Рамантычная гістарафія ўнесла вялікі ўклад у фарміраванне прынцыпу гістарызму. Згодна з ім гісторыкі-рамантыкі разглядалі кожны этап ў гісторыі як неабходную з’яву ў ланцугу гістарычнага развіцця. Яно ўяўлялася рамантыкам як плаўны прцэс, які нельга парушыць ні рэформамі, ні рэвалюцыямі. У дачыненні да сучасных ім буржуазных адносін нямецкія рамантыкі адкідывалі прынцып гістарызму. Яны лічылі, што паколькі гэтыя адносіны не маюць гістарычных каранёў, яны негістарычныя.

Найбольш вядомай гістарычнай школай нямецкіх гісторыкаў-рамантыкаў з`яўлялася школа права. Яе буйнейшым прадстаўніком быў **Фрыдрых Карл Савінье** (1779-1861). Ён выступае як праціўнік любога канстытуцыяналізму. Гэта знайшло адлюстраванне ў працы “Аб прызванні нашага часу да заканадаўства і навука аб праве“. Савіні адвяргае формулу аб праве як прадукце розуму. Ён аб`яўляе, што права – адзін з прырод.бакоў нацыянальнай сутнасці любога народа. Права немагчыма сканструіраваць, ці заняць у іншых народаў. Яно з`яўляецца арганічным праяўленнем народнага духу, і не можа быць ні створана, ні адменена асобным заканадаўствам, паколькі ўзнікае з унутранай сутнасці нацыі і ўсёй яе мінулай гісторыі. Кожная эпоха, лічыў Савіні, з’яўляецца прцягам папярэдняй. Таму развіццё ў кожную эпоху заснавана на загадзя дадзеным становішчы, змяніць якое па-за чалавечай воляй.

Бліжэйшым саратнікам Савіні быў **Карл Фрыдрых Эйхгорн** (1781-1854). У сваёй галоўнай працы “Гісторыя ням.дзяржавы і права” ён упершыню прасочана развіццё нямецкага права і дзяржаўных інстытутаў са старажытнейшых часоў і да пачатку XIX ст. Аўтар разглядае ўсе вобласці права як часткі адзінага цэлага. Заканамернасці развіцця права ён тлумачыць яго нацыянальна-гістарычнымі асновамі. Галоўная ідэя кнігі заключалася ў абвяржэнні поглядаў асветнікаў на нямецкае права як на збор анахранізмаў і на доказе таго, што яно з`яўляецца заканамерным прадуктам развіцця нямецкага народнага духа.

Гісторыкі гістарычнай школы права ставілі ў цэнтр даследавання дзяржаўна-прававыя аспекты гістарычнага развіцця. Пры гэтым іх падыход вызначаўся крайнім кансерватызмам. Адно з цэнтральных месцаў у іх гістарычных канцэпцыях займала ідэя аб народным духу. Народ разглядаўся як носьбіт традыцыяналісцкіх і кансерватыўных ідэй, на якіх і грунтуецца права ў той ці іншай дзяржеве.

Блізкія да гістарычнай школы права канцэпцыі і падыходы знайшлі адлюстраванне ў працах аднаго з буйнейшых германскіх гісторыкаў XIX ст. **Леапольда Ранке** (1795-1886). Ранке за сваё доўгае жыццё стварыў велізарную колькаць гістарычных прац: па гісторыі Міжземнамор`я, рымскіх пап, нямецкай гісторыі часоў рэфармацыі, гісторыі Прусіі, Аўстрыі, Англіі, працы па гісторыі

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

войн і міжнародных адносін. У канцы жыцця Ранке працаваў над шматтомнай сусветнай гісторыяй.

Свой падыход да гістарычных даследаванняў ён сфармуляваў словамі: пісаць гісторыю так, як гэта было на самой справе. Гэты тэзіс быў накіраваны як супраць маралізму асветнікаў, якія імкнуліся выступаць у ролі суддзяў у адносінах да гісторыі, так і супраць рамантыкаў, якія часта прыўкрашвалі ісціну. Ранке лічыў, што ход гістрыі вызначаецца божскай воляй. У кожнай эпосе, у кожнай дзяржаве ён бачыў непаўторную індывідуальнасць, канкрэтнае і ўнікальнае ўвасабленне божскай ідэі. Ранке быў перакананы, што інтарэсы асобы павінны быць падначалены інтарэсам дзяржавы. Апошняя ж можа дасягнуць поўнага росквіту толькі ў выпадку незалежнасці ад іншых дзяржаў. Таму першаступенчатае значэнне мае ваенная магутнасць дзяржавы, а ўнутраная палітыка павінна падначальвацца інтарэсам знешняй. У сувязі з гэтым Ранке не цікавіўся сацыяльна-эканамічнымі і культурнымі праблемамі ў гісторыі. Уся яго ўвага была сканцэнтравана на гісторыі міжнародных адносін і палітычнай гісторыі асобных дзяржаў. Увесь ход сусветнай гісторыі Ранке адлюстраваў толькі ў ідэйна-палітычным аспекце, ігнаруючы сацыяльна-эканамічныя фактары. Напрыклад Рэфармацыю ў Германіі ён тлумачыў чыста палітычнымі прычынамі. На яго думку яны была выклікана барацьбой князёў супраць папы і імператара. Толькі да рэлігійных прычын ён зводзіў перадумовы Нідэрланскай рэвалюцыі і Трыцацігадовай вайны.

Ранке лічыў, што гісторык павінен канцэнтраваць сваю ўвагу перш за ўсё на важнейшых падзеях, якія аказалі вялікі ўплыў на расстаноўку сіл на міжнароднай арэне. У адрозненне ад гісторыкаў школы права, Ранке сцвярджаў, што ўнутранае развіццё краін у вялікай ступені залежыць ад знешніх фактараў. Так французская рэвалюцыя, на яго думку, была выклікана стратай Францыяй ранейшага станавішча пануючай еўрапейскай дзяржавы, што пагоршыла яе ўнутранае становішча і прывяло да росту незадавальнення ўнутры краіны. У цэлым творы Ранке нясуць у сябе багаты і цікавы фактычны матэрыял. Але аўтар не імкнецца глыбока пранікнуць у прычынна-наступствавыя сувязі гістарычнага працэсу.

У перш.палове XIX ст. нараджаецца і ліберальная плынь у германскай рамантычнай гістарыяграфіі. Адным з яе буйнейшых прадстаўнікоў з’яўляўся **Вільгельм Цымерман** (1807-1878). Яго найбольш значныя творы – “Гісторыя вялікай сялянскай вайны” (1841-1843) і “Германская рэвалюцыя” (1848). У першай з гэтых прц Цымерман на першы план ставіць рэлігійна-палітычныя супярэчнасці той эпохі. Сацыяльныя канфлікты адыходзяць на другі план. У працы “ Германская рэвалюцыя” аўтар апісаў падзеі вясны 1848 г.на поўднёвым-захадзе Германіі. Ён паказаў антыфеадальны характар сакавіцкіх рэвалюцый у Германіі. Затым ён акцэнтуе галоўную ўвагу на дзейнасці Франфурцкага парламенту. Пры гэтым ён амаль не кранае падзей у Прусіі, якія мелі рашаючае значэнне для развіцця рэвалюцыі. Цымерман лічыў, што германская ліберальная буржуазія з`яўлялася галоўнай рэвалюцыйнай сілай у Германіі. Ён не ўбачыў яе адыходу ад рэвалюцыі пасля перамогі сакавіцкіх паўстанняў. Цымерман лічыў, што рэвалюцыя пацярпела паражэнне з-за ракавой непадрыхтованасці нямецкага народа да рэвалюцыі.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

**3.** У першай палове XIX ст. у англійскай гістарыяграфіі захоўваўся падзел на тарыйскую і вігскую плыні. Найбольш яскрава тарыйская канцэпцыя знайшла сваё адлюстраванне у працах **Арчыбальда Алісона** (1792-1867). Яго дзве асноўныя працы "Гісторыя Еўропы ў перыяд Французскай рэвалюціі", "Гісторыя ад рэстаўрацыі да вацарэння Напалеона III". Зыходная пазіцыя аўтаразаключаецца ў тым, што любыя перамены непажаданыя. Яны вядуць да рэвалюцый. Алісон нападаў на губіцельную страсць да перамен і ўсхваляў англійскую палітычную сістэму. Гісторыя Французскай рэвалюцыі і І Імперыі выкладзена ім крайне тэндэнцыйна. Ён асуджае ўсе палітычныя сілы, якія ўдзельнічалі ў рэвалюцыі. Напалеон І для Алісона толькі крывавы тыран. Насупраць, англійскія дзяржаўныя дзеячы таго часу – У. Піт, герцаг Велінгтон, з'яўляюцца ўвасабленнем міралюбства.

Іншыя пазіцыі займала вігская школа. Вігскія гісторыкі шукалі ў гісторыі аргументы на карысць рэформаў. Менавіта вігскі накірунак ў англійскай гістарыяграфіі займаў вядучыя пазіцыі ў першай палове XIX ст. Найбольш відным прадстаўніком вігскай гістарыяграфіі з'яўляўся **Томас Макалей** (1800-1859). Галоўная гістарычная праца Макалея "Гісторыя Англіі ад вацарэння Якава II" ахоплівае перыяд з 1685 па 1702 г. У цэнтры даследавання "слаўная рэвалюцыя" 1688 г. Макалей усхваляў яе кампрамісны і бяскроўны характар. Ён прыўзносіць гэтую рэвалюцыю як узор і супрацьпастаўляе яе рэвалюцыйным падзеям сярэдзіны XVII ст. Апошнія, на думку Макалея, падарвалі магутнасць і веліч Англіі. Яго кніга – гэта ўсхваленне англійскай канстытуцыйнай манархіі. З навуковага пункту гледжання работа Макалея мае шэраг недахопаў. У характарыстыцы палітычных дзеячаў і ацэнцы падзей Макалей нярэдка прыбягаў да адвольных сцвярджэнняў, якія не абапіраюцца на крыніцы. Макалей прыстрастны гісторык. Пры гэтым ён і не імкнуўся да аб'ектыўнасці. Макалей пісаў, што гісторык не безпрыстрастны суддзя, а адвакат, строга зацікаўлены ў падзеях, таму яго задача заключаецца не ў тым, каб слепа следаваць фактам, а каб выказваць свае суджэнні аб гістарычных падзеях.

У англійскай гістарыяграфіі першай паловы XIX ст. сфарміравалася плынь, якая на аснове ідэй рамантызму прапаведавала крытычны падыход да капіталізму. Гэта адлюстравалася ў творчасці аднаго з буйнейшых англійскіх гісторыкаў XIX ст. **Томаса Карлейля** (1795-1881). Першае буйное гістарычнае сачыненне Карлейля – "Гісторыя Французскай рэвалюцыі" – выйшла ў 1837 г. Канцэпцыя, якую Карлейль паклаў у аснову сваёй працы, была ідэалістычнай, сфарміраванай пад значным уплывам ідэй рамантызму. Карлейль асуджае "фанатызм", народную ярасць і бязумства ў час рэвалюцыі. Ён імкнецца ўнушыць, што вынікам рэвалюцый можа быць толькі тэрор і анархія. Але з другога боку Карлейль адзначае, што Францыя ў час рэвалюцыі стала краінай не для багатых, а для бедных. Карлейль піша, што нельга знайсці такога перыяду часу, калі ўсе 25 млн. французаў пакутавалі б меней, чым у той перыяд, які называецца царствам тэрору. Але ў цэлым ён паказвае якабінскую дыктатуру ў самым жудасным святле. Судавы працэс над каралём Карлейль падае з раялісцкіх пазіцый. У сваёй працы ён спыняецца толькі на падзеях у Парыжы і ігнаруе значэнне аграрнага пытання.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Ужо ў "Гісторыі Французскай рэвалюцыі" прагучала канцэпцыя "героеў і натоўпу" Карлейля. Відныя дзеячы эпохі рэвалюцыі (героі) супрацьпастаўляюцца натоўпу. Да ліку героеў адносіўся Карлейлем ў першую чаргу Мірабо. "Гэта ён, - піша Карлейль, - зрушыў старую Францыю з яе асновы, і ён жа, адзіна сваёй рукой утрымліваў ад канчатковага падзення гатовае рухнуць збудаванне". Карлейль прызнаваў станоўчае развіццё рэвалюцый толькі да таго часу, пакуль Мірабо іграў у ёй рашаючую ролю. Мірабо, на яго думку, зразумеў, што рэвалюцыю неабходна абуздаць. Але заўчасная смерць перашкодзіла яму гэта зрабіць. Вялікую і ў цэлым станоўчую ролю ў рэвалюцыі адыграў, на думку Карлейля, і Дантон. Так, аўтар лічыць, што менавіта Дантону Францыя абавязана выратаваннем ад арміі герцага Браўншвейгснага.

Хутка пасля выхаду "Гісторыі Французскай рэвалюцыі" Карлейль выступіў з цыклам лекцый у абгрунтаванне канцэпцыі героя і натоўпу. Ён лічыў неабходным канцэнтраваць намаганні гісторыкаў перш за ўсё на біяграфічным выкладанні гісторыі, на даследаванні дзейнасці герояў. "Гісторыя свету – гэта біяграфіі вялікіх людзей", – пісаў Карлейль. Асноўная думка Карлейля заключалася ў тым, што героі прызваны павелеваць людзьмі, указваць ім кожны крок. Гэтыя ідэі атрымалі развіццё ў працах Карлейля "Пісьма Кромвеля" і "Гісторыя Фрыдрыха Вялікага". Прускага караля ён праслаўляе галоўным чынам як героя, які здолеў прадухіліць рэвалюцыю. Карлейль зыходзіў з таго, што гістарычны працэс не падначальваецца якім-небудзь аб'ектыўным заканамернасцям, а залежыць ад волі і дзейнасці выдатных асоб. У пэўнай ступені тэорыя "героеў і натоўпу" была крокам назад у развіцці гістарычнай навукі. Карлейль выступіў з ёй у той час, калі звядзенне гісторыі да дзейнасці палкаводцаў, каралёў адыходзіла ў мінулае.

У працах Карлейля, напісаных да рэвалюцыі 1848 г., гучыць крытыка буржуазных парадкаў і ідэалогіі, спачуванне народным масам. Ён выкрывае сваекарысце палітыкаў, хібы англійскай дэмакратыі. Так, ацэньваючы чартысцкі рух, ён заявіў, што гэта не вынік дзейнасці "злаўрэдных смуцьянаў", а наступства жабрацтва і бяспраўя народных мас. На працягу 1840-х гадоў крытыка капіталізму ў працах Карлейля прыглушаецца, а ўсё мацней гучаць выказванні супраць пагрозы анархіі з боку народных мас. У кнізе"Раней і зараз" ён стварыў ідылічную карціну сярэдневяковага грамадства, дзе нібыта царылі простыя благародныя норавы, добры манарх забяспечваў дабрабыт і свабоду падданых, а царква клапацілася аб высокіх маральных каштоўнасцях.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

**ТЭМА: Пазітывіскцкая і марксісцкая гістарыяграфія ў Заходняй Еўропе ў другой палове xix ст. пачатку xx ст.**

1. Гістарыяграфія Англіі ў другой палове XIX стагоддзя

2. Гістарычная навука ў Францыі ў 2 – й пал. XIX – пач. XX ст.

3. Нямецкая гістарыяграфія ад малагерманскай школы да крызісу пазітывізма.

4. Праблемы гісторыі ў работах К. Маркса і Ф. Энгельса.

5. Гісторыкі-марксісты канца 19 – пачатку 20 ст.

**Літаратура.**

Собуль А. Жорес, Матьез и история французской революции // Французский ежегодник, 1980. М, 1982.

Собуль А. Классическая историография французской революции // Французский ежегодник, 1976. М., 1978.

Жорес Ж. Социалистическая история Французской революции. – М., 1973. В 6 т.(на кафедре)

Собуль *А*. Жорес, Матьез и история французской революции // Французский ежегодник, 1980. М, 1982.

Маркс – историк. К 150-летию со дня рождения К.Маркса. – М.. 1968.

Энгельс и проблемы истории. М., 1970.

Гольман Л.И. Энгельс – историк. – М., 1985.

Энгельс и проблемы истории. М., 1970.

Гольман Л.И. Энгельс – историк. – М., 1985.

Ф. Энгельс и военная история. - М., 1970.

Алпатов М. А. Политические идеи французской буржуазной историографии XIX века. М.-Л., 1948.

Оболенская С. В. Франц Меринг как историк. М.,1966.

Меринг Ф. Очерки по истории войн и военного искусства. – М., 1956.

Виноградов К. Б. Очерки английской историографии нового и новейшего времени. Л., 1975.

У другой палове XIX ст. у англійскай грамадскай думцы шырокае распаўсюджанне атрымала пазітывісцкая сацыялогія. Буйнейшім англійскім філосафам-пазіцівістам з’яўляўся **Герберт Спенсер** (1820-1903). Ён зыходзіў з думкі, што ў аснове развіцця свету, уключаючы і грамадства, ляжыць закон эвалюцыі, які ён вызначыў як “інтэграцыю матэрыі і суправаджаючы яе рассеяны рух”. Пры гэтым матэрыя дыферэнцыруецца. Закон дыферэнцыяцыі матэрыі Спенсер лічыў універсальным і імкнуўся прымяніць яго і да гістарычнага працэсу. Разуменне эвалюцыі ў Спенсера насіла аднабаковы характар. Развіццё ён разглядаў толькі як павольнае і паступовае, без усялякіх скачкоў. Развіццё адбываецца пад уздзеяннем закона раўнавагі. Згодна гэтаму закону, пры парушэнні раўнавагі прырода імкнецца вярнуцца да ранейшага стану. Гэты прынцып ён прымяняў і ў адносінах да грамадства. На практыцы гэта азначала абгрунтаванне непахіснасці існуючай сацыяльна-палітычнай сістэмы.

У гісторыі грамадства Спенсер вылучаў тры этапы. На першым этапе ўзнікае племяннное грамадства. На другім – з’яўляецца класавае грамадства, адбываецца аб’яднанне плямён у вялікія групы, з’яўляюцца нацыі. Гэты перыяд Спенсер назваў пераходным. Трэці этап ён іменаваў індустрыяльным. На гэтым этапе, на думку Спенсера,чалавецтва і знаходзілася ў яго час. Падзел функцый унутры грамадства Спенсер разглядаў як вынік дыферэнцыяцыі асобных органаў грамадства. Гэта так званая арганічная тэорыя грамадства, пераносячая на яго законы развіцця асобнага арганізма. Яна апраўдвала існаваўшую дыферэнцыяцыю тагачаснага грамадства. Тэорыя Спенсера прызнавала заканамернасці развіцця грамадства. Яго разуменне

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

грамадства як жывога арганізма, усе часткі якога ўзаемасвязаны, штурхала да ўсебаковага вывучэння гістарычных падзей, значна пашырала вобласць гістарычнага даследавання.

Пазітывісцкая метадалогія становіцца пануючай у гістарычнай навуцы Англіі ў другой палове XIX ст., і дзякуючы ёй былі дасягнуты значныя поспехі ў развіцці гістарычнай навукі. У апошнія дзесяцігоддзі XIX ст. у англійскай гістарыяграфіі знікла радыкальнае крыло. У гэты час торыйская гістарыяграфія адмовіліся ад супраціўлення ўсялякім пераўтварэнням і збліжілася з вігскай. Пазітывісты-гісторыкі спрабавалі стварыць цэльную гісторыка-культурную карціну развіцця англійскай дзяржавы і грамадства. Найбольш значнымі гісторыкамі-пазітывістамі разглядаемага часу з'яўляліся Бокль і Леккі.

**Генры Томас Бокль** (1821-1862) найбольш вядомы па сваёй працы "Гісторыя цывілізацыі ў Англіі". Бокль меў на ўвазе паказаць поўную і звязаную гісторыю сусветнай цывілізацыі праз гісторыю асобных народаў, прадставіць усю гісторыю чалавецтва як адзіны працэс. Бокль лічыў, што даследаванне мінулага чалавецтва можна ажыццяўляць метадамі, распрацаванымі навукамі аб прыродзе. Асабліва вялікае значэнне ён надаваў эксперыменту, які прымяняльна да гістарычнай навукі, замяняў выпрацоўкай эталона, які затым прылагаўся да вывучэння гісторыі розных краін. Такім эталонам для яго з'яўлялася гісторыя Англіі. На яго прыкладзе ён імкнуўся даказаць наяўнасць заканамернасцей у гісторыі ўсіх краін.

Як пазітывіст, Бокль зыходзіў з таго, што грамадства падначалена ў сваім развіцці пэўным законам і спадзяваўся, адкрыўшы іх, зрабіць гісторыю дакладнай навукай. Ён лічыў важнейшым законам грамадскага развіцця прагрэс, які для яго атаямляўся перш за ўсё з накапленнем ведаў. У той жа час ён сцвярджаў, што, паколькі чалавецтва частка прыроды, яно падначальваецца яе законам. Бокль падыходзіў да разумення рашаючага ўплыву на гісторыю матэрыяльных фактараў, вылучаючы сярод іх на першае месца геаграфічны фактар: клімат, глебу, харчаванне. Ён лічыў, што па меры развіцця чалавецтва значэнне гэтых фактараў змяншаецца, у той час як значэнне разумовых і маральных фактараў узрастае. Бокль спрабаваў прымяніць да вывучэння чалавечага грамадства і метад статыстыкі. Ён звярнуў увагу на тое, што падзеі ў індывідуальным жыцці асобнага чалавека не толькі вынік яго эмоцый, страсцей, жаданняў, але могуць разглядацца і як праява дзеяння пэўных заканамернасцей у грамадстве: колькасць штогадовых народжанняў, смярцей, злачынстваў і г.д.

Асноўныя пазіцыі англійскай гісторыі Бокль трактаваў з ліберальных пазіцый. Ён высока ацаніў выступленне народа ў англійскай рэвалюцыі супраць арыстакратыі і кароны, вітаў вайну за незалежнасць у США, адабраў французскую рэвалюцыю. Бокль імкнуўся паказаць, што негатыўныя рэакцыя Англіі на Французскую і Амерыканскую рэвалюцыі была цесна звязана з інтарэсамі зямельнай алігархіі, імкнуўшайся падавіць народныя рухі ўнутры сваёй краіны.

Значнай падзеяй у развіцці англійскай гістарыяграфіі стаў выхад у свет працы **Джона Рычарда Грына** (1837-1883) "Кароткая гісторыя англійскага народа". У сваёй працы Грын не абмежаваўся толькі палітычнай гісторыяй. Ён асвятляў эканамічныя і сацыяльныя працэсы. Вялікую ўвагу ўдзяліў ён і духоўнаму жыццю, культуры. І наадварот, войнам, дзейнасці манархаў, палкаводцаў Грын адвёў даволі

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

сціплае месца. Грын імкнецца выявіць дзеянне найбольш значных сіл і фактараў гістарычнага працэсу. У прыватнасці, апісваючы "вайну ружаў" 1455-1485 гадоў, ён імкнецца выявіць яе эканамічныя і сацыяльныя карані. Грын дае адмоўную характарыстыку многім англійскім каралям. У той жа час часта са спачуваннем ставіцца да народа. Гэта знайшло ўвасабленне, напрыклад, ў апісанні паўстання 1381 г. Рэвалюцыі сярэдзіны XVII ст. ён лічыў не вынікам сацыяльнай барацьбы, а вынікам супрааацьстаяння паміж палітычнай традыцыяй і палітычным прагрэсам, паміж прынцыпамі адзінаверства рэлігійнай свабоды.

У вывучэнне гісторыі рэвалюцыі сярэдзіны XVII ст. асабліва вялікі ўклад ўнёс **Сэмюэль Гардзінер** (1829-1902). Яго праца па гісторыі англійскай рэвалюцыі ахоплівае перыяд з 1603 па 1656 г. У сваёй трактоўцы рэвалюцыі Гардзінер адмовіўся ад вігскай канцэпцыі, якая бачыла ў рэвалюцыі сутыкненне і барацьбу двух пачаткаў – дыспатызму ў асобе караля і векавых англійскіх свабод, якія ўвасабляў парламент. Згодна яго канцэпцыі Англійская рэвалюцыя была перш за ўсё пурытанскай рэвалюцыі. Гардзінер бачыў у ёй перш за ўсё барацьбу рэлігійных прынцыпаў і ўпускаў сацыяльны аспект. Таксама ён абыйшоў пытанне аб эканамічных прычынах і перадумовах рэвалюцыі.

З сімпатыяй ставіцца Гардзінер да дзейнасці Кромвеля. Ён паказаў вялікія заслугі гэтага палітыка ў аднаўленні марской і ваеннай магутнасці Англіі. Праца Гардзінера характарызуецца дакладна навуковым падыходам да фактаў. Ён вельмі крытычна падыходзіў да дакументаў і матэрыялаў, адверг многія вымыслы і легенды, створаныя вакол рэвалюцыі і яе дзеячаў. Сваім асноўным прынцыпам ён лічыў праверку кожнага факта.

У апошнія дзесяцігоддзі XIX ст. пад уплывам пазіцівізму важнае значэнне англійская гістарыяграфія пачала надаваць вывучэнню эканамічных праблем. Найбольш буйным гісторыкам, які займаўся эканамічнымі праблемамі, у той час з'яўляўся **Торалд Роджэрс** (1825-1890). Яго праца "Гісторыя сельскай гаспадаркі і цэнаў у Англіі ў 1259-1793 гг." напісана на аснове шырокага кола разнастайных крыніц, якія пралівалі святло на рух цэнаў і заработкаў у гэтыя стагоддзі. Сапастаўляючы ваганні цэнаў на прадукты харчавання і рух заработнай платы, ён імкнуўся выявіць, як змяняўся ўзровень матэрыяльнага жыцця працоўных Англіі. Гэтыя працэссы прасочваліся на шырокім гістарычным фоне. Многія падзеі гісторыі Роджэрс тлумычыць эканамічнымі фактарамі. Так, ён ускрывае глыбінныя сацыяльна-эканамічныя прычыны паўстання У. Тайлера, звязваючы яго з тымі сацыяльна-эканамічнымі працэсамі, якія адбываліся ў Англіі ў XIV ст. Роджэрс з разуменнем ставіўся да дзейнасці трэд-юніёнаў, у прыватнасці да іх барацьбы за павышэнне заработнай платы. Нягледзя тое, што Роджэрс шмат увагі надае вывучэнню эканамічных праблем, у цэлым для яго характэрны ідэалістычны погляд на гісторыю. Галоўнай рухаючай сілай гісторыі ён лічыў прагрэс грамадскай думкі.

Англійскія гісторыкі ў другой палове XIX ст. пачалі распрацоўваць праблемы гісторыі каланіяльнай палітыкі. У 1883 г. выйшла кніга **Джона Сілі** (1834-1895) "Пашырэнне Англіі". Аўтар кнігі звяртаўся да англійскага грамадства і папракаў яго ў тым, што яно не ўдзяляе дастатковай ўвагі каланіяльным праблемам. Ён сцвярджаў, што Англія заваявала палову свету, не маючы пры гэтым пэўнага плана

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

і мэты, як пісаў Сілі"у прыпадку разгубленасці". Яна не асэнсавала велізарнага значэння калоній. На яго думку, гэтае неразуменне адбілася і на англійскай гістарыяграфіі. У той час як асноўныя падзеі англійскай гісторыі ў апошнія два стагоддзі адбываліся за акіянам, у Амерыцы і Азіі, англійскія гісторыкі займаліся амаль выключна вывучэннем гісторыі Еўропы. Гісторыя Англіі, лічыў Сілі, з'яўляецца перш за ўсё гісторыяй пашырэння Брытанскай дзяржавы за межы Брытанскіх астравоў. Рашаючым этапам гэтага пашырэння Сілі лічыў XVIII ст. Асноўным зместам бясконцых войнаў, якія вяла ў той час Англія, была барацьба з Францыяй за валоданне калоніямі. Галоўным вынікам гэтай барацьбы стала стварэнне каланіяльнай імперыі. Сілі пастаянна ўказваў у сваіх працах на цесную сувязь гісторыі з палітыкай. Ён лічыў, што гісторыя складае практычную школу палітыкі. Сілі даказваў, што палітычныя дзеячы павінны добра ведаць гісторыю, асабліва новага часу. Ён сцвярджаў, што гісторыя без палітыкі бясплодна, а палітыка без гісторыі безгрунтоўна.

У апошнія дзесяцігоддзі XIX ст. англійская гістарыяграфія пачынае распрацоўку праблем рабочага руху. У гэтай сувязі адзначым даследаванні **Сіднея і Беатрыс Веб**. У 1894 г. яны надрукавалі працу "Гісторыя трэд-юніянізма". Аўтары выкарысталі шырокае кола крыніц,у тым ліку і архіўныя матэрыялы трэд-юніёнаў, дзяржаўных устаноў. Абапіраючыся на іх, Вебы змаглі даць грунтоўны нарыс гісторыі брытанскіх трэд-юніёнаў. Яны абрысавалі рэпрэсіўную палітыку ўлад у адносінах да трэд-юніёнаў, барацьбу рабочых за паляпшэнне ўмоў жыцця і сацыяльна-палітычныя правы. Галоўную ўвагу Вебы ўдзялялі ўнутранай гісторыі трэд-юніёнаў. Аўтары зыходзяць з таго, што для брытанскага рабочага руху не характэрна рэвалюцыйная тэндэнцыя. Яны лічаць, што ў тред-юніёнах рабочыя бачылі толькі форму абароны сваіх чыста прафесійных інтарэсаў. Палітыку ўрада, які доўга не жадаў прызнаць прафсаюзы, яны лічылі глыбока памылковай. Выступленні рабочых былі, на думку Вебаў, толькі рэакцыяй на прыцясненні з боку ўрада. Чартызм Вебы разглядаюць як караткачасовы нехарактэрны для англійскага рабочага руху эпізод, калі на першы план выйшла актыўная палітычная барацьба рабочых. Асноўны вывад, які робяць Вебы, даследуючы гісторыю англійскага трэд-юніянізма, заключаецца ў тым, што трэд-юніёны прадстаўляюць сабой арганічную частку капіталістычнай сістэмы, і яны з'яўляюцца неабходнымі для яе нармальнага функцыянавання.

**2.** У 50-60-я гады XIX ст. у французкую гістарыяграфію пачынае пранікаць пазітывісцкая метадалогія. Заснавальнікам пазітывісцкай сацыялогіі ў Францыі з'явіўся **Агюст Конт** (1798 – 1857). Конта лічыў, што на змену спекуляцыўнаму, умозрыцельнаму падыходу да тлумечэння грамадскага жыцця неабходна стварыць "пазітыўную" навуку аб грамадстве як адзіным сацыяльным арганізме. Яна павінна быць заснавана, як і навукі аб прыродзе, на дакладных назіраннях і фактах. Лічачы, што гэты прынцып павінен быць прыменяны і да гісторыі, Конт выступаў супраць дробнаснага фактаапісання і тлумачэння гісторыі пабуджэннямі асобных выдатных гістарычных дзеячаў.

Пры тлумачэнні гістарычных падзей для Конта характэрны дуалізм. Побач з асноўным для яго духоўным пачаткам, ён надаваў вялікае значэнне і ўдзеянню на гістарычны працэс матэр'яльных фактараў: біялагічных, геаграфічных,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

эканамічных умоў. Але ўсё ж, чалавечая свядомасць падавалася яму вызначальнай, ідучай заўсёды наперадзе сацыяльнага. Пры гэтым рашаючае значэннеў жыцці і дыныміцы грамадства ён надаваў не індывідуальнай, а калектыўнай свядомасці людзей. Гісторыя чалавецтва выступае ў яго адлюстраваннем паслядоўнай змены трох форм калектыўнай свядомасці на аснове “Закона трох стадый”: тэалагічнай, метафізічнай, пазітывісцкай, ці навуковай. Іх паслядоўная змена і вызначае прагрэс чалавецтва. Конт лічэў, што навука не можа даць адназначна адказ на пытанне аб прычыных і сутнасці грамадскага развіцця. Пазнанне навукай яго законаў абмежавана ўсталяваннем функцыянальнай залежнасць паміж з’явамі. Пазітывісцкая метадалогія стала пануючай у французскай гістарыяграфіі другой паловы XIX – пачатку XX ст.

Адным з буйнейшых французскіх гісторыкаў той эпохі з’яўляўся **Эрнест Лавіс** (1842-1822). Лавіс у пэўнай ступені быў афіцыйным гісторыкам III Рэспублікі. Сумесна з Рамбо Лавіс з’яўляўся рэдактарам калектыўнай працы “Усеагульная гісторыя” у 12 т., 7 з якіх прысвечаны наваму часу. Пад яго ж кіраўніцтвам выдавалася “Гісторыя Францыі ад яе вытокаў да рэвалюцыі”. Але на фарміраванне нацыянальнай свядомасціфранцузаў найбольшы ўплыў аказў школьны падручнік на гісторыі, аўтарам яго з’яўляўся Лавіс. Ён з 1884 па 1950 г. вытрымаў 50 выданняў.

У канцэпцыі гісторыі Лавіса праглядаюцца многія з найбольш тыповых характарыстык сучасный яму пазітывісцкай гістарыяграфіі: эвалюцыянізм, эмпірызм, падзейнасць. У сваіх выказваннях Лавіс ніколі не кіраваўся толькі чыста навуковымі памкненнямі, а імкнуўся выкарыстоўваць гісторыю для ўзвялічвання Францыі. У работах Лавіса шляхі развіцця чалавецтва рысаваліся як перакрыжоўваючыеся непазбежна ў Францыі. Сама Францыя падавалася як асобны арганізм са сваімі заканамернасцямі развіцця. Каралі і прэзідэнты, манархіі і рэспублікі, войны і рэвалюцыі трактаваліся як знешнія ў адносінах да Францыі сілы, якія альбо спрыялі, альбо перашкаджалі яе росту. Каралі, манархічныя рэжымы, забяспечваўшыя тэрытарыяльнае, маральнае і адміністратыўнае адзінства краіны, атрымлівалі адабрэнне Лавіса і прадстаўляліся як папярэднікі рэспубліканскіх парадкаў і каштоўнасцей. І, наадварот, тыя хто не спрыяў такому адзінству, ці падрываў яго, будзь то якабінцы ці вандэйцы, не залежна ад палітычных матываў, безумоўна асуджалі, бо яны ажыццяўлялі здраду ў адносінах да Францыі.

Рэспубліка прадстаўлялася як непазбежнае завяршэнне, лагічны вынік гісторыі Францыі. А сама гэтая гісторыя была для Лавіса перш за ўсё зводам правіл і прыкладаў для падручніка патрыятычнага выхавання. Змест і характар гістарычнага абгрунтавання нацыянальнага адзінства і патрыятызму зводзілася да апалагецікі сацыяльна-палітычных і духоўных каштоўнасцей французскага буржуазнага грамадства. Лавіс указваў, што добры ўрад – гэта той, які заснаваны на працы, эканоміі, які забяспечвае фінансавую стабільнасць, упраўляе як прадпрыемствам домам – Францыяй. Ідэальны правіцель для Лавіса – Кальбер. Пры ім квітнелі сельская гаспадарка, мануфактуры, гандаль. Сярод палітычных сіл Вялікай Французскай рэвалюцыі яго сімпатыі былі на баку жырандыстаў. Да Парыжскай Камуны 1871 г. Лавіс ставіўся крайне адмоўна. Ён пісаў: “З усіх

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

паўстанняў, аб якіх захавала памяць гісторыя, самае злачыннае было, канешне ж, тое, што адбылося ў сакавіку 1871 года на вачах у ворага-пераможцы”. Лавіс у адносінах да рэвалюцый у цэлым лічыў, што калі яны некалі і былі неабходны, то ў яго час такімі ўжо не з’яўляюцца.

У французскай гістарыяграфіі другой паловы XIX – пачатку XX ст. адно з цэнтральных месц па-ранейшаму займала даследванне праблем Вялікай Французскай рэвалюцыі. У 1856 г. **Алексіс Таквіль** выдаў сваю галоўную гістарычную працу ”Стары парадак і рэвалюцыя”: Ён адзначаў кідаючаеся ў вочы падабенства паміж рэвалюцыямі 1848 і 1789 г. Галоўнае падабенства, на яго думку, заключалася у тым, что ў абодвух выпадках дэмакратычны парыў рэвалюцыі змяніўся ўсталяваннем дэспатызму. Таквіль быў праціўнікам дэспатызму, але ён адмоўна ставіўся і да рэвалюцыйнага шляху пераўтварэння грамадства, асабліва да ўмяшання у палітычную барацьбу народных мас. Пры тым Таквіль рахзумеў неабходнасць ажыццяўлення рэвалюцыйных пераўтварэнняў. У іх ён бачыў працяг унутранай эвалюцыі Францыі, якая пачалася пры старым рэжыме. Таквіль не падвяргаў сумненню заканамернасць ліквідацыі старога парадку. Ён лічыў рэвалюцыю антыфеадальнай і антыдваранскай. Але ён адмаўляў гістарычную абумоўленасць разбурэння старога парадку менавіта рэвалюцыйным шляхам. За доўга да рэвалюцыі ў Францыі, на яго думку, ужо склаліся элементы сучаснага грамадства: сялянская уласнасць, драбленне зямлі, адміністратыўная цэнтралізацыя, роўнасць грамадзян у правах. Таму пераход да новага грамадства цалкам мог адбыцца і эвалюцыйным шляхам.

Пастаўленае Таквілем у яго працы пытанне аб суадносінах элементаў старога і новага ў перад і паслярэвалюцыйнай Францыі, аб разрыве і пераймальнасці ў гістарычным развіцці Францыі мела вялікае навуковае значэнне. Таквіль вылучаў рашэнне гэтага пытання, якое грунтавалася на прынцыпах эвалюцыйнай пераймальнасці. Рэвалюцыя, на яго думку, толькі скончыла адразу і вельмі балюча, без пераходаў, без перадасцярог усё тое, што скончылася б мала-памалу і само па сабе, на працягу большага прамежку часу. Такім чынам, рэвалюцыя толькі эпізод у працэсе гістарычнай бесперапыннасці.

Таквіля першым прыступіў да даследвання сацыяльнага ладу і грамадскіх устаноў Францыі канца старога парадку на аснове архіўных дакументаў. У прыватнасці, ён першы звярнуўся да лёсу сялянскай зямельнай уласнасці напярэдадні рэвалюцыі. І такія палаженні яго працы, як наяўнасць шарокага распаўсюджвання дробных сялянскіх землеўладанняў, як занчная шырыня ўладальніцкіх правоў сялянства знайшлі сваё пацверджанне ў пазнейшых даследваннях. Яго кніга была не расказам аб падзеях, а спробай гістарычна аналізу становішча і ўзаемадзеяння розных класаў, іх месца ў дзяржаўна-палітычнай сістэме старога парадку, эвалюцыі яго інстытутаў.

Падобна Танвілю, спробу сапаставіць рэвалюцыі 1789 і 1848 г. зрабіў **Эдгар Кінэ**. У цэнтры яго даследвання таксама пошук адказу на пытанне чаму абедзве рэвалюцыі завяршыліся стратай свабоды і ўсталяваннем аўтарытарных рэжымаў. Кінэ імкнецца вырашыць і яшчэ адну з асноўных праблем гітарыяграфіі рэвалюцыі: пытанне аб разрыве і пераймальнасці паміж старым і новым парадкам і месцы рэвалюцыі ў пераходзе ад першага да другога. У Француcкай рэвалюцыі

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Кінэ бачыў два асноўныя пачаткі, дзве задачы, выцякаўшыя з памкненнямі французаў. Першая з іх – знішчэнне прывілеяў, усталяванне грамадзянскай роўнасці. Такога роду рэвалюцыйнае абнаўленне завяршылася 4 жніўня 1789 г. прыняццем дэкрэтаў аб ліквідацыі прывілеяў. Яно ажыццявілася практычна аднадушна, амаль без супраціву. Прычына гэтага ў тым, лічыць Кіны, што гэтае абнаўленне было падрыхтавана эвалюцыяй у недрах старога парадку. Рэвалюцыя толькі паскорыла гэты працэс. Яна забяспечыла ў гэтай сферы пераймальнасць з развіццём, што адбывалася пры старым парадку, замацавала яго.

Намнога больш складаным стала, лічыць Кінэ, рашэнне другой задачы – дасягненне свабоды. Мінавіта ў сувязі са спробай дасягнуць гэтай мэты і было праліта шмат крыві. Свабода была нечым зусім новым для Францыі. Стары парадак выхаваў французаў у духу падначалення. Рэвалюцыя 1789 г. не змагла даць французам новую духоўную аснову для заваявання свабоды, якой у Нідэрландскай ці Англійскай рэвалюцыі стала рэфармаваная рэлігія. Жырандысты паспрабавалі замацаваць свабодныя інстытуты на дзяржаўным узроўні, але пацярпелі няўдачу. Якабінцы, на думку Кінэ, паспрабавалі прывесці народ да свабоды праз прымус. Яны хацелі прымусіць французаў быць свабоднымі, і сваімі метадамі адпавядалі інстытутам старога парадку. Яны адрадзілі ранейшы дэспатычны дух і ў выніку адраджэнне Францыі было ажыццяўлена не свабодай, а новай тыраніяй. Францыя выйшла з рэвалюцыі ажыццявіўшы прынцып грамадзянскай роўнасці, але страціўшы свабоду.

Буйнейшым прадстаўніком кансерватыўнага напрамку гістарыяграфіі Вялікай Французскай рэвалюцыі быў **Іпаліт Тэн** (1828 – 1893). У яго працах ідэалістычнае разуменне гісторыі пераплялося з матэрыялістычнымі тэндэнцыямі. Гісторыю ён разумеў як навуку, падобную навукам аб жывой прыродзе. Рашаючае значэнне ў жыцці грамадства ён надаваў псіхалогіі жывучых у ім людзей. Пры гэтым Тэн вызначаў гісторыю як “псіхалагічную анатомію”. Фарміраванне грамадскай псіхалогіі ён тлумачыў савакупнасцю трох фактараў: “расы” (натуральныя нацыянальныя асаблівасці), “асяродзя”(кліматычныя і геаграфічныя ўмовы, а таксама сацыяльныя і палітычныя абставіны), “канкрэтнага гістарычнага моманту” (узаемадзеянне расы, асяродзя з гістарычнай традыцыяй).

Важнейшай працай Тэна з’яўляецца 5-томнае сачыненне “Паходжанне сучаснай Францыі”. У цэнтры даследавання ляжыць гісторыя Вялікай Французскай рэвалюцыі. Глыбінным вытокам рэвалюцыі Тэн лічыў асаблівасці французскага духу, склаўшагася пад уплывам рацыяналізму XVII ст. і Асветніцтва. У французаў сфарміраваўся абстрактны прамалінейны тып свядомасці, пад уздзеяннем якога яны імкнуцца падначаліць умазрыцельнай жорсткай схеме жывую, напоўненую шматграннасцю рэчаіснасцю. Асабліва варожа Тэн ставіўся да сацыяльнай схемы Русо. Ён лічыў, што ў ідэях Русо былі заложаны і анархія (так як форма кіравання ў любы момант павінна падначальвацца агульнай воле), і дэспатызм (таму што правы індывіда перадаваліся на карысць калектыва). Між тым менавіта ў духу ідэй Русо, па Тэну, развівалася Французская рэвалюцыя. У рэвалюцыі Тэн не бачыў ні аднаго светлага моманту. Згодна яго канцэпцыі, ужо пачынаючы з Устаноўчага сходу ўсё было прадвырашана ажыццяўленнем схемы Русо аб “грамадскім дагаворы”.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Рэвалюцыю ў цэлым Тэн лічыў гібельным узрывам злачынных страсцей. Ён бачыў у рэвалюцыі дзве важнейшыя дзеючыя сілы. Першая з іх – народ. Ён змучаны жабрацтвам, грубы і непісьменны, атраўлены разбуральнай філасофіяй XVIII ст. Яна апракінула стрымліваючыя традыцыі і нізменныя істынкты народа вырваліся на паверхню. “Некалькі тысяч гаваруноў спусцілі з ланцугоў некалькі мільёнаў дзікароў”, - пісаў Тэн, вызначаючы галоўную прычыну рэвалюцыі. Другая сіла рэвалюцыі па Тэну – якабінцы. Да іх ён адносіў і жыронду. Якабінцы ў схеме Тэна не сацыяльна-палітычная плынь, а асаблівы псіхалагічны тып палітычных дзеячаў. Якабінец падаецца як азлоблены дэмагог і дагматык, прапітаны абстрактнымі ідэямі філасофіі. Ён увасабляе сабой дух рэвалюцыі, яе псіхалогію. З анархіі якую парадзіла рэвалюцыя, на думку Тэна, натуральна вырастаў дэспатызм. Ён таксама ўзяў на ўзбраенне рацыянальную філасофію і на яе аснове пабудаваў у напалеонаўскі час асновы сучаснай для Тэна Францыі. Кніга Тэна ўтрымлівала цікавыя назіранні адносна масавай псіхалогіі эпохі, асабліва перадрэвалюцыйнага часу. Жадаючы паказаць разгул анархіі ў гады рэвалюцыі, Тэн удзяляў вялікую ўвагу народным рухам, паспрабаваўшым даць па дакументах Нацыянальнага архіву агуль агляд сялянскім паўстанням.

Найбольш відным гісторыкам ліберальнага накірунку ў гістарыяграфіі Вялікай Французскай рэвалюцыі ў разглядаемы час з’яўляўся **Альфонс Олар** (1849 - 1928). У кнізе «Тэн як гісторык рэвалюцыі» Олар падверг моцнай крытыце асноўныя ідэі і даследчыцкія прыёмы Тэна, указаў на іх тэндэнцыйнасць і прадузятасць. Але кансерватыўнаму суб’ектывізму Тэна Олар супрацьпаставіў свой ліберальны суб’ектывізм. Олар папракаў Тэна ў прыдузятым падборы дакументаў, у парушэнне правіл іх навуковай крытыкі і інтэрпрытацыі. Але Олару па-сутнасці быў уласціў той жа характар гістарычнага мыслення. Ён таксама звяртаўся да мінулага, каб знайсці аргументы ў апраўданне існуючага парадку у сацыяльна-палітычным жыцці і маральных каштоўнасцей грамадства Трэцяй рэспублікі.

Як даследчык Вялікай Французскай рэвалюцыі А. Олар займаўся гістрыяй палітычных ідэй і ўстаноў часоў рэвалюцыі. Гэтай праблеме прысвечаны яго галоўная праца «Палітычная гісторыя Французскай рэвалюцыі» (1901). Рэвалюцыю ён разглядаў як увасабленне ў жыццё прынцыпаў Дэкларацый правоў чалавека і грамадзяніна 1789 і 1793 г. Рэвалюцыя, па Олару, заключалася ў гэтых Дэкларацыях і спробах правесці ў жыццё іх прынцыпы. Контррэвалюцыя ж заключалася ў спробах прымусіць французаў адмовіцца ад правядзення ў жыццё прынцыпаў Дэкларацый. Для Олара было характэрна ўзвялічванне ролі Дантона ў рэвалюцыі. Дантона ён лічыў прадаўжальнікам памяркоўнай палітыкі Мірабо. Галоўным станоўчым момантам працы Олара было тое, што яна ўтрымлівала велізарны матэрыял адносна палітычных аспектаў Французскай рэвалюцы. Па-за межамі зроку Олара засталіся сацыяльныя і эканамічныя праблемы.

У канцы XIX - пачатку XX ст. працягваў развівацца і рабесп’ерысцкі накірунак у французскай гістарыяграфіі. Яго найбольш яркім прадстаўнікам з’яўляўся **Альбер Мацьез** (1874-1932). Ён заснаваў таварыства па вывучэнню рабесп’ерызму. З 1908 г. пад рэдакц. Мацьеза стаў выходзіць часопіс «Аналы Французскай рэвалюцыі». У працах Мацьеза высока ацэньвалася дзейнасць Рабесп’ера і якабінцаў як найбольш перадавой палітычнай групоўкі часоў

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

рэвалюцыі. Адначасова Мацьез і блізкія да яго гісторыкі займаліся развянчаннем асобы Дантона, якога ліберальныя гісторыкі лічылі пачынальнікам палітычных установ Трэцяй рэспублікі. Да першай сусветнай вайны Матьез займаўся ў асноўным палітычнымі праблемамі гісторыі Французскай рэвалюцыі.

Пазітывісцкая гістарыяграфія аказала станоўчы ўплыў на развіццё гістарычнай навукі ў Францыі ў 70 – 90-ыя гады. Моцным бокам пазітывісцкай гістарыяграфіі з'яўлялася прызнанне магчымасці рэальнага аб'ектыўнага пазнання гісторыі. Гісторыя з апісання стала ператварацца ў даследванне. Гісторык цяпер з дапамогай меўшыхся ў яго сродкаў шукаў адказ на загадзя сфармуляванае пытанне. Але інтарэсы французскіх історыкаў па-ранейшаму канцэтраваліся на палітычна-дыпламатычных праблемах, і яны мала ўвагі ўдзялялі сацыяльна-эканамічным праблемам.

З пачатку ХХ ст. можна гаварыць аб крызісу метадалогіі пазітывісцкай гістарыяграфіі ў Францыі. Пазітывісцкая гістарыяграфія грунтавалася на перакананні, што прызначэнне гісторыі, як і любой навукі, вывучэнне фактаў, якія ўстанаўліваюцца ў ходзе скрупулёзнага вывучэння крыніц. У кнізе "Уводзены ў вывучэнне гісторыі" гісторыкі-пазітывісты Ланглуа і Сеньабос выдзяляюць 4 этапы ў рабоце гісторыка. Першы – эўрыстычны, звязаны з пошукам і зборам дакументаў. Другі – крытыка дакументаў (аднаўленне, аналізпаходжання, крытыка тлумачэння). Пасля таго, як вызначэнне іх сапраўднасці. Трэці этап – вылучэнне з дакументаў прыватных фактаў. Чацвёрты этап – працэс гістарычнага сінтэтазу, абагульнення, на якім установленыя факты групуюцца, паміж імі ўстанаўліваюцца сувязі і пачынаецца апавяданне.

Крызіс пазітывісцкай гістарыяграфіі праявіўся ў адносінах гісторыка да тэксту, да дакументу. Пазітывісты лічылі, што тэкст дакумента гаворыць сам за сябе і не патрэбна ніякая гістарычная пабудова. Яны ўсё больш зыходзілі на тое, каб проста прапаноўваць чытачам мантаж тэкстаў. Так адбылося звядзенне гістарычнага даследвання толькі да філалагічнай крытыкі тэксту. Кожны факт пачаў разглядацца ізалявана, як самастойны аб'ект. Прычым падкрэслівалася, што кажны факт існуе аб'ектыўна і ён незалежны ад пазнаючага яго гісторыка. Ацэначны момант у даследаванні поўнасцю выключаўся. У выніку пазітывісты ўсё больш адыходзілі ад праблемнай гісторыі да апавядальнай. Такім чынам, на шляху далейшага развіцця пазітывісцкай гістарыяграфіі стаяла перш за ўсё забарона на ацэнку факта і абасоблены разгляд кожнага факта, а адпаведна кожнага з бакоў жыцця грамадства.

**3.** Пануючае становішча у германскай гістарыяграфіі другой паловы XIX ст. займала "малагерманская" школа. Яна атрымала такую назву за актыўны ўдзел яе гісторыкаў у палітычнай барацьбе за аб'яднанне Германіі вакол Прусіі. Пасля 1871 г. малагерманская школа стала афіцыёзнай гістарычнай школай імперыі. Асновай гістарычных поглядаў малагерманскіх гісторыкаў была іх этатысцкая і антырэвалюцыйная ідэалогія. Іх выступленні за аб'яднанне Германіі, за барацьбу з феадалізмам, з сепаратысцкімі рухамі і юнкерствам адыгралі ў пачатку іх дзейнасці прагрэсіўную ролю ў аб'яднанні Германіі. Адным з буйнейшых прадстаўнікоў малагерманскай школы з'яўляўся **Іаган Густаў Дройзер** (1808 – 1884). Дройзер займаўся пераважна гісторыяй антычнасці. У 1836 г. ён надрукаваў "Гісторыю Аляксандра Вялікага", а ў 1853 г. – "Гісторыю эленізма". У гэтых ранніх працах

Дройзер ацаніў праведзенае ваенным шляхам аб'яднанне дробных грэчаскіх дзяржаў вакол Македоніі як узор нацыянальнага аб'яднання і для Германіі.

Затым Дройзер звярнуўся да вывучэння гісторыі новага часу і выдаў сваю галоўную работу "Гісторыя прускай палітыкі", даведзеную храналагічна да Сямігадовай вайны. Ён імкнецца даказаць станоўчы ўплыў прускай палітыкі на ўсю Германію.

Ідэя кампрамісу ліберальных колаў з прускай манархіяй найбольш яскрава ўвасобілася ў працах яшчэ аднаго прадстаўніка малагерманскай школы **Генрыха фон Зібеля** (1817-1895). У сваёй галоўнай працы "Гісторыя рэвалюцыйнага часу з 1789 па 1800 г." Зібель імкнецца выпрацаваць сваю канцэпцыю Вялікай Французскай рэвалюцыі і супрацьпаставіць яе як кансерватыўным, так і дэмакратычным канцэпцыям. Галоўны пазітыўны бок рэвалюцыі ён бачыў у тым, што яна ўсталявала панаванне капіталістычных адносін. А яе асноўную негатыўную рысу – у тым, што яна, як і ўсялякая рэвалюцыя, з самага пачатку мела тэндэнцыю пагражаць парадку і ўласнасці. Дадзеная пагроза ўзнікае ад таго, што на палітычную арэну выходзяць шырокія масы. Зібель прызнаваў прагрэсіўнае значэнне рэвалюцый ў сэнсе знішчэння феадальных парадкаў, але падкрэсліваў, што для гісторыі больш пажаданы шлях рэформаў зверху. Ён апраўдваў рэвалюцыю толькі на першым яе этапе, да звяржэння фельянаў і абвяшчэння рэспублікі. Далейшы ход падзей бачыўся Зібелю як розгул анархіі і хаоса.

Новым у навуковых адносінах бокам работы Зібеля было імкненне разгледзець падзеі ў Францыі ў шырокім кантэксце міжнародных адносін. Ён імкнуўся паказаць значымасць рэвалюцыі для іншых краін Еўропы. Пэўную ўвагу ўдзяляў Зібель і сацыяльна-эканамічнаму фактару. Ён паказаў значэнне аграрнай і фінансавай рэформаў для ліквідацыі феадальных адносін.

Зібель па-новаму падыходзіў да пытання аб пачатку рэвалюцыйных войнаў. Ён паказаў, што жарандысты імкнуліся да вайны, каб з яе дапамогай вырашыць унутраныя праблемы. Пры гэтым Зібель здымае адказнасць за развязванне вайны з еўрапейскіх манархій. Вывучыўшы шырокае кола архіўных дакументаў, Зібель робіць выснову аб нетрываласці першай антыфранцузскай кааліцыі. Галоўнай крыніцай супярэчнасцей унутры яе Зібель лічыў польскую праблему.

Такім чынам Зібель адвяргае канцэпцыю, згодна з якой рэвалюцыя з'яўлялася класічным шляхам усталявання свабоды і роўнасці. Зібель рашуча адмаўляецца прызнаць унутраныя заканамернасці рэвалюцыі і яе непазбежнасць і супрацьпастаўляе ёй рэформы зверху як ідэал прагрэсу.

У час франка-прускай вайны гісторыкі малагерманскай школы ў бясконцых публіцыстычных артыкулах даказвалі, што для Германіі вайна з'яўляецца справядлівай не толькі на першым этапе, але і на завяршальнай фазе, вынікам якой стала анексія Эльзаса і Латарынгіі. Пасля 1871 г., калі галоўная палітычная задача малагерманскіх гісторыкаў была выканана, гучаўшыя ў іх творах нацыянальныя ідэі страцілі сваю прагрэсіўнасць. Цяпер іх нацыяналізм набывае ўсё больш яскрава рэакцыйныя рысы. Асноўнай ідэяй іх твораў становіцца ўсхваленне сацыяльна-палітычнай сістэмы Германскай імперыі. Яны пачалі ўдзяляць увагу сацыяльным праблемам, віталі сацыяльныя рэформы Бісмарка ў 1880-я гадоў. У той жа час яны адобрылі і выключны закон Бісмарка.

Адно з цэнтральных месц у малагерманскай гістарыяграфіі пасля аб'яднання краіны займае ўсхваленне прускага мілітарызму. У такім духу быў вытрыманы буйнейшы твор **Генрыха фон Трэйчке** "Нямецкая гісторыя дзевятнаццатага стагоддзя", даведзеная аўтарам да 1848 г. У ёй на ўсе лады ён абыгрывае легенду аб гістарычнай місіі Прусіі. Менавіта Прусія, на яго думку, неўклонна і паслядоўна ўвасабляла нямецкія нацыянальныя інтарэсы. У гэтым сэнсе яна была адзінай германскай дзяржавай. Дынастыя Гогенцолернаў паўстае ў працы Трэйчке як галерэя вялікіх палітычных дзеячаў, сапраўдных герояў нямецкай гісторыі.

У такім жа накірунку вытрымана і праца Зібеля "Заснаванне Германскай імперыі". Яна была напісана па прамому пажаданню Бісмарка. Зібель паказвае заснаванне імперыі як выключна асабістую заслугу Бісмарка. На фоне яго нават асоба імператара Вільгельма І прадставала як другарадная. Тэзіс аб тым, што толькі вялікія людзі з'яўляюцца стваральнікамі гісторыі, знаходзіць у працы Зібеля закончанае ўвасабленне. Згодна Зібелю аб'яднанне Германіі было магчыма толькі шляхам бісмаркаўскай рэвалюцыі зверху. Ніякай дэмакратычнай альтэрнацівы гэтаму шляху Зібель не прызнаваў. Наяўнасць ліберальнага руху ў Германіі ён прызнае толькі з 1867 г., калі той адмовіўся ад апазіцыі Бісмарку і ператварыўся ў яго саюзніка.

Такой жа прадузятай была і "Гісторыя прускай палітыкі" Дройзера. Усе 14 тамоў яе прысвечаны галоўным чынам таму, каб даказаць гістарычнае права Прусіі на гегемонію ў Германіі.

Большасць малагерманцаў у ідэалістычнай форме прызнавалі заканамернасць гістарычнага развіцця і яго прагрэсіўны характар. Увасабленнем прагрэсу яны лічылі гісторыю Прусіі: XVIII-XIX ст. У адрозненне ад Ранке, які практычна поўнасцю выключаў эканоміку са сферы вывучэння, малагерманцы ва ўмовах хуткага развіцця капіталізму ў Германіі не маглі не прызнаць, што гісторыя эканамічных працэсаў, як пісаў Зібель, стала такой жа важнай, як гісторыя розных дыпламатычных перамоў. Але развіццё эканомікі яны тлумачылі перш за ўсё маральнымі, этычнымі і псіхалагічнымі матывамі. Яны, у адрозненне ад марксістаў, не прызнавалі за эканомікай ролі аднаго з вядучых фактараў гістарычнага працэсу. Яны ў сваіх кнігах абмяжоўваліся толькі невялікімі і фармальнымі экскурсамі ў сферу матэрыяльнай вытворчасці. Малагерманцы адвяргалі прынцып беспартыйнасці гісторыі. Трэйчке пісаў, што гісторык можа называцца беспартыйным толькі ў адным выпадку – калі ён ляжыць у магіле.

З пераходам малагерманцаў на кансерватыўныя пазіцыі ліберальны накірунак у нямецкай гістарыяграфіі не знік. На ліберальных пазіцыях заставаліся тыя гісторыкі, якія асуджалі прусачаства і схіляліся да адлюстравання гісторыі як пастаяннага прагрэсіўнага развіцця культуры чалавецтва. Яны лічылі, што развіццё чалавецтва ідзе непазбежна ў прагрэсіўным накірунку. Прагрэс чалавецтва можа быць прыпынены, але спыніць і павярнуць яго немагчыма.

Буйнейшым прадстаўніком ліберальнай гістарыяграфіі ў канцы XIX – пачатку XX ст. з'яўляўся **Макс Леман** (1845-1929). Першая буйная гістарычная праца Лемана ўяўляла сабою біяграфію кіраўніка ваеннай рэформы ў Прусіі ў пачатку XIX ст. Герхарда Шарнхорста. Аўтар упершыню паказаў, што ён быў не проста прускім ваенным, а нямецкім патрыётам. Леман прыйшоў да высновы, што

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Шарнхорст ажыццявіў ваенную рэформу не па добрай волі прускага караля, а зламаўшы яго ўпартае супраціўленне адносна новаўвядзенняў у арміі. Праца Лемана развенчвала легенду малагерманцаў аб нацыянальнай місіі Прусіі і яе правіцелей у Германіі.

Яшчэ большы рэзананс выклікала праца Лемана "Фрыдрых Вялікі і паходжанне Сямігадовай вайны". Повадам для яе напісання паслужыла азнаямленне Лемана з палітычным завяшчаннем Фрыдрыха, якое доўгі час было недаступна для гісторыкаў. Леман быў узрушаны анексіянісцкімі планамі Фрыдрыха і яго палітычным вераломствам. Леман паставіў перад сабою задачу паказаць сапраўдны твар Фрыдрыха і разбурыць створаныя аб ім шматлікія апалагетычныя легенды.

Тэарэтыка-метадалагічныя погляды Лемана насілі ідэалістычны характар. Для яго гісторыя была дзеяннямі вялікіх асоб. І тое, што яго працы ўяўлялі сабой галоўным чынам біяграфіі буйных гістарычных дзеячаў, было зусім невыпадкова. У гэтым жанры напісана і яшчэ адна значная праца Лемана – біяграфія буйнога прускага рэфарматара пачатку XIX ст. Карла Штэйна. Леман адстойвае той пункт гледжання, што Штэйн праводзіў свае рэформы пад уплывам Французскай рэвалюцыі. Пры гэтым, як указвалі апаненты Лемана, ён нават некалькі перабольшваў гэты ўплыў. Ацэньваючы рэформы Штэйна і Французскую рэвалюцыю, ён акцэнтаваў увагу ў першую чаргу на іх буржуазным характары. У сваіх працах Леман свядома акцэнтаваў увагу на дзейнасці рэфарматараў. Шырокія масы ўпамінаюцца Леманам толькі мелькам.

У пачатку XX ст. на метадалогію нямецкіх гісторыкаў, у тым ліку і лібералаў, стала аказваць неаранкеанства. У тэарэтыка-метадалагічных адносінах неаранкеанцаў аб'ядноўваў ідэал аб'ектыўнасці гістарычных ведаў. Крытэрыем аб'ектыўнасці для іх выступала беспрыстраснасць гісторыка ў разглядзе мінулага. Гэта магло быць дасягнута толькі эмпірычным шляхам на аснове даследавання першакрыніц. Але неаранкеанцы разумелі яўную утапічнасць гэтага патрабавання, і таму разглядалі аб'ектыўнасць як пажаданы, але практычна ніколі поўнасцю неажыццявімы ідэал. Філасофскую аснову неаранкеанства складаў суб'ектыўны ідэалізм, неагегеліанства. Неаранкеанцы абвінавачвалі пазітывістаў у перабольшванні ролі сацыяльна-эканамічнага фактару ў гісторыі. Яны лічылі, што гісторыя – гэта непасрэднае праяўленне жыцця, якое можна пазнаць толькі інтуітыўна, метадам саперажывання. Яны падкрэслівалі, што навукі аб прыродзе і гісторыя маюць розныя метады пазнання.

Сярод ліберальных гісторыкаў пачатку XX ст. адным з буйнейшых з'яўляўся **Фрыдрых Мейнеке** (1862-1954). Ён спрабаваў прадставіць нямецкую гісторыю новага часу як адзіны працэс развіцця пэўнай сістэмы ідэй. Выстройваючы ў агульны рад прускія рэформы пачатку XIX ст., рэвалюцыю 1848 г. і аб'яднанне Германіі пад эгідай Прусіі, Мейнеке інтэрпрэтаваў ланцужок гэтых падзей як рэальнае ажыццяўленне прускай кансерватыўна-рамантычнай ідэі нацыянальнай дзяржавы. Такую канцэпцыю Мейнеке распрацаваў у кнігах "Ад Штэйна да Бісмарка", "Радовіц і германская рэвалюцыя", і яго самым буйным творы пачатку стагоддзя "Касмапалітызм і нацыянальная дзяржава".

РЭПАЗІТОРЫЙ ГГУ ІМЕНІ Ф.СКАРЫНЫ

Мейнеке зыходзіў з таго, што аб’яднанне Германіі магло быць ажыццёўлена толькі сілай зброі Прусіі. Таму галоўнай заслугай Бісмарка ён лічыў разрыў з папярэднімі ўяўленнямі прускіх каралёў аб асуджэння ўнутрыгерманскай вайны. Тым самым праблема аб’яднання краіны пераўтваралася ў гардзееў узел, разрубіць які рашыўся толькі Бісмарк. Палітыка Бісмарка па аб’яднанню Германіі, на думку Мейнеке, абапіралася на спадчыну рамантызму, гістарычнай школы права, і Ранке, з аднаго боку, і як працяг нямецкага Асветніцтва і класічнай нямецкай філасофіі – з другога. Гегель, Ранке і Бісмарк – гэта, на думку Мейнеке, тры вялікія вызваліцеля немецкай нацыянальна-дзяржаўнай ідэі з духоўнага палону касмапалітызму.

На ліберальных пазіцыях стаяў і берлінскі прафесар **Ота Хінтцэ** (1861-1940), які займаўся даследваннем сацыяльна-эканамічных праблем. Яго навуковыя даследванні канцэнтраваліся на палітыцы мерканцелізму ў XVII – XVIII ст., ролі абсалютысцкага рэжыму ў эканамічным развіцці. Хінтцэ разглядаў эканамічную знешнюю і ўнутраную палітыку Фрыдрыха II як узорную мадэль і для Германскай імперыі пачатку XX ст. Такое разуменне грунтавалася на перакананні Хінтцэ, што гістарычнае пазнанне можа стаць сродкам арыентацыі для сучасных палітычных акцый і рашэнняў. Лічачы дзяржаву рухаючай сілай унутранай мадэрнізацыі грамадскіх сістэм, Хінтцэ характэрызаваў прускую манархію і бюракратыю як галоўных носьбітаў сацыяльна-эканамічных і палітычных прагрэсіўных ідэй.

Даследванні Хінтцэ ўтрымлівалі багаты фактычны матэрыял і характэрызаваліся сістэмным падходам да гісторыі. Хінтцэ адмаўляў класава абумоўленую прыроду манархіі Фрыдрыха II. Ён абсалютызаваў яе надкласавую самастойнасць. Недаацэньваў Хінтцэ і той факт, што дробязная апека прамысловасці і гандлю з боку прускай дзяржавы з яе меркантылісцкай палітыкай скоўвала гаспадарчую ініцыятыву буржуазіі і тармазіла працэс ліберальна-дэмакратычнага развіцця ў палітычнай сферы. Спецыфічнасць развіцця асобных дзяржаў Хінтцэ быў схільны тлумачыць геаграфічнымі і знешенепалітычнымі фактарамі, і падкрэсліваў, что “ступень свободы, якая можв існаваць у якой-небудзь дзяржаве да разумных межаў, зваротна прапарцыянальна таму ваенна-палітычнаму ціску, які аказваецца на яго межы звонку. Такім чынам,вывучаючы сацыяльна-эканамічную гісторыю, Хінтцэ не лічыў сацыяльна-эканамічныя адносіны вызначальнымі, а ставіў іх у залежнасць ад знешнепалітычнага фактару.

Метадалогія неаранкеанства ў пачатку XX ст. ляжала ў аснове гістарычных даследаванняў і нямецкіх гісторыкаў кансерватыўнага накірунку. Умерана-кансерватыўнае крыло прадстаўлялі **Макс Ленц** (1850-1932), **Фелікс Рахваль** (1867-1925). У цэнтры канцэпцыі кансерватыўных неаранкеанцаў знаходзілася дзяржава як індывідуальная, непаўторная з’ява гісторыі. Яны лічылі, што дзяржава павінна аддаваць прыярытэт знешняй палітыцы над унутранай, а ўвесь ход гісторыі вызначалі як безупынную барацьбу паміж вялікімі дзяржавамі за сусветнае панаванне. З такога падыходу выцякалі і адносіны кансерватараў да сацыяльных праблем у Германіі. Яны імкнуліся пераканаць чытачоў, што з развіццём капіталізму і пачаткам сусветнай экспансіі нацыянальная ідэя выцясняе сацыяльную праблему. Тым самым, рэвалюцыі для Германіі канчаткова адыйшлі ў мінулае.

РЭПАЗІТОРЫЙ ГГУ ІМЕНІ Ф. СКАРЫНЫ

Рухаючай сілай гісторыі кансерватары лічылі ідэі, без якіх, як падкрэсліваў Ленц, не можа быць нічога пастаяннага, паколькі толькі ідэі ўказваюць шлях гістарычнага развіцця, фарміруюць яго законы і ствараюць грамадскае жыццё. Галоўным стрыжнем нямецкай гісторыі для Ленца была пратэстэстанская рэлігія. Яна вызначала змест і накірунак развіцця Германіі ад Лютэра і Рэфармацыі праз дзейнасць прускіх курфюрстаў і каралёў, праз прускія рэформы пачатку XIX ст. да Бісмарка і стварэння Германскай імперыі. Усе гэтыя працэсы адбываліся на духоўным фундаменце лютэранства.

Праз працы кансерватыўных неаранкеанцаў чырвонай ніццю праходзіць ідэя аб неабходнасці сінтэза сілы і духа. Першую ўвасабляе дзяржава, другую – пратэстанцкая рэлігія. Неаранкеанцы ставіла сваёй мэтай даказаць, што пруская дзяржава і нямецкая культура непарыўна звязаны паміж сабой у адно арганічнае цэлае. Магутная дзяржава на чале з моцнай асобай уяўлялася кансерватарам надзейнай перашкодай на шляху небяспечных наваўвядзенняў.

Адным з найбольш характэрных для кансерватыўных неаранкеанцаў твораў з'яўлялася кніга Ленца і Рахваля "Германія, кароль Фрыдрых Вільгельм IV і сакавіцкая рэвалюцыя ў Берліне". Яны аддавалі даніну старой кансерватыўнай традыцыі ў гістарыяграфіі, згодна якой сакавіцкая рэвалюцыя стала вынікам падрыўной дзейнасці французскіх і польскіх агентаў. Праўда, кансеватары пачатку XX ст., у адрозненне ад сваіх папярэднікаў, не абсалютызавалі гэты фактар. Яны ацэньвалі рэвалюцыю і як праяўленне імкнення буржуазіі да палітычнай улады. Кансерватары нават прызнавалі, што найбольш паслядоўнымі барацьбітамі за нацыянальнае аб'яднанне выступалі дробнабуржуазныя рэспубліканцы і радыкальна-дэмакратычныя колы.

Агульная канцэпцыя рэвалюцыі 1848 г. зводзілася ў кансерватараў да таго, што сакавіцкая рэвалюцыя ў Берліне было крайне негатыўнай падзеей у гісторыі Прусіі і дынастыі Гогенцолернаў. Кансерватары зыходзілі з таго, што германская гісторыя, у адрозненні ад французскай развіваецца не рэвалюцыйным, а эвалюцыйным шляхам. Менавіта эвалюцыя з'яўляецца сапраўдным увасабленнем прагрэсу. Каб прывесці азначаную канцэпцыю ў адпаведнасць з рэальным ходам гісторыі, кансерватыўныя гісторыкі тлумач. узнікнененне рэвавалюцыі непаслядоўнасцю палітыкі Прусіі, Фрыдрыха Вільгельма IV, растаноўкай сіл на еўрапейскай арэне. Тым самым яны яшчэ раз імкнуліся пацвердзіць тэзіс аб прымаце знешняй палітыкі. Кансерватары бачылі ў палітыцы караля імкненне згрунтаваць усе сілы Прусіі дзеля ажыццяўлення нацыянальнага аб'яднання Германіі. Таму ён і загадаў вывесці ўжо блізкія да перамогі войскі з Берліна, каб аднавіць грамадзянскі мір. Але ажыццявіць аб'яднанне Германіі ў той час Прусія не змагла з-за непераадольнага супрацьдзеяння Аўстрыі, Расіі і дробных дзяржаў Паўднёва-Заходняй Германіі. Гістарычную ролю рэвалюцыі кансерватары бачылі ў тым, што яна прадэманстравала немагчымасць аб'яднання Германіі шляхам дэмакратычнай рэвалюцыі знізу і пакінула адзіную рэальную магчымасць – аб'яднанне Германіі зверху.

Найбольш рэакцыйнае крыло нямецкай гістарыяграфіі стаяла на пазіцыях пангерманізма. Гісторыкі-пангерманісты ідэалізавалі германскую гісторыю,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

усхвалялі Гогенцолернаў і прусацтва. Яны выступалі супраць пазіцівісцкага і сацыялагічнага падыходу да гісторыі. У цэнтры іх увагі была дзяржава сілы.

Самым аўтарытарным пангерманскім гісторыкам з'яўляўся **Дзітрых Шэфер** (1845-1929). Яго кнігі "Сусветная гісторыя новага часу" і "Нямецкая гісторыя" з'яўляліся класічнымі творамі пангерманскай гістарыяграфіі. Шэфер быў буйнейшым спецыялістам па гісторыі Ганзы і Скандынавіі. Ён выкарыстоўваў свае багатыя веды па марской гісторыі, каб адстойваць праграму будаўніцтва германскага ваенна-марскога флоту. Шэфер падкрэсліваў, што растучы нямецкі гандаль патрабуе абароны буйнога ваенна-марскога флоту. Менавіта яго адсутнасць прывяла ў свой час да рэзкага аслаблення Ганзы.

У сваіх працах Шефер рашуча выступаў супраць вылучэння на першы план сацыяльна-эканамічных праблем. Ён лічыў, што гісторыя – гэта палітычная навука, задача якой заключаецца ў тым, каб дапамагчы Германскай імперыі ўсталявацца як мацнейшай дзяржаве свету. У цэнтры германскай гісторыі для Шэфера знаходзіцца Прусія, у цэнтры сусветнай гісторыі – Германія. Ён усяляк прыўзносіць ролю Прусіі ў аб'яднанні Германіі. Рэвалюцыя 1848 г. для Шэфера падаецца крайне негатыўным момантам у германскай гісторыі. Яе негатыўны ўплыў працягвае адчувацца яшчэ ў пачатку XX ст.

Многа ўвагі Шэфер надаваў вывучэнню геапалітычнага становішча Германіі. Ён лічыў, што Германія акружана ворагамі і дзеля самаабароны яна павінна ўзмоцнена ўзбройвацца. Ён лічыў, што і рабочых патрэбна зацікавіць перспектывай стварэння магутнай Германскай імперыі.

**4.** Сярэдзіна і другая палова XIX ст. азнаменавалася станаўланнем марксісцкай гістарыяграфіі. **Карл Маркс** і **Фрыдрых Энгельс** вылучылі вытворчыя адносіны людзей як асноўныя і першасныя. Яны ў якасці галоўнай прычыны і рашаючай рухаючай сілы гістарычных падзей бачылі эанамічнае развіццё грамадства. Менавіта змены у эканамічным жыцці, звязаны са зменамі спосабу вытворчасці і абмену, вядуць да змен у сацыяльным і палітычным жыцці, у свядомасці людзей. Дзякуючы вылучэнню на першы план у гістарычным развіцці эканамічных фактараў гісторыя чалавецтва магла разглядацца як рух па ступеньках ад ніжэйшых форм вытворчасці да вышэйшых. Кожная ступенька ўяўляла сабой пэўную грамадска-эканмічную фармацыю: першабытна-абшчынную, рабаўладальніцкую, феадальную, капіталістычную, камуністычную. Пераход ад ніжэйшай да вышэйшай фармацыі непазбежны ў сілу развіцця у недрах кожнай антаганістычнай фармацыі невырашальных супярэчнасцей, якія вядуць да яе гібелі, і адначасова ствараюць перадумовы для ўзнікнення новага, больш прагрэсіўнага грамадскага ладу. Ён перамагае старую фармацыю канчаткова за кошт больш высокай прадукцыйнасці працы. Пры гэтым некаторыя народы могуць мінаваць асобныя фармацыі.

Адштурхоўваючная ад фармацыйнага падыходу да гісторыі, марксісты распрацавалі і новую канцэпцыю грамадскага прагрэссу. Яны лічылі, што развіццё грамадства адбываецца скачкамі, зігзагападобна. Магчымы часовы і нават значны рэгрэс, але ў стратэгічным плане прагрэсіўнае развіццё чалавецтва непазбежна. Прагрэс забяспечваецца, згдна Марксу, у выніку класавай барацьбы і рэвалюцый. Класавая барацьба разглядаецца марксісцкай гістарыяграфіяй як цэнтральны

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

элемент грамадскага жыцця. Усялякая барацьба ў гісторыі – гэта выражэнне класавых інтарэсаў і супярэчнасцей. Яны пранізваюць усе сферы грамадскага жыцця: эканоміку, палітыку, ідэалогію, культуру. Вынікам класавай барацьбы з'яўляюцца рэвалюцыйныя перавароты, дзякуючы якім адбываецца карэнная перабудова грамадства і ўзнікае новая фармацыя. Сілай, якая ліквідуе апошняю антаганістычнаю фармацыю, павінен быў стаць пралетарыят.

Паколькі марксісты звязвалі свае спадзеванні на ўсталеванне камуністычнага грамадства з перамогай рэвалюцыі, то менавіта вылучэнню гісторыі рэвалюцый яны надавалі асабіста вялікаю ўвагу. Ужо ў сярэдзіне 40-х гадоў Маркс звяртаецца да гісторыі Вялікай Французскай рэвалюцыі і нават плануе напісаць буйную працу па гісторыі Конвента. У Конвенце Маркс бачыў "максімум палітычнай энергіі, палітычнай магутнасці і палітычнага расудку". Ён падрабязна вывучаў палітычныя пазіцыі жырандыстаў, якабінцаў, "балота". Асабліва шмат увагі Маркс удзяляў вывучэнню прычын падзення якабінскай дыктатуры. Ён лічыў, што якабінская дыктатура несла ў сабе невырашальную супярэчнасць. Кіраўнікі якабінскага блоку з аднаго боку імкнуліся абмежаваць накапленне багацця, а з другога, сваёй палітыкай аб'ектыўна стваралі ўмовы для хуткага развіцця буржуазных адносін. Адлюстраваннем і адначасова вырашэннем гэтай супярэчнасці і стаў пераварот 9 тэрмідора.

Маркс лічыў неправільнымі спробы растлумачыць памяркоўнасць Англійскай рэвалюцыі XVII ст. яе рэлігійным характарам. Ён тлумачыў гэта тым, што ў ходзе рэвалюцыі склаўся саюз буржуазіі і землеўладальніцкага новага дваранства. У гэтым істотнае адрозненне Англійскай рэвалюцыі ад Французскай, якая знішчыла буйныя землеўладанні шляхам парцэлізацый.

Новы штуршок даследаванню гісторыі рэвалюцый далі падзеі 1848-1849 гадоў. Аналізіруя рэвалюцыйныя падзеі 1848-1849г.г. Маркс перагледзеў некаторыя свае погляды на законамернасці рэвалюцый. На вопыце рэвалюцый XVII – XVIII ст. Маркс лічыў, што ў ходзе рэвалюцый з кожным этапам да ўлады прыходзяць ўсё больш радыкальныя сілы, якія ўвесь час паглыбляюць рэвалюцыю. Адпаведна Маркс лічыў, што новая рэвалюцыя павінна завяршыцца прыходам да ўлады пралетарыяў. Рэвалюцыя 1848г. не пацвердзіла гэтыя погляды. У рабоце "Класавая барацьба ў Францыі" Маркс вызначае характар рэвалюцыі 1848 г. як буржуазна-дэмакратычны, указвае, што сацыялісты памыліліся, прыняўшы яе за пачатак пралетарскай. У той жа час Маркс адзначыў, што ў рэвалюцыі 1848г. вялікаю ролю ў якасці самастойнай сілы ўпершыню іграў пралетарыят. На думку Маркса, менавіта актыўны ўдзел у рэвалюцыі пралетарыяту забяспечыў звяржэння манархіі ў Францыі і прымусіў часовы ўрад правесці сацыяльныя рэформы.

Маркс робіць вывад, што рэвалюцыя 1848 г. развівалася па нізыходзячай лініі, і дадзеная ім перыядызацыя адлюстравала галоўныя ступені папятнага руху рэвалюцыі. Маркс лічыў, што рашаючым штуршком для адкату рэвалюцыі стаў разгром чэрвеньскага паўстання парыжскага пралетарыяту. Зваротнаму руху рэвалюцыі спрыялі, па Марксу, ваганні дробнай буржуазіі, кансерватызм французскага сялянства, контрэвалюцыйная пазіцыя буйной буржуазіі з яе антырэспубліканскімі настроямі. У сваёй працы Маркс шмат увагі ўдзяляе ацэнцы дзейнасці палітыкаў таго часу. Нягледзячы на першаснае значэнне эканамічнага

фактару, ён не адмаўляў за лідэрамі магчымасці аказваць значны ўплыў на ход рэвалюцыі. Не адмаўляў ён і значнага ўплыву на ход падзей ідэалагічных пабудоў, традыцый і перакананняў.

У сваёй працы Маркс дае тлумачэнне прычн поспеху банапартызму ў Францыі. Ён лічыць, што за Луі Банапартам стаялі пэўныя класавыя сілы: частка буржуазіі, якая ў страху перад пралетарыятам гатова была кінуцца ў абдымкі ваеннага дыктатора; маса ўласніцкага сялянства, з яго ілюзіямі наконт "сялянскага імператара"; адарваны ад грамадства і адасоблены ваенна-бюракратычны апарат; дэкласіраваныя элементы. Маркс лічыў, што да завяршальнага этапу рэвалюцыі 1848 г. асноўныя класавыя сілы Францыі знясілелі сябе ў доўгай барацьбе і прыйшлі да пэўнай раўнавагі. У гэтых умовах для банапартыстаў, і іх галоўнай апоры – рэакцыйнай ваеншчыны адкрылася магчымасць выступіць пад сцягам надкласавай сілы, у ролі выратавальнікаў грамадства і ўставаляваць сваю дуктатуру. Гэтая дыктатыра грунтавалася на ваенна-паліцэйскім тэроры, сацыяльнай дэмагогіі і лавіраванні паміж класамі. У той жа час яна была цесна звязана з найбольш рэакцыйнымі коламі буржуазіі.

Заснавальнікі марксісцкай гістарыяграфіі звярнулі ўвагу і на нацыянальны рух у час рэвалюцыі 1848 г. Яны лічылі, што ў Еўропе былі нацыянальныя рухі, якія мелі прагрэсіўны характар і тыя, якія аб'ектыўна ўзмацнялі рэакцыйны лагер. Так, Маркс і Энгельс высока ацанілі польскі нацыянальны рух у час рэвалюцыі, яго барацьбу супраць расійскага і аўстрыйскага абсалютызма, удзел палякаў ў рэвалюцыйных дзеяннях у іншых краінах. Разам з тым, Маркс і Энгельс паказалі контрэвалюцыйны характар нацыянальных рухаў славян у Аўстрыйскай імперыі. Гэтыя нацыянальныя рухі былі выкарыстаны для разгрому рэвалюцыі ў Астрыі, Венгрыі, Італіі. З такой ролі, якую шэраг славянскіх народаў адыграў у рэвалюцыі 1848 г., Энгельс у працы "Рэвалюцыя і контрэвалюцыя ў Германіі" зрабіў выснову, што яны не здольны да самастойнага нацыянальнага існавання і ў выпадку распаду Аўстрыйскай імперыі будуць непазбежна паглынуты больш буйнымі дзяржавамі.

Маркс увесь час падкрэсліваў, што буржуазныя рэвалюцыі заўсёды характэрызуюцца абмежаванасцю. Буржуазныя рэвалыцыі, на яго думку, заўсёды маюць патрэбу ў розных ідэалагічных пакровах дзеля таго, каб прыдаць вузкакласавым інтарэсам буржуазіі від агульначалавечых памкненняў. Але ж буржуазія не здольна, па Марксу, на доўга павесці за собой агульныя масы. Маркс прыйшоў да высновы, што ў "гістарычных бітвах" трэба праводзіць адрозненні паміж фразамі і ілюзіямі партый і іх сапраўднай прыродай і сапраўдным інтарэсам. Маркс лічыў, што нельга меркаваць аб класавым характары партый па біяграфіях іх лідэраў.

З гісторыі Францыі Маркс зрабіў выснову,што ў ходзе буржуазных рэвалюцый адбываецца ўдасаналенне варожай народу буржуазнай дзяржаўнай машыны. З гэтага Маркс заключаў, што пралетарыю будзе неабходна зламаць старую дзяржаўную машыну. Буржуазныя рэвалюцыі не завершаюць пераўтварэння грамадства, а толькі пачынаюць яго.

Наступная рэвалюцыя, якая стала прадметам даследвання Маркса і Энгельса – гэта Парыжская Камуна 1871 г. Тут найбольш значная праца Маркса "Грамадзянская вайна ў Францыі", якая выйшла ў 1871 г. Маркс даказваў, што

Камуна ліквідавала аппарат дзяржаўнай улады буржуазіі і будавала дзяржаву новага тыпу, якая па сутнасці прадстаўляла сабой дыктатуру пралетарыяту. Яна была ўрадам рабочага класа. Яе задача заключалася ў ажыццяўленні эканамічнага вызвалення працы.

Пасля рэвалюцый 1848-1849 гадоў Маркс і Энгельс актывізавалі даследванне сучаснага ім буржуазнага грамадства. Праўда гэта не былі глыбокія гістарычныя даследванні. Маркс і Энгельс пастаянна падкрэсліваюць цесную сувязь паміж унутранай і знешняй палітыкай кіруючых класаў. Яны лічылі, што пасля рэвалюцый 1848-1849 гадоў у знешняй палітыцы еўрапейскіх дзяржаў значна ўзмацнілася агрэсіўнасць. Цэнтральным ў знешняй палітыцы еўрапейскіх дзяржаў у той час яны лічылі ўсходняе пытанне. Вывучаючы знешнепалітычныя крокі Польмерстона, Наполеона III і іншых дзяржаўных дзеячаў, яны рабілі акцэнт на класавай абумоўленасці іх знешняй палітыкі. Знешняя палітыка Пальмерстона характарызуецца як контрэвалюцыйная, а Напалеону III адводзілася роля аплота еўрапейскай рэакцыі.

Маркс і Энгельс актыўна вывучалі еўрапейскія нацыянальныя рухі: польскае паўстанне 1863 г., ірладскі рэвалюцыйны рух, аб’яднанне Італіі, вызвалнчага руху балканскіх народаў. Тэматыку гістарычных даследванняў Маркса і Энгельса пашырала прадпрынятае імі вывучэнне каланізатарскай палітыкі еўрапейскіх дзяржаў і адпаведна гісторыі краін Азіі, Афрікі, Амерыкі. У артыкулах, прысвечаных опіўмным войнам у Кітае і Сіпайскаму паўстанню, Маркс заклаў асновы падыходу марксіцкай гістарыяграфіі да праблемы нацыянальна-вызваленчага руху ў калоніях. Ён падкрэсліва неабходнасць узаемадзеяння нацыянальна-вызваленчага руху ў калоніях з пралетарскім рухам у метраполіях.

У гісторыі ЗША Маркса і Энгельса ў першую чаргу цікавіла Грамадзянская вайна 1861 – 1865 гадоў. Маркс лічыў, што яе глыбіннай прчынай з’яўлялася не пытанне аб выхадзе паўднёвых штатаў з Саюза, нарастаўшая на працягу паўстагодзя барацьба фермерства за зямлю, барацьба капілістычнай сістэмы наёмнай працы і свабоднага прадпрымальніцтва з рабаўладальніцка-плантацыйнай сістэмай. Апошняя стала тормазам на шляху капіталістычнага развіцця ЗША. У сапрацьстаянні гэтых сацыяльных сіл Маркс бачыў аснову гісторыі ЗША першай паловы XIX ст. і ключ да разумення характару і прычын Грамадзянскай вайны.

Найбольш значным укладам Маркса ў даследванне буржуазнага грамадства з’яўляецца яго галоўная праца “Капітал”. У ёй Маркс абрысаваў паслядоўныя фазы эканамічнай гісторыі капіталізму. Пачатак яго генезісу ён звязваў з вялікімі геаграфічнымі адкрыццямі, якія прывялі да зараджэння сусветнага рынку. Рашаючыя крокі да сваёй спеласці капіталізм, па Марксу, зрабіў у XVIII ст. Маркс глыбока даследваў праблему першапачатковага накаплення капіталу. Гэты працэс, па Марксу, заняў цэлую гістарычнаю эпоху, эпоху ўзнікнення капіталу і наёмнай працы. Асноўным зместам гэтага працэсу з’яўляецца адзялення вытворца ад сродкаў вытворчасці, гвалтоўная экспрапрыяцыя непасрэдных вытворцаў. Адным са шляхоў першапачатковага накаплення капіталу з’яўлялася і аграбленне калоній.

У якасці наступнай важнейшай вехі ў развіцці капіталізму Маркс вылучае прамысловы пераварот. Ён зрабіў выснову, што прамысловы пераварот меў не толькі тэхнічны, але і сацыяльны бок, і ў выніку прамысловага перавароту

сфарміраваліся асноўныя класы капіталістычнага грамалства: прамысловая буржуазія і прамысловы пралетарыят. Прамысловы пераварот паклаў пачатак індустрыялізацыі Еўропы.

Маркс акцэнтаваў увагу на росце супярэчнасцей капіталізму, на узманенненні эксплуатацыі рабочага класа. Ён шмат увагі ўдзяляе праблеме змены становішча сялянства з развіццём капіталізму. Ён указвае на растушчую эксплуатацыю сялянства капіталам і на ўзмацненне дэферэнцыяцыі сярод сялян. Маркс адзначаў розны ўплыў, які развіццё капіталізму аказала на станаўленне сялян ва Усходняй і Заходняй Еўропе. Калі ў апошняй ішоў працэс разарэння дробных сялянскіх гаспадарак, то на ўсходзе кантынента адбылося ўзмацненне феадальнай эксплуатацыі сялянства. У "Капітале" Маркса абсалютызуюцца адмоўныя бакі гісторыі капіталізму.

Гісторыя буржуазнага грамадства закранаецца Энгельсам у такіх яго буйных працах, як "Развіццё сацыялізма ад ўтопіі да навукі" і "Анці-Дзюрынг". Найбольш значная ўвага тут удзелена гісторыі рабочага і сацыялістычнага руху. Энгельс указаў, што сацыялістычныя і камуністычныя вучэнні ўяўляюць сабой адлюстраванне класавай барацьбы рабочага класа. Таму ў гісторыі гэтых вучэнняў знаходзіць сваё ўвасабленне ідэалагічная барацьба класаў. Але ў той жа час Энгельс указваў, што у развіцці сацыялістычных ідэй назіраецца і пэўная самастойнасць адносна эканамічнага базіса.

У гісторыі сацыялістычных ідэй Энгельс вялікае значэнне надаваў сістэмам Сен-Сімона, Фурье і Оуэна, якіх называў заснавальнікамі сучаснага сацыялізму. Аналізуючы іх асноўныя ідэі, Энгельс лічыў, што яны былі звязаны з перамогай і ўсталяваннем капіталізму ў Англіі і Францыі, з абвастрэннем яго супярэчнасцей, са з'яўленнем прмысловага пралетарыяту. Апошні ў той чс яшчэ не быў здольны да самастойнага палітычнага дзеяння. У сілу гэтага здавалася, што палепшыць яму жыццё можа толькі знешняя дапамога зверху. Аналізуючы перадумовы іўзнікнення сацыялістычных тэорый, Энгельс важнейшаю ролю ў гэтым працэсе адводзіў класавай барацьбе пралетарыя і росту яго класавай свядомасці.

Уласна гістарычныя працы Энгельса прысвечаны перш за ўсё гісторыі Германіі і ваеннай гісторыі. Галоўную мэту сваіх работ Энгельс бачыў у выяўленні гісторый ролі розных класаў германскага грамадства ў нацыянальным лёсе нямецкага народа і яго вызваленчай барацьбе. Адна з буйнейшых гістарычных прац Энгельса прысвечана гісторыі Сялянскай вайны 1525 г. У гісторыі сялянскай вайны ён спрабаваў знайсці тлумачэнне толькі што прайшоўшых падзей рэвалюцыі 1848-1849 гадоў. Высвятляючы прычыны няўдач рэвалюцыйнай барацьбы германскага сялянства ў XVI ст., Энгельс прайшоў да высноў, што паражэнне сялян было абумоўлена здрадніцкай палітыкай бюргерства і ў разрозненнасцю і неарганізаваннасцю сялянскіх мас, якія нядольны самастойна давесці сваю барацьбу да пераможнага завяршэння. Сялянства было пазбаўлена кіраўніцтва з боку тагачаснай нараджаючайся буржуазіі.

Артыкул "Рэвалюцыя і котрэвалюцыя у Германії" утрымлівае нарыс сацыяльна-эканамічнай гісторыі на ранняй стадыі развіцця капіталізму. Тут Энгельс дае тлумачэнне прычын нездольнасці нямецкай ліберальнай буржуазіі

РЭПАЗІТОРЫЙ ГГУ ІМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

іграць кіруючую ролю ў дэмакратычнай рэвалюцыі. Ён робіць выснову, што толькі нямецкі пралетарыят можа прадстаўляць інтарэсы ўсёй нацыі.

Абагульненні па многіх пытаннях германскай гісторыі зроблены былі Энгельсам у працы “Роля насілля ў гісторыі”. Ён імкнецца з матэрыялістычнай пазіцый растлумачыць чаму у другой паллве XIX ст. такую вялікаю ролю ў германскай гісторыі адыграла насілле. Яго найбольш яскравым увасабленнем стала бісмаркаўская палітыка “жалеза і крыві”. Аналізуючы эканамічныя і палітычныя перадумовы аб’яднання Германіі вакол Прусіі, Энгельс лічыць, што ў 60-я гады XIX ст. адзінства Германіі стала абсалютна неадкладнай задачай. Гэта звязана з тым, што нямецкая буржуазія з 1848 г. перажыла эканамічны ўздым і ў яе радах узрастала імкненне знесці ўсе перашкоды на шляху эканамічнага развіцця, перш за ўсё раздробленасць краіны. Бісмарк, ажыццяўляючы рэвалюцыю зверху, зразумеў і ажыццявіў эканамічныя патрабаванні нямецкай буржуазіі, але пры гэтым рашуча адхіліў яе палітычныя дамаганні. Энгельс прыйшоў да высновы, што юнкер Бісмарк у якасці паборніка нацыянальнай ідэі звязваў свае спадзеванні не з народнымі масамі, а са сродкамі тайнай дыпламатыі. Яго палітыка, якая карысталася і падтрымкай ліберальнай буржуазіі, вызначыла мілітарысцкае аблічча новай Германіі, рэакцыйны змест яе ўнутранай і знешняй палітыкі. Энгельс, займаючыся пытаннямі ўнутранага становішча Германіі, абгрунтоўвае думку аб тым, што імперыю чакае непазбежны крах. Нямецкі мілітарызм рухаецца да сусветнай вайны, у якой нямецкая армія і нямецкая дзяржава будуць разбіты.

У сваіх працах па гісторыі войн армій і ваеннага майстэрства Энгельс падкрэсліваў цесную сувязь ваеннай справы з эканоміка з сацыяльным ладам грамадства, з барацьбой класаў і класавай палітыкай дзяржавы. Гэту сувязь Энгельс імкнецца парасачыць на працягу ваеннай гісторыі ад старажытнасці да самага канца XIX ст. Энгельс падкрэсліваў, што буржуазныя рэвалюцыі XVI-XVIII ст., асабліва Вялікая Французская рэвалюцыя, прывялі да карэнных змен і ў ваеннай справе. Ён лічыў, што не свабодная творчасць розуму геніяльных палкаводцаў рэвалюцыянізуючым чынам мяняла характар ваенных дзеянняў, а вынаходніцтва лепшай зброі і змена салдацкага матэрыялу рашаючым чынам уплывала на гэта. Уплыў геніяльных палкаводцаў у лепшым выпадку заключаецца ў тым, што яны прыстасоўваюць спосаб вядзення бою да новай зброі і да новых байцоў Пасля першых бітваў франка-прускай вайны Энгельс растлумачыў паражэнні французскіх войскаў як заканамерны вынік загнівання і разлажэння банапартысцкага рэжыму і прадказваў поўную катастрофу французскай арміі. Энгельс разглядаў мілітарызм як натуральнае праяўленне капіталізму. Сапраўдным прадстаўніком мілітарызму ў той час, на думку Энгельса, з’яўлялася “германская імперыя прускай нацыі”. У 1887 г. ён выказвае перакананне, што “для Прусіі-Германіі немагчыма ўжо ніякая іншая вайна, акрамя сусветнай вайны”. Выкліканыя такой вайны будуць спусташенні, эканамічныя патрасенні, голад і эпідэміі, лічыў Энгельс. Закончыцца яна ўсеагульным банкротствам, крахам буржуазных дзяржаў.

Буйнейшым сацыял-дэмакратычным гісторыкам у Германіі ў пачатку XX ст. быў **Франца Мерынга** (1846-1919). Ён пакінуў вялікую спадчыну гістарычных прац: “Легенда аб Лесінгу”, “Гісторыя германскай сацыял-дэмакратыі”, “Гісторыя

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Германіі з канца сярэдніх вякоў”, “Нарысы па гісторыі войн і ваеннага мастацтва”, “К.Маркс. Гісторыя яго жыцця”. Мерынг імкнецца стварыць новую канцэпцыю прускай гісторыі. Ён паказвае, што ўзвышэнне Прусіі было не вынікам жадання яе правіцелей, а адлюстраваннем патрэб капіталістычнага развіцця. Ён раскрыў мілітарысцкі характар Прускай дзяржавы, указаў, што яго эканамічную аснову складала прыгонніцтва. Мерынг падрабязна аналізіруе эканамічн. палітыку Фрыдрыха II і апраяргае тэзіс аб тым, што ён быў каралём беднякоў. Мерынг ясна паказаў, што клопат караля аб захаванні сялянскіх надзелаў дыктаваўся ваенна-фіскальнымі меркаваннямі.

Мерынг распрацоўвае праблему сацыяльнага характару нямецкага асветніцтва. Яно трактавалася як першае праяўленне барацьбы буржуазіі супраць феадалізма. Разпрацоўваючы праблемы гісторыі германскай сацыял-дэмакратыі, Мерынг дае высокую адзнаку дзейнасці Ласаля.

У ваенна-гістарычных работах Мерынга ён даследуе эпоху напалеонаўскіх войн. Ён прыйшоў да высновы, што галоўнай супярэчнасцю той эпохі было англа-французскае эканамічнае саперніцтва. Тлумачачы прычыны йенскай катастрофы, Мерынг указваў, што яна стала вынікам адсталасці феадальнай Прусіі ад буржуазнай Францыі. Шмат увагі Мерынг удзяліў прускай ваеннай рэформе пачатку XIX ст. Ён даказваў, што рэформа стала не вынікам дзяржаўнай мудрасці караля, а наступствам дзейнасці групы перадавых ваенных і палітычных дзеячаў, якія імкнуліся павярнуць развіццё Прусіі на бурж. шлях.

У Францыі ў пачатку XX ст. буйнейшым прадстаўніком марксісцкай гістарыяграфіі выступаў **Жан Жарэс,** які стаў ініцыятарам стварэння шматтомнай «Сацыялістычнай гісторыі 1789-1900 гг.» Асабіста Жарэсам былі напісаны тамы, прысвечаныя гісторыі Вялікай Французскай рэвалюцыі. Галоўнае адрозненне гэтай працы Жарэса ад іншых даследаванняў па гэтай праблеме ў тым, што яна ўтрымлівае вельмі багаты матэрыял па сацыяльна-эканамічнай гісторыі рэвалюцыі. Да Жарэса Французскую рэвалюцыю прадстаўлялі як завяршэнне века Асветніцтва і падзею, адпаведна, перш за ўсё ідэалагічную. Жарэс трактуе рэвалюцыю як падзею перш за ўсё сацыяльную і гаворыць пра яе перш за ўсё эканамічнае паходжанне. Ён падкрэслівае, што рэвалюцыя з’явілася завяршэнне працяглай эканамічнай і грамадскай эвалюцыі Францыі, якая прывяла буржуазію да улады і ўсталявала яе эканамічнае панаванне. У той жа час ён не адмаўляў значэння і філасофскага руху ў справе падрыхтоўкі рэвалюцыі.

## ТЭМА: Французская гістарыяграфія межваеннага перыяду.

1. Крызіс пазітывісцкай гістарыяграфіі і ўзнікненне школы "Аналаў".
2. Вывучэнне Вялікай французскай рэволюцыі і буржуазных рэволюцый XIX ст.
3. Вывучэнне рабочага і сацыялістычнага руху і Парыжскай камуны.
4. Вывучэнне першай сусветнай вайны..

***Литература.***

*Годшо Ж.* Альбер Матьез // Французский ежегодник,1982. М.,1984.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

*Гурэвич А. Я.* Марк Блок и "Апология истории" // Блок М. Апология истории или рэмесло историка. М., 1986.

*Собуль А.* Жорж Ле Феўр - историк французской рэволюции // Французский ежегодник, 1959. М, 1961.

*Собуль А.* Классическая историография французской рэволюции // Французский ежегодник, 1976. М., 1978.

*Фюрэ Ф. О* некоторых проблемах, поставленных развитием отечественной истории // Философия и методология истории. Под рэд. И. С. Кона. М,, 1977.

**1**. Галоўнымі цэнтрамі гістарычных даследаванняў і падрыхтоўкі гггісторыкаў у Францыі былі гуманітарные факультэты універсітэтаў. Важную ролю ў каардынацыі работы гггісторыкаў ігралі навуковыя таварыствы. Пасля пераможнага заканчэння вайны ў Францыі шырока распаўсюдзіліся патрыятычныя і нацыяналістычныя настроі. З другога боку, умовы вострага пасляваеннага крызісу, рэвалюцыі ў Расіі, Германіі і Аўстра-Венгрыі далі магутны штуршок уздыму рэвалюцыйных і сацыялістычных ідэй. Велізарныя ахвяры і каласальныя сацыяльныя патрасенні, звязаныя з першай сусветнай войной яшчэ больш падарвалі веру в грамадскі прагрэс, выклікалі настроі песімізму і разчаравання. У інтэлектуальнай атмасферы міжваеннага часу многія навуковыя адкрыцці часта падаваліся як сведчанне няздольнасцы розуму да аб’ектыўнага пазнання свету, адмову ад абсалютнай ісцыны і об’ектыўнай рэальносцы, ад ідэй заканамернасцы.

Новае пакаленне гісторыкаў ужо не задавальняла традыцыйнная пазітывісцкая гістарыяграфія, надаваўшая галоўную ўвагу апісанню падзей палітычнай, дыпламатычнай і ваеннай гісторыі. Пакаленне 20-х гадоў хвалявалі новыя праблемы: дэмаграфія, міграцыя, каланізацыя, развіццё гарадоў і прамысловасцы, змены сістэмы сельскагаспадарчай вытворчасцы, прагрэс энергетыкі, а таксама такія злабадзённыя праблемы, як крызіс Брытанскай імперыі, будучае велізарных прастора Амерыкі, пробуджэнне народных мас у Азіі, нараджэнне савецкай рэспублікі. Першачарговай задачай для гісторыі такія буйныя даследчыкі, як Блок і Феўр лічылі рашучы перагляд метадалагічных прынцыпаў пазітывісцкай гістарыяграфіі.

Пасля заканчэння першай сусветнай войны гісторыкі традыцыйна-пазітывісцкага напрамку захоўвалі вялікі ўплыў на французскую гістарычную навуку. У 1920-1922 гадах пад рэдакцыяй старэйшыны пазітывісцкай школы **Эрнэста Лавіса** выйшла ў свет "Гісторыя сучаснай Францыі ад рэвалюцыі да міру 1919 года" (10 тт.). У гэтай рабоцэ гісторыя Францыі разглядалася перш за ўсё як "гісторыя нацыі", якая, нягледзячы на ўнутраныя раздоры і войны з іншымі дзяржавамі, няўхільна рухалася па шляху прагрэсу, цывілізацыі і дэмакратыі.

Пошукі новых падыходаў да вывучэння працэсаў грамадскага развіцця ў той час працягвалі прадстаўнікі сумежных з гісторыяй навук: філосафы, сацыёлогі, географы, эканамісты, якія пачалі крытыкаваць пазітывісцкую гістарыяграфію яшчэ ў даваенны перыяд. Філосаф і сацыёлаг **Анры Бер**, які вылучыў да вайны задачу стварэння цэласнага "культурна-гістарычнага сінтазу", у 1920 г. апублікаваў першы том задуманай ім грандыёзнай 100-томнай серыі манаграфій "Эвалюцыя человечества". Яна была заклікана паказаць гісторыю чаловецтва з гледжання сінтазу ўсіх гуманітарных навук. Лічачы вызначальным фактарам гістарычнага

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

развіцця духоўнае жыццё, Бер вылучаў на першы план вывучэнне культурна-гістарычных працэсаў.

Глаўную ролю в перабудове французскай гістарыяграфіі адыгралі гісторыкі **Люсьен Феўр** (1878-1956) і **Марк Блок** (1886-1944). З іх дзейнасцю звязана станаўленне і першы этап развіцця школы “Аналаў”. Галоўная праца Феўра "Лёс Марцына Лютэра". Феўр напісаў вялікую колькасць палемічных артыкулаў і рэцэнзій, частка якіх пазднеи была сабрана ў зборніках "Бітвы за гісторыю" (1953) і "За цэластную гісторыю" (1962). Асноўныя працы Блока - "Феадальнае грамадства" (т. 1-2, 1939-1940) і "Характэрныя рысы аграрнай гісторыі Францыі" (1931). Погляды Феўра і Блока на змест і метады гістарычнай навукі фарміраваліся пад моцным уздзеяннем Бера, с якім яны цэсна супрацоўнічалі, імкнучыся рэалізаваць яго ідэю "гістарычнага сінтезу" шляхам арганізацыі междысцыплінарных даследаванняў. Феўр і Блок прымалі шэраг ідэй марксізму, перш за ўсё, думку Маркса аб вядучай ролі эканомікі і сацыяльных адносін у развіцці грамадства.

Блок і Феўр востра крытыкавалі традыцыйную пазітывісцкую "падзейную" гістарыяграфію апвядання. Яны сцвярджалі, што гісторыя заклікана не проста апісваць падзеі, а вылучаць гіпотызы, ставіць і вырашаць праблемы. Асноўную задачу гістарычнай навукі Блок і Феўр бачылі ў сстварэнні ўсеабдымнай сінтэтычнай "глабальнай" гісторыі, якая ахоплівае ўсе бакі жыцця чалавека, вывучае грамадства з розных пунктаў гледжання - сацыяльнага, псіхалагічнага, маральнага, рэлігійнага і эстэтычнага, нарэшцэ, з палітычнага, эканамічнага і культурнага. Рашэнне падобнай задачы мела на ўвазе шырокі катакт і ўзаемадзеянне гісторыі з другімі навукамі, перш за ўсё - навукамі аб чаловеку. Феўр настойліва абгрунтоўваў думку аб існаванні "ўнутранага адзінства, звязваючага паміж сабою ўсе навуковыя дысцыпліны".

У адрозненні ад Бэра, вылучаўшага на першы план "культурна-гістарычны сінтаз", Феўр і Блок надавалі асабліва вялікае значэнне вывучэнню эканамічных і сацыяльных адносін. Феўр даказваў, што для разумння "глыбокага жыцця" краіны зусім недастаткова апісаць дзейнасць манархаў, прыдворныя інтрыгі і перавароты, "указы і прыказы". Неабходна, перш за ўсё, даць уяўленне аб яе прыродзе, насельніцтве, гаспадарчай дзейнасцы, прыладах вытворчасцы, гандлі, гарадах, сістэме ўласнасцы, грамадскіх класах, рэлігіі, мове, рэлігійных адрозненнях і многіх іншых фактарах грамадскага развіцця.

Адной з важнейшых новых праблем, одкрытых для даследавання заснавальнікамі "Аналаў", з’яўляецца не вывучаўшаяся раней гісторыя грамадскай псіхалогіі, калектыўных уяўленняў і каштоўнасцэй, якую Блок і Феўр вызначылі як гісторыю ментальнасцэй, увёўшы гэтае поняццэ ў гістарыяграфію. Намячаючы перспектыву новых даследаванняў, Феўр прапаноўваў напісаць гісторыю нянавісцы, гісторыю спачування, гісторыю страха, гісторыю кахання і іншых пачуцяў". Грунтуючыся на вылучаным імі новом падыходзе да вывучэння гісторыі. Блок і Феўр падверглі перагляду галоўныы паняцці гістарычнай навукі: гістарычны факт і гістарычны дакумент. Яны доказывалі, што да ліку гістарычных фактаў адносяцца не толькі "падзеі", але і "працэсы", у тым ліку працэсы сацыяльна-эканамічнага развіцця і грамадскай псіхалогіі. Абясцэньванне манеты, паніжэнне заработной платы, рост цэн - усё гэта, - пісал Л. Феўр, "бясспрэчна, таксама

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

гістарычныя факты, прычым, з нашага пункту гледжання, куда больш важныя, чым смерть якога-небудзь гасудара цы заключэнне нетрывалага дагавора".

У адрозненні ад гггісторыкаў позітывісцкага напрамку, якія абсалютызавалі значэнне пісьмовых дакументаў ("тэкстаў"), Блок і Феўр значна пашырылі кола крыніц. Феўр пісаў: "Гісторыя, несумненна, ствараецца па пісьмовых дакументах. Калі яны ёсць. Але яна можа і павінна стварацца без пісьмовых дакументаў, калі іх увогуле не існуе." Імкнучыся да стварэння ўсеабдымнай, "глабальнай" гісторыі, Блок і Феўр не прытрымліваліся монаістычнага падыходу да інтэрпрытацыі гістарычнага працэса. На першы план у іх тлумачэнні выступала то геаграфічнае асяроддзе і рост насельніцтва, то развіццё тэхнікі і абмену, то калектыўная псіхалогія (ментальнасць). Нярэдка менавіта яна прадставала як вядучы пачатак, паколькі ўсе з’явы грамадскага жыцця ажыццўляюцца, праходзячы праз свядомасць і суб’ектыўную псіхалагічную матывацыю чалавека, а людзі - "адзіныя сапраўдныя об’екты гісторыі".

Заснавальнікі "Аналаў" даказвалі, што матэрыял крыніц і ўдакладненыя імі факты заўжды з’яляюцца вынікам творчай актыўнасцы вучонага, праведзенага ім адбора, які залежыт ад пастаўленай ім праблемы, ад вывылучанай гіпотызы. Гісторык "сам стварае матэрыял для сваёй работы", пастаянна "канструіруе" свой аб’ект вывучэння, адбірае і групуе неабходныя яму крыніцы і факты. Адсюль Блок і, асабліва, Феўр рабілі вывады, сцвярджаючы, што гістарычныя факты не існуюць без гггісторыка, яны створаны цы "вынайдзены" гггісторыкамі. У спрэчках аб прынцыпах і граніцах гістарычнага пазнання Блок і Феўр горача адстойвалі пазнавальныя магчымасцы гісторыі, зыходзячы з упэўненасці, што прырода, а ў ёй і чалавек, як частка прыроды і аб’ект гісторыі, пазнавальныя і іх можна растлумачыць. В 1941-1942 гадах Блок напісал кнігу "Апалогія гісторыі цы рамясло гггісторыка". Гісторыя, пісаў Блок; гэта "наука аб людзях" ("аб людзях у часе) і даказваў, што гісторыя здольна пазнаць мінулае чалавека. Такім чынам, для гггісторыкаў школы “Аналаў” прадмет гістарычнага даследавання – чалавечае грамадства як адзіная сістэма, галоўнымі кампанентамі якой з’яўляюцца ўмовы матэрыяльнага жыцця, эканоміка, сацыяльная структура і ўсе праявы духоўнага жыцця. Прадмет гістарыянай навукі – гэта эканамічнае – сацыяльнае – духоўнае

У 1929 г. Блок і Феўр заснавалі новы гістарычны часопіс з праграмнай назвай "Аналы эканамічнай і сацыяльнай гісторыі". Вакол яго згуртавалася школа "Аналоў", якая лічыла неабходным надаць галоўную ўвагу вывучэнню сацыяльна-эканамічных праблем і абнавіць метады гістарычнага даследавання. Школа "Аналаў" на працягу некалькіх дзесяцыгоддзяў аказывала рашаючы ўплыў на развіццё французскай гістарыяграфіі. Труды М. Блока і Л. Феўра, вылуня імі ідэі азначалі пераход да новага разумення зместу і задач гістарычнага мышлення. Яны заклалі аснову "новай гістарычнай навукі" цы, "новай навуковай гісторыі", якая заваявала пасля другой сусветнай вайны вядучае становішча ў сусветнай гістарыяграфіі.

**2.** Разам з заснавальнікамі "Аналаў" вялікую ролю ў абгрунтаванні новай тэматыкі і метадаў французскай гістарыяграфіі адыгралі працы спецыялістаў па эканамічнай гісторыі, у першую чаргу **Эрнеста Лябруса** (1895-1988). Ён даказываў, што эканамічныя цыклы сваім рытмам вызначаюць гістарычнае

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

развіццё. Важнейшым прызнакам рытму эканамічных цыклаў ён лічыў змены цэнаў і залежны ад іх рух даходаў разных сацыяльных груп. Лябрус імкнуўся канкрэтна даследаваць уплыў руху цэнаў і дходаў на сацыяльна-палітычную барацьбу і на ўзнікненне рэвалюцыйных рухаў, асабліва Французскай рэвалюцыі 1789 г. Таму разам з эканамічнымі працэсамі "вялікай працягласцы" Лябрус грунтоўна вывучаў і непасрэдна ўздзейнічаючыя на сацыяльную актыўнасць "кароткія" (сезонныя), "цыклічныя" і "міжцыклічныя" (10-20 гадоў) ваганні цэнаў і даходаў. Пад гэтым вуглом бачання былі напісаны его галоўныя даследаванні "Нарыс руху цэнаў і даходаў у Францыі XVIII стагоддзя" (2 тт., 1933-1936) і "Крызіс французскай эканомікі ў канцы старога парадку і ў пачатку рэвалюцыі" (1944).

На основе статыстычнай апрацоўкі велізарнага архіўнага матэрыялу, Лябрус устанавіў, што у 1726-1789 гадах адбывалася працяглае падзенне рэальнай заработнай платы і рост кошту жыцця. Ён выявіў дынаміку арэнднай платы, рост цяжару дзесяцыны і натуральных сеньёрыальных плацяжоў, якія спаганяліся з сялян, і паказаў, што гэтыя працэсы паўплывалі на абвастрэнне сацыяльных супярэчнасцэй у Францыі XVIII ст. і выспяванне ў ёй рэвалюцыйнага крызісу. Падсумоўваючы дадзеныя ўстаноўленых ім статыстычных серый, Лябрус прыйшоў да высновы, што ў сярэдзіне 1789 г. у Францыі сустрэліся тры эканамічныя працэсы рознай працягласцы: вышэйшая кропка "доўгай хвалі" эканамічнага ўздыму і росту цэнаў, у выніку чаго ўзбгачалася французская буржуазія, з 1730-х гадоў; затым - вяршыня "міжцыклічнага" пагаршэння эканамічнай каньюнктуры, якой адзначаны апошнія два дзесяцыгоддзі старога парадку, і, нарэшцэ, выклікаными неўраджаем вастрэйшы харчовы крызіс і катастрафічны для масы беднаты сезонны ўзлёт дарагавізны, дасягнуўшы піка ў ліпені 1789 г. Тым самым, Лябрус пагаджаўся з Мішле, бачыўшым у падзеях канца XVIII ст. "рэвалюцыю жабрацтва", але не адвяргаў і супрацьлеглы тэзіс Мацьеза аб "рэвалюцыі працвітання". На думку Лябруса, працяглы працэс павышэння цэнаў і эканамічнага росту ў XVIII ст. забяспечыў уздым буржуазіі і яе рэфарматарскі парыў. Унутры доўгага (з 1733 г.) працэса ўздыма кароткі перыяд упадку "выглядаў эпізодам".

Згодна з логікай свайго падыходу, Лябрус звязваў сацыяльныя рухі, рэвалюцыйныя і палітычныя крызісы непасрэднна з ваганнямі эканамічнай каньюнктуры. Напрыклад, Французская рэвалюцыя выступала ў яго як наступства эканамічнага крызісу "старога тыпу", у якім вызначальную ролю адыгрывае рух хлебных цэнаў, і нарожоджанага ім "крызісу жабрацтва".

Французскія гісторыкі звяртаюцца да аналогіі паміж рэвалюцыяй 1789 г. і Кастрычніцкай рэвалюцыяй. Гісторыкі, якія працягвалі традыцыі І. Тэна, знаходзілі новыя падставы для асуджэння рэвалюцыі 1789 г. у паралелях з рэвалюцыяй у Расіі. Так, член Французскай акадэміі **П. Гаксот** у 1928 г. выдаў кнігу "Французская рэвалюцыя", у якой ставіў знак роўнасцы паміж якабінцамі і бальшавікамі. Асуджаючы рэвалюцыйны гвалт і "анархію", Гаксот называў прыход якабінцаў да ўлады "пралетарскай рэвалюцыяй", у выніку якой усталяваўся "камуністычны тэрор" і "дыктатарскі камунізм", пакінуўшы пасля сябе "толькі руіны".

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Гісторыкі рэспубліканскага напрамку на чале з **А. Аларам** бачылі ў французскай рэвалюцыі галоўную крыніцу дэмакратычных і рэспубліканскіх установаў і каштоўнасцэй, якія яны супрацьпастаўлялі ўжо не толькі манархістам, але і ідэям і практыцы Кастрычніцкай рэвалюцыі, перш за ўсё ідэям рэвалюцыйннага гвалту і дыктатуры пралетарыяту. В спецыяльным артыкуле "Тэорыя гвалту і Французская рэвалюцыя" (1924) Алар паспрабаваў даказаць, што хоць гэтая рэвалюцыя і прыменяла гвалт, вымушаная да гэтага ее ворагамі, у цэлым, у адрозненні ад рэвалюцыі Кастрычніцкай, усялякая тэорыя гвалту была "чужой і нават прама супрацьлеглай духу (французскай) рэвалюцыі", якая мела ў асноўным "легальны і юрыдычны характар". У цэлым, школа Алара, прытрымлівалася прынцыпаў традыцыйнай пазітывісцкай гістарыяграфіі і займалася, у асноўным, вывучэннем палітычнай гісторыі рэвалюцыі. Яна паступова прыходзіла да заняпаду.

Ініцыятыва ў вывучэнні Вялікай французскай рэвалюцыі перашла да больш левага гістарыяграфічнага напрамку, у дзейнасці якога радыкальны рэспубліканізм злучаўся з сацыялістычнай арыентацыяй. Яго лідэрам стал **Альбер Мацьез** (1874-1932). Ён працягваў кіраваць "Таварыствам па вывучэнню рабесп'ерызму" і яго часопісам "Рэвалюцыйныя аналы" (з 1924 г. - "Гістарычныя аналы Французскай рэвалюцыі". Услед за Жарэсам ён развіваў сацыяльную інтэрпрытацыю рэвалюцыі конца XVIII ст. У той жа час пад уплывам Алара Мацьез заўсёды надаваў вялікую ўвагу палітычным падзеям у ходзе рэвалюцыі. З яго пункту гледжання гэта была рэвалюцыя, якая забяспечыла перамогу буржуазіі, для яе дасягнення вымушанай пайсці на буйныя саступкі сацыяльным патрабаванням народа, каб атрымаць яго падтрымку. Таму якабінскі рэжым, а не 1789 г. і Дэкларацыя правоў чаловека і грамадзяніна, быў, згодна Мацьезу, ключавым перыядам рэвалюцыі. Ён разглядае рэвалюцыю перш за ўсё як барацьбу класаў, як барацьбу трэцяга саслоўя супраць прывілегіраваных саслоўяў. Пры далейшым развіцці рэвалюцыі ўсё больш вострыя сацыяльныя супярэчнасці, на думку Мацьеза, узнікаюць паміж жырандзістамі і якабінцамі.

Мацьез адводзіў главную роль в рэвалюцыі Рабесп'еру. Ён даказваў, што Рабесп'ер быў "вялікі патрыёт", "вялікі дэмакрат" і нават "сацыяліст па дзеяннях і намерах", бо "Рабесп'ер хоцеў прышэсцця Рэспублікі роўнасці, іншымі словамі - сацыялізму". Усіх праціўнікаў Рабесп'ера, як справа, так і злева (уключаючы "шалёных" і эберцістаў), Мацьез лічыў контррэвалюцыянерамі і называў "наймітамі ворагаў народа". Асабліваe яго негадаванне выклікаў любімец Алара і яго школы, лідэр памяркоўных якабінцаў Дантон. У вачах Мацьеза, гэта быў "дэмагог, які прадаваўся усім, хто хацеў его купіць".

Асноыны навуковы уклад Мацьеза ў распрацоўку гісторыі Французскай рэвалюцыі звязаны са зваротам да вывучэння яе сацыяльнай гісторыі. У галоўных працах Мацьеза: "Французская рэвалюцыя" (3 тт. 1922-1927) і асабліва ў манаграфіі "Барацьба з дарагавізнаю і сацыяльны рух у эпоху тэрора" (1927), было упершыню падрабязна даследавана становіша гарадскіх нізов (галоўным чынам у Парыжы) ў крытычны перыяд рэвалюцыі - 1792-1794 гг. Мацьез вывучыў разгарнуўшыйся ў той час магутны народны рух супраць палітыкі эканамічнага лібералізму, за рэгламентацыю гандлю і правядзенне аграрна-урашняльных мер,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

дэталёва даследаваў сацыяльную палітыку якабінскага ўрада. Ён лічыў, што тыя эканамічныя і сацыяльныя цяжкасці, з якімі сутыкнуўся камітэт грамадскага выратавання, прымусілі яго пайсці на ўвядзенне таксацыі, рэквізіцый і прымусовых пазык. Мацьез не надаваў належнай увагі сялянскаму руху і такім важнейшым пытанням рэвалюцыі, як адмена феадальных павіннасцей і продаж нацыянальных маёмасцей.

В 1932 г. Мацьез памёр і вядучая роля ў вывучэнні Французскай рэвалюцыі перайшла да **Жоржа Ле Феўра** (1874-1959). Ён падтрымаў спробы Лябруса ўвесці ў вывучэнне гісторыі колькасные (у першую чаргу, статыстычныя) метады, без якіх, як лічыў Ле Феўр, не існуе навукі. У сваіх работах ён працягнуў якабінскую традыцыю гісторыі рэвалюцыі, вельмі высока ацэньваў гістарычную ролю якобінцаў і Рабесп’ера, якога называў "самым выдатным з першых правадыроў французскай дэмакратыі". Разам з тым Ле Феўр не падзяляў характэрнай для Мацьеза ідэалізацыі рабесп’ерызму.

Уклад Ле Феўра ў вывучэнне Французскай рэвалюцыі звязаны, перш за ўсё, з распрацоўкай яе сацыяльнай гісторыі. Ле Феўр паставіў задачу вывучэння гісторыі рэвалюцыі "знізу", гэта значыць даследавання не чыста палітычных - урадавых, парламенцкіх, - а глыбінных, народных кампанентаў рэвалюцыйнай гісторыі. Пры гэтым сам Ле Феўр - першым з французскіх вучоных - заняўся паглыбленым вывучэннем таго, якой была роля сялян у рэвалюцыі і як уздзейнічала рэвалюцыя на наступныя гістарычныя лёсы сялянства. Рашэнню гэтай задачы прысвечаны галоўныя яго даследаванні: "Вялікі страх" (1932), "Аграрнаей пытанне ў эпоху тэрору" (1932).

Ле Феўр пераканаўча даказаў, што ў час рэвалюцыі сялянства выступала не ў якасці дапаможнай сілы буржуазіі, а як самастойная грамадская група, надзеленая асэнсаваннем уласных мэт і ўласнай воляй. Галоўная думка Ле Феўра заключалася ў тым, што ў рамках Французскай рэвалюцыі разгарнулася особная, аўтаномная сялянская рэвалюцыя - аўтаномная па свайму паходжанню, метадам, мэтам і - галоўнае - па сваіх антыкапіталістычных тэндэнцыях. Мэтаю гэтай рэвалюцыі была барацьба за захаванне і ўмацаванне сялянскай гаспаджаркі, вобразу жыцця, сацыяльных і духоўных каштоўнасцей сельскага свету. Сяляне прымусілі буржуазную рэвалюцыю знішчыць сеньёрыяльны лад. Але яны пратэставалі супраць безумоўнага панавання буржуазнай зямельнай уласнасці і "аграрнага індывідуалізму", патрабавалі захавання абшчынных інстытутаў і абмежавання буйнога землеўладання. Вынікі сялянскай рэвалюцыі былі, згодна Ле Феўру, адначасова рэвалюцыйнымі і кансерватыўнымі: яна разбурыла феадальны рэжым, але замацавала дробнасялянскую аграрную структуру Францыі. У выніку капіталістычная эвалюцыя была вельмі маруднай і заставалася незакончанай.

Ле Феўр стварыў таксама наватарскія працы, прысвечаныя сацыяльна-гістарычнай псіхалогіі, гісторыі ментальносцей. Галоўным з іх з’яўляецца яго кніга "Вялікі страх" (1932). У кнізе адноўлена дэталёвая гісторыя цікавейшага сацыяльна-псіхалагічнага фенамена - хвалі масавай панікі, ахапіўшай у другой палове ліпеня 1789 г. амаль усю тэрыторыю Францыі і выкліканую ілжывымі чуткамі аб з’яленні банд разбойнікаў. Гэтая кніга з’явілася адным з першых вопытаў канкрэтнага вывучэння гісторыі ментальносцей. "Велікі страх" Ле Феўра,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

а таксама яго артыкул "Рэвалюцыйныя натоўпы" (1934) былі першымі сур'ёзнымі даследаваннямі "рэвалюцыйнага натоўпа" і характэрных для яго рыс калектыўнай свядомасці. У гэтых адносінах работа Ле Феўра супрацьстаяла крайне спрошчаным меркаванням І. Тэна, які зводзіў псіхалогію рэволюцыйнага натоўпа да двух дамінантаў - вяртанне да варварскіх інстынктаў і сляпое падначаленне главарам, якія маніпулююць масавай свядомасцю. Ён паказаў, што з'явы масавай псіхалогіі далёка не заўсёды адпавядаюць сацыяльнай рэчаіснасцы, а маюць самастойнасць.

Гісторыя рэвалюцый XIX ст. у міжваены перыяд вывучалася, галоўным чынам, у "Супольніцтве гісторыі рэвалюцыі 1848 года і рэволюцый XIX ст." пад кіраўніцтвам ггісторыка-сацыяліста **Жоржа Рэнара**. Ён прапанаваў сканцэнтраваць галоўную ўвагу на эканамічным і сацыяльным развіцці Францыі. Ён рэкамендаваў вывучаць выкарыстанне машын і сродкаў транспарту, змену пасяўных культур, ролю заводаў, банкаў, мануфактур, гандлю, змены зямельнай уласнасці, ваганні цэнаў і заработнай платы. Вывучэнне палітычнай гісторыі рэволюцый, народных паўстанняў, масавых рухаў адыходзіла на другі план.

Рэнар лічыў небаходмым супрацоўніцтва класаў, і яно асабліва праявілася, на яго думку, у рэвалюцыі 1848 г. У далейшым яно знайшло сваё практычнае праяўленне ва ўсеагульным і роўным выбарчым праве, роўнасці грамадзян перад законам, абавязковай для ўсіх воінскай службе. Але калі ў сваіх даваенных работах Рэнар даказваў, што рэвалюцыя 1848 г. спрыяла руху Францыі па шляху "дэмакратыі і сацыялізму", то у 20-я гады ён стал сцвярджаць, што рэвалюцыі, якія заўсёды суправаджаюцца развалам эканомікі, голадам і гвалтам, непазбежна прыводзяць да дыктатуры.

**3.** У перыяд между двума сусветнымі войнамі гісторыя рабочага і сацыялістычнага руху яшчэ не была асэнсавана як асобная гістарычная дысцыпліна і не стала прадметам афіцыйнай "універсітэцкай" навукі. У міжваены перыяд самым вядомым даследчыкам гэтай тэмы быў **Эдуард Далеан,** прыхільнік Прудона і адзін з заснавальнікаў неапруданісцкага накірунку ў гістарыяграфіі французскага рабочага руху. У сваіх работах аб жыцці і дзейнасці Прудона, Оуэна і асабліва ў працы "Гісторыя рабочага руху" (3 тт., 1939), Далеан надаў галоўную ўвагу пруданізму і анарха-сіндзікалізму.

Асаблівае месца займала вывучэнне гісторыі Парыжскай камуны, інтарэс да якой ажывіўся пасля перамогі Кастрычніцкай рэвалюцыі, абвясціўшай сябе прадаўжальніцай справы камунараў. Гісторыкі-марксісты ўслед за Марксам і Леніным лічылі, што Парыжская камуна была першай у гісторыі пралетарской рэвалюцыяй, дзыктатурай пралетарыяту, якая сстварыла рабочую дзяржаву новага тыпу і пачала ажыцяўляцць пераход да сацыялізму.

Правые гісторыкі, з'яўляўшыеся праціўнікамі ўсякай рэвалюцыі, імкнуліся абвергнуць "марксісцкій міф" аб Камуне. Яны сцвярджалі, што "Камуна не была ні сацыялістычнай, ні нават рэвалюцыйнай"; абвінавачвалі камунараў у развязванні "дзікарскіх інстынктаў парыжской чэрні" і фактычна апраўдвалі рэпрэсіі версальцаў. Прыхільнікі Сацыялістычнай партыі падкрэслівалі сваі сімпатыі да Парыжскай камуны, яле тлумачылі яе не як першы вопыт дыктатуры пралетарыяту, а як барацьбу за рэспубліку, дэмакратыю і "вызваленне працы" шляхам супрацоўніцтва класаў.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Самым буйным прафесійным гісторыкам, які займаўся ў гэты час вывучэннем Парыжскай камуны, быў прафесар Сарбоны сацыяліст **Жорж Буржэн** (1879-1958). Ён выдаў манаграфію "Першыя дні Камуны". У 1939 г. пад кіраўніцтвам Буржэна была выдадзена і калектыўная праца "Вайна 1870-1871 гг. і Камуна". Буржэн прапаноўваў прымяніць да гісторыі Камуны "крытычныя метады, выкарыстоўваемыя пры вывучэнні іншых вялікіх рэвалюцыйных перыядаў Францыі". Ён надаваў асаблівую ўвагу збору і праверцы дакладнасці фактычнага матэрыялу. Буржэн адзначаў пралетарскі характар Камуны і яе значэнне ў барацьбе рабочых за дэмакратыю і рэспубліку, але не лічыў яе дзяржавай новага тыпа, імкнуўшайся да сацыялізму.

**4.** Першапачаткова гісторыя першай сусветнай вайны распрацоўвалася ў публіцыстыца: у друку, у шматлікіх выступленнях і мемуарах палітычных і ваенных дзеячаў. Яны імкнуліся перш за ўсё адказаць на галоўнае пытанне: чаму пачалася вайна і хто нясе адказнасць за яе? У выступленнях французскіх дзяржаўных дзеячаў быў сфармуляваны афіцыйны, "антантафільскі" пункт гледжання, прыхільнікі якога заяўлялі, што Францыя і іншыя краіны Антанты нязменна імкнуліся да міру, а Германія і Аўстра-Венгрыя былі віноўнікамі вайны. Супрацьлеглы ім напрамак пераглядаў ("рэвізаваў") афіцыйны пункт гледжання і таму называўся "рэвізіяніcцкім". Насуперак "антантафільскай" прапагандзе "рэвізіяністы" сцвярджалі, што галоўная прычына вайны каранілася ў саюзе Францыі з агрэсіўнай Расіяй, якая, нягледзячы на міралюбства Германіі, справакавала вайну і ўцягнула ў яе Францыю.

Палеміка вакол паходжання вайны і адказнасці за яе набыла яшчэ больш шырокі размах пасле публікацыі савецкім урадам тайных дагавароў, якія выкрывалі імперыялістычныя імкненні краін Антанты, а таксама публікацый нямецкіх дыпламатычных дакументаў, меўшых на мэце даказаць міралюбства Германіі. У адказ французскі ўрад прыступіў да выдання сваіх дыпламатычных дакументаў, якія апраўдвалі палітыку Францыі. "Французскія дыпламатычныя дакументы (1871-1914)" утрымлівают вялізны фактычны матэрыял аб палітыцы вялікіх дзяржаў у канцы XIX - пачатку XX ст. і аб паходжанні першай сусветнай вайны.

У 20-я гады ў вывучэнні гісторыі першай сусветнай вайны галоўную ролю адыгрываў **Пьер Рэнувен** (1893-1974), вучань Алара. З пачатку 20-х гадоў Рэнувен быў кіраўніком "Таварыства па гісторыі вайны", і нязменным рэдактарам яго часопіса "Агляд гісторыі сусветнай войны". Ён першым пачаў чытаць курс лекцый па гісторыі вайны ў Сарбоне. У 1925 г. выйшла ў свет першая буйная праца Рэнувена "Непасрэдныя прычыны вайны". У ёй асвятляшся стан міжнародных адносін на працягу двух апошніх месяцаў перад пачаткам вайны. Рэнувен, па сутнасці, прымыкаў да "антантафільскага" пункту гледжння. Разам з тым ён успрымаў і некаторыя рысы "рэвізіяніcцкай" канцэпцыі, сцвярджаючы, што першапачаткова Германія і Австра-Венгрыя не хацелі вайны, але Расія штурхнула Францыю на канфлікт с імі.

У 1929 г., калі ў Францыі адзначалася 15-я гадавіна пачатку вайны, была выдадзена калектывная праца французскіх гісторыкаў "Дыпламатычная гісторыя Еўропы (1871-1914 гг.)". Важнейшые главы гэтага двухтомнага выдання былі

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

напісаны Рэнувенам. На гэты раз Рэнувен больш выразна падтрымаў "антантафільскі" пункт гледжання, падкрэсліваў адказнасць Германіі і Австра-Венгрыі за развязванне вайны. Ён выступаў супраць "рэвізіяністаў", сцвярджаючы, што французскі ўрад толькі ішоў у фарватары царскай Расіі, і даказваў, што ўмацаванне англа-французскай Антанты было наступствам агрэсіўнасці Германіі, а ваенныя мерапрыемствы Францыі напярэдадні вайны насілі выключна абарончы характар. Асноўную ўвагу Рэнувен надаў фактам палітыка-дыпламатычнай дзейнасці. Разам з тым ён імкнуўся перайсці ад традыцыйнай "дыпламатычнай гісторыі" да больш шматбаковай "гісторыі міжнародных адносін", уключаючай знешнюю палітыку в рамкі агульнагістарычных працэсаў. Не абмяжоўваюыся вывучэннем дзейнасці дыпламатаў, Рэнувен палічыў неабходным паказаць эканамічнае саперніцтва вялікіх дзяржаў, гонку ўзбраенняў, ідэалагічную падрыхтоўку да вайны, стан нацыянальна-возваленчых рухаў.

Апошняй буйной работай Рэнувена ў міжваенны перыяд была апублікаваная ў 1934 г. манаграфія "Крызіс і вялікая вайна (1914-1918)". У ёй яшчэ яскравей праявілася яго імкненне выйсці за рамкі чыста "дыпламатычнай" гісторыі. Працягваючы прытрымліваццa "антантафільскай" канцэпцыі, Рэнувен значна абнавіў змест сваёй працы, уключыў у яе, разам з апісаннем дыпламатычных і ваенных падзей, гісторыю "палітычнага, эканамічнага і сацыяльнага жыцця", псіхалогію і "маральныя памкненні" ваюючых народаў. На яго думку, вайну выклікалі, у першую чаргу, ваеннае саперніцтва і нацыяналістычныя "страсці". Эканамічнай і гандлёвай канкурэнцыі вялікіх дзяржаў Рэнувен адводзіў другарадную ролю, сцвярджае, што фінансісты і прамыслоўцы ўсіх краін хацелі міру. Адступаючы ад звычайных канонаў пазітывісцкай гістарыяграфіі, Рэнувен разглядаў не толькі "падзеі" вайны, але і эканамічныя, палітычныя і маральныя "сілы", якія ўздейнічалі на іх.

Такім чынам, у міжваенны час французская гістарыяграфія яшчэ ў многім развівалася пад уплывам пазітывізму. У той жа час адбывалася фарміраванне "школы Аналаў" з яе прынцыпова новым, сінтазным падыходам да вывучэння гісторыі.

## ТЭМА: ГІСТАРЫЧНАЯ НАВУКА Ў ВЯЛІКАБРЫТАНІІ Ў МІЖВАЕННЫ ЧАС І ГАДЫ ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ

1. Тэарэтыка-метадалагічныя асновы гістарычнай навукі.
2. Палітычная гісторыя.
4. Фармаванне эканамічнай і сацыяльнай гісторыі.

Літаратура

Виноградоў К. Б. Очерки английской историографии нового и новейшего времени. - Л., 1975.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Мучник В.М. Формирование и эволюция идейно-теоретических воззрений А.Дж. Тойнби. – Томск, 1987.

Кисель М.А. Р.Дж. Коллингвуд – историк и философ // Коллингвуд Р.Дж. Идея истории. Автобиография. – М., 1980.

1. **Тэарэтыка-метадалагічныя асновы гістарычнай навукі**. У 20-30-я гады ва ўніверсітэцкіх цэнтрах, нацыянальных, рэгіянальных і мясцовых гістарычных таварыствах вядучае становішча па-ранейшаму займалі гісторыкі-медыевісты. У той жа час прыкметна ўзрос аўтарытэт гісторыкаў, якія займаюцца вывучэннем новай гісторыі. Новая гісторыя зацвердзілася ў якасці самастойнай акадэмічнай дысцыпліны.

Гісторыкам, якія баранілі Супраціўленне, супрацьстаялі гісторыкі і публіцысты, што апраўдвалі палітыку ўрада Вішы. Найбольш значнай постаццю гэтага кірунку быў Рабер Арон, аўтар кніг "Гісторыя Вішы" і "Гісторыя вызвалення". Аднабакова падбіраючы, а часам і падтасоўваючы факты, Арон прадстаўляў вішыстаў абаронцамі інтэрасаў Францыі, сцвярджаючы, што ўрад Вішы маршала Петэна быў "шчытом", а дэ Голь - мячом Францыі.

**3.** Вядучую ролю ў даследванні Вялікай французскай рэвалюцыі ў пасляваеннай французскай гістарыяграфіі адыграў **Жорж Лефеўр** (1874-1959). Ён падкрэсліваў важнасць вывучэння эканамічнай і сацыяльнай гісторыі, становішчы

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

народных мас, сацыяльнай псіхалогіі. Да ліку першачарговых задач гістарычнай навукі ён адносіў ужыванне колькасных метадаў, вывучэнне геаграфічных і біялагічных фактараў эвалюцыі грамадства. Лефеўр не падзяляў уласцівага школе "Аналаў" зняважлівага стаўлення да "падзеяў" і "кароткага гістарычнага часу"; да палітычнай гісторыі, рэвалюцыйнага руху і біяграфій гістарычных дзеячаў. У сваіх канкрэтна-гістарычных працах напісаных у пасляваенны перыяд: "Дырэкторыя" (1946), "Французская рэвалюцыя" (1951), Лефеўр працягнуў даследаванні барацьбы класаў, сутыкненняў партый і рэвалюцыйных дзеячаў. Лефеўр высока ацэньваў гістарычную ролю рэвалюцыі, і дзейнасць якабінцаў. Прадстаўнікі гэтага кірунку, які называў сябе "якабінскім", надавалі галоўную ўвагу даследаванню рэвалюцыйнага працэсу "знізу"; з пункта гледжання становішча і барацьбы народных мас.

Буйны ўклад у вывучэнне гісторыі вялікай французскай рэвалюцыі ўнёс вучань Лефеўра, гісторык-марксіст **Альбер Сабуль** (1914-1982). Калі Лефеўр вывучаў становішча, настроі і дзеянні сялян, то Сабудь распачаў даследаванне іншай найважнейшай масавай сілы рэвалюцыі - народных мас горада, санкюлотаў. Па яго меркаванню, "сапраўды гэтак жа, як і самастойны сялянскі рух, у рамках рэвалюцыі існаваў і развіваўся спецыфічны рух санкюлотаў", якія патрабавалі "эгалітарнай і народнай рэспублікі". Дзякуючы дзеянням санкюлотаў "была звергнута Жыронда і ліберальная рэспубліка", а затым створаны Рэвалюцыйны ўрад на чале з Рабесп'ерам, які абапіраўся на саюз "мантаньярскай буржуазіі і парыжскіх санкюлотаў". Пакуль перад рэвалюцыйнай Францыяй стаяла пагроза ваеннага паражэння, гэты саюз забяспечваў устойлівасць і сілу Рэвалюцыйнага ўрада. Але пасля першых буйных ваенных перамог рэвалюцыі "супрацьстаянне паміж буржуазіяй і парыжскімі санкюлотамі" выйшла на першы план; іх саюз распаўся і адбыўся тэрмідарыянскі пераварот. Санкюлотам "не атрымалася дасягнуць сваіх уласных мэт", але іх рух спрыяў гістарычнаму прагрэсу дзякуючы вялікай дапамозе, якую яны аказалі буржуазнай рэвалюцыі".

Крытыкуючы сцвярджэнні гісторыкаў, якія адмаўляюць антыфеадальны характар французскай рэвалюцыі, Сабуль даказваў жывучасць феадальных адносін у Францыі на пярэдадні рэвалюцыі і падкрэсліваў роля рэвалюцыі ў іх знішчэнні. Працы, прысвечаныя гэтым сюжэтам, аб'яднаны Сабулем ў кнізе "Сялянскія праблемы рэвалюцыі. 1789-1848." (1977). Ён стварыў таксама агульныя працы па перадгісторыі і гісторыі рэвалюцыі, у тым ліку "Нарысы гісторыі французскай рэвалюцыі" (1962), "Першая рэспубліка" (1968), "Цывілізацыя і французская рэвалюцыя" (1970-1982).

Іншая плынь у вывучэнні Французскай рэвалюцыі была прадстаўлена прафесара Тулузскага ўніверсітэта **Жакам Гадшо** (1907-1989). Гадшо на працягу шматлікіх гадоў распрацоўваў праблему міжнароднага ўплыву Французскай рэвалюцыі 1789 г., а таксама гісторыю яе ўспрымання ў краінах Еўропы і Амерыкі. Гэтым праблемам была прысвечана яго капітальная праца "Вялікая нацыя. Рэвалюцыйная экспансія Францыі ў свеце ад 1789 да 1799".

На аснове сваіх даследаванняў Гадшо (сумесна з вядомым амерыканскім гісторыкам Р.Палмерам) высунуў канцэпцыю, па якой шматлікія рэвалюцыйныя рухі, якія адбываліся ў апошняй трэці XVIII ст. у Заходняй Еўропе і Амерыцы (у

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

тым ліку Вайна за незалежнасць у Паўночнай Амерыцы і Французская рэвалюцыя) уяўляюць сабой у сукупнасці аб'яднаную агульным зместам "атлантычную рэвалюцыю". Вынікам яе з'явілася ўсталяванне па абодвух берагах Атлантыкі новай Заходняй або Атлантычнай цывілізацыі.

Значнае месца ў французскай гістарыяграфіі 40-60-х гадоў заняло вывучэнне дарэвалюцыйнага "старога парадку" і народных рухаў XVII-XVIII стагоддзяў. Вядучую ролю ў гэтых даследаваннях адыгрываў прафесар **Ралан Мунье**. Вынікам яго шматгадовых даследаванняў гісторыі дзяржаўных устаноў Францыі стала манаграфія "Установы Францыі пры абсалютнай манархіі" (т. 1-2,1974-1980). Палемізуючы з гісторыкамі-марксістамі, Мунье сцвярджаў, што дарэвалюцыйнае грамадства "старога парадку" складалася не з класаў, якія тады яшчэ не сфармаваліся, а з дробных і разнастайных пластоў -"страт". Па яго тэорыі "сацыяльнай стратыфікацыі", у аснове сацыяльнай іерархіі грамадства ляжаць не столькі эканамічныя вытворчыя адрозненні, колькі "сістэма каштоўнасцяў" тое, што ў кожнай сацыяльнай групе або "страце" лічыцца праўдзівым, добрым, прыгожым, такім чынам, жаданым. Менавіта на гэтай аснове, лічыў Мунье, варта вывучаць сацыяльную структуру грамадства - ад сістэмы каштоўнасцяў да сацыяльнай структуры, а не наадварот.

Па меркаванні Мунье, толькі ў XIX ст. можна казаць аб сацыяльных класах, заснаваных на эканамічных адрозненнях, але і ў гэтым выпадку вядучую ролю адыгрывалі ўяўленні аб сістэме каштоўнасцяў. Розніца толькі ў тым, што ў свядомасці людзей XIX ст., у адрозненне ад XVII-XVIII стагоддзяў, "сацыяльная павага, сацыяльная перавага, гонар, вартасць перамясціліся ў вобласць вытворчасці матэрыяльных выгод".

Даючы агульную характарыстыку грамадства "старога парадку", Мунье адмаўляўся лічыць яго феадальным. Ён зыходзіў з юрыдычнага разумення феадалізму як сістэмы ўзаемаадносін васалаў і сеньёраў, і даказваў, што ў XVII-XVIII стагоддзях такой сістэмы ў Францыі ўжо не існавала. Народныя паўстанні таго часу не былі, па меркаванні Мунье, класавай барацьбой супраць феадалаў, бо нярэдка іх ініцыятарамі з'яўляліся франдзіруючые арыстакраты або буржуа, галоўным матывам якіх быў пратэст супраць падаткаў, а не супраць феадальнай сістэмы. Мунье не ўгледжваў у такіх паўстаннях які-небудзь прагрэсіўны змест і лічыў іх рэакцыйнымі. З гэтых пазіцый ён уступіў у спрэчку з савецкім гісторыкам Б.Ф.Поршневым. Апошні даказваў, што народныя паўстанні XVII-XVIII стагоддзяў, былі праявай класавай барацьбы паміж народнымі масамі і іх эксплуататарамі, барацьбой, якая расхіствала і саслабляла феадальна-абсалютысцкі лад.

**4.** Пасляваенныя гады былі часам хуткага росту палітычных навук, якія ўключылі ў тэматыку сваіх даследаванняў некаторыя праблемы новай і найноўшай гісторыі Францыі. Вядучым даследчыкам у гэтай сферы быў Франсуа Гагель. Галоўных кірункаў яго навуковай дзейнасці былі даследаванні па выбарчай геаграфіі. Ён склаў падрабязныя карты галасавання выбаршчыкаў па кожным дэпартаменце і паказаў, як з цягам часу змяняўся ўплыў розных палітычных плыняў і партый. Гагель не лічыў геаграфічны фактар вызначальным і звяртаў увагу не толькі на ўстойлівыя тэндэнцыі ў галасаванні выбаршчыкаў, але і на іх

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

змены. Па яго меркаванню, паводзіны выбаршчыкаў вызначаюцца шматлікімі фактарамі, прычым "узаемны ўплыў палітычных, эканамічных, сацыяльных, рэлігійных і гістарычных дадзеных змяняецца ад аднаго раёна да другога. А таксама ад аднаго перыяду часу да іншага.

Найважнейшым кірункам палітычных даследаванняў з'яўлялася вывучэнне гісторыі палітычных партый. Найбуйнейшым спецылістам у гэтай вобласці ў 40-60-я гады быў прафесар Морыс Дзювержэ. Ён увёў прынятую цяпер у Францыі класіфікацыю палітычных партый на "масавыя" і "кадравыя" у залежнасці ад іх арганізацыйнай структуры і сістэмы функцыянавання. Не згаджаючыся з марксістамі, якія лічылі палітычныя партыі найболей свядомымі прадстаўнікамі сацыяльных класаў, Дзювержэ, тым не менш, надаў вялікую ўвагу ўзаемадзеянню партый і класаў. У 1955 г. пад яго кіраўніцтвам выйшла калектыўная праца "Палітычныя партыі і сацыяльныя класы ў Францыі", якая ўтрымлівала багаты матэрыял аб складзе, дзейнасці і ўплыве ўсіх асноўных палітычных партый Чацвёртай рэспублікі.

З канца 40-х гадоў гісторыя рабочага руху, да якой раней звярталіся толькі нешматлікія аўтары, стала самастойнай навуковай дысцыплінай. Буйным даследаваннем па гісторыі рабочага класа стала доктарская дысертацыя **Ані Крыжель** "Ля вытокаў французскага камунізму", апублікаваная ў 1964 г. Яна крытыкавала заснавальнікаў ФКП за тое, што яны па прыкладзе рускіх бальшавікоў парвалі з рэфармізмам і ўсталі на шлях рэвалюцыйнай барацьбы. Па яе меркаванню, утварэнне кампартыі было "штучнай прышчэпкай рускага камунізму на дрэва французскага сацыялізму", якая стала магчымай толькі дзякуючы выпадковаму збегу акалічнасцяў, у першую чаргу краху рэфармістаў падчас першай сусветнай вайны і перамозе Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Расіі. Асуджаючы камуністаў, якія не жадалі адмовіцца ад "рэвалюцыйнага міфа", Крыжель лічыла, што ўсе практычныя дасягненні працоўнага руху былі атрыманыя толькі рэфармісцкім шляхам.

Істотны уклад у вывучэнне рабочага руху ўнесла дысертацыя вядомага гісторыка-марксіста **Клода Вілара** "Гедзісты. Сацыялістычны рух у Францыі (1893-1905)". На аснове шырокага кола крыніц, у першую чаргу велізарнай колькасці архіўных дакументаў, а таксама друку, успамінаў і перапіскі дзеячаў сацыялістычнага руху Вілар даследаваў працэс пранікнення марксізму ў Францыю, погляды гедзістаў, іх прапагандысцкую і арганізацыйную дзейнасць і палітычныя пазіцыі. У цэнтры яго ўвагі - сацыяльны склад створанай гедзістамі Французскай рабочай партыі, дзейнасць мясцовых арганізацый і радавых актывістаў, гэта значыць, вывучэнне сацыялістычнага руху "знізу".

**5.** У 70-я гады ў французскай гістарыяграфіі пачаўся новы перыяд. Марксісцкі кірунак значна аслаб. Тэорыі структуралізму і прапанаваная Брадэлем канцэпцыя "глабальнай гісторыі" таксама не задавальнялі шматлікіх гісторыкаў. Гэта прывяло да стварэння "новай гістарычнай навукі" або, - як яе часта называюць у Францыі, - "новай гісторыі", якая абапіралася на дасягненні школы "Аналаў", але і значна адрознівалася ад яе. Маніфестам новага кірунку, дзе ўпершыню загучаў тэрмін "новая гісторыя", стаў трохтамны зборнік артыкулаў "Ствараць гісторыю", які выйшаў у 1974 г. пад рэдакцыяй вядомага медыевіста вучня Брадэля **Жака Ле**

РЭПАЗІТОРЫЙ ГГУ ІМЕНІ Ф. СКАРЫНЫ

**Гофа** і палітолага **П'ера Нара**. Яны заклікалі гісторыкаў ўсвядоміць "адноснасць іх навукі", зразумець, што навуковец непарыўна звязаны з грамадствам, залежыць ад яго сістэмы каштоўнасцяў, а таму, вольна або мімаволі, адбірае, групуе і, такім чынам, "канструюе" або нават "фабрыкуе" гістарычныя факты ў адпаведнасці са сваімі перакананнямі і поглядамі. Насуперак поглядам Брадэля, аўтары зборніка лічылі неабходным "вяртанне падзеі" і "кароткага часу" у сферу ўвагі гісторыкаў. Яны выступалі з надзеяй, што абноўленая "палітычная гісторыя зможа гуляць галоўную ролю" ў сістэме гістарычных ведаў. Яны адзначалі "раздрабненне гісторыі" на асобныя, мала звязаныя адзін з адным, кірункі даследаванняў. Такім чынам, у поле зроку гісторыка ўключаліся тэмы, якія здаваліся раней неістотнымі, а зараз разглядаліся як неад'емныя аспекты жыцця грамадства: гісторыя клімату, моладзі, хвароб і медыцыны, роля міфаў, свят, кінафільмаў. Адной з галоўных адметных рыс "новай гісторыі" стала шырокае ўжыванне колькасных ("квантытатыўных") метадаў даследавання.

Іншай прыкметай абнаўлення гістарычнай навукі было пашырэнне і раздрабненне яе тэматыкі на шэраг кірункаў, якія выкарыстоўваллі дасягненні сумежных навук: дэмаграфіі, антрапалогіі, этнаграфіі, псіхалогіі, лінгвістыкі, кліматалогіі. Цэнтр цяжару даследаванняў перамясціўся з эканомікі на менталітэт; на гісторыю калектыўных уяўленняў і пачуццяў, а таксама на антрапалогію і біялогію чалавека. Даследаванне класаў і іншых сацыяльных груп саступілі месца вывучэнню індывідуальнай выявы жыцця і матываў паводзін людзей.

Гістарычная дэмаграфія вылучылася ў адмысловую дысцыпліну, якая сістэматычна ўжывае колькасныя метады. Зарадзілася і стала імкліва расці гістарычная антрапалогія, вывучаўшая, галоўным чынам, біялагічныя аспекты жыцця чалавечых грамадстваў: нараджэнне, смерць, хваробы, стан гігіены і г.д. Гісторыкі пачалі вывучаць стаўленне людзей да жыцця і смерці, якое выяўляецца, перш за ўсё, на аснове іх завяшчанняў, надмагільных надпісаў, паднашэнняў у цэрквы, а таксама іканаграфіі.

Прадметамі адмысловых даследаванняў сталі святы, знакі, міфы, гісторыя рытуалаў, "гісторыя зносін" і "гісторыя ўяўнага". У працы "За іншыя сярэднія вякі" (1977) Ле Гоф упершыню даследаваў уяўленні сярэднявечнага чалавека аб часе, яго стаўленне да працы, яго ўяўленні аб свеце і культуру. Буйным крокам у вывучэнні гісторыі калектыўных уяўленняў стала праца "Месцы памяці", апублікаваная ў 1984-1986 гадах пад рэдакцыяй П.Нара. Яго аўтары даследавалі розныя "месцы памяці", гэта значыць усё тое, што можа служыць захаванню памяці аб мінулым, у тым ліку эмблемы, знакі, помнікі, святы, архітэктурныя будынкі, падручнікі, слоўнікі, каляндары, гістарычныя творы, легенды і шматлікае іншае. Яны імкнуліся стварыць гісторыю калектыўных паданняў, высвятліць, як фармаваліся і замацоўваліся ў памяці розных пакаленняў, напрыклад, такія паняцці, як "нацыя" і"рэспубліка".

Вялікі уклад у стварэнне "новай гістарычнай навукі" ўнесла "трэцяе пакаленне" школы "Аналаў", якія ў пачатку 70-х гадоў змяніла пакаленне Брадэля. Найболей значнымі прадстаўнікамі трэцяга пакалення былі Эм-мануэль Ле Руа Лядзюры, Жак Ле Гоф і **Марк Феро**. Часопіс "Аналы" істотна змяніў сваю тэматыку, накіраваўшы галоўную ўвагу на гісторыю менталітэту і гістарычную

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

антрапалогію. "Аналы" 70-80-х гадоў публікавалі адмысловыя даследаванні аб стане харчавання французскага насельніцтва, аб эпідэміях, злачыннасці. Не адмаўляючыся, у прынцыпе, ад "глабальнай гісторыі" і даследаванняў "вялікай працягласці", новая рэдакцыя часопіса заявіла, што яна будзе вывучаць і параўнальна кароткачасовыя гістарычныя падзеі; надасць большую ўвагу палітычнай гісторыі і гісторыі сучаснасці.

Ле Руа Лядзюры асабліва прыцягнула "вясковая цывілізацыя", з яе павольна бягучай, "нерухомай гісторыяй", якая захоўвае на працягу некалькіх стагоддзяў прыблізна аднолькавую колькасць насельніцтва, узровень вытворчасці і спажывання, амаль нязменныя выявы жыцця. У кнізе аб невялікай пірэнэйскай вёсачцы Мантайю ён даў узор дэталёвага гісторыка-антрапалагічнага даследавання, дбайна прааналізаваўшы жыллё, адзежу, харчаванне, уяўленні аб жыцці і баўленне часу жыхароў гэтай вёскі ў XIII-XIV стагоддзях.

Брадэль у гэты час засяродзіўся на завяршэнні фундаментальнага даследавання "Матэрыяльная цывілізацыя, эканоміка і капіталізм. XV-XVIII стагоддззі." Па словах Брадэля, ён імкнуўся знайсці адказ на пытанне: "Якім чынам той лад, тая складаная сістэма жыцця, той сусветны Стары парадак мог прыйсці ў непрыдатнасць і зламацца, дасягнуць меж магчымага, а затым выйсці за іх? І чаму гэта адбылося толькі да выгады невялікай прывілеяванай часткі насельніцтва планеты?". У цэнтры ўвагі Брадэля знаходзіліся тры галоўных пласта жыцця грамадства: паўсядзённае "матэрыяльнае жыццё", рынкавая эканоміка і "капіталізм", (дакладней гандлёвы і фінансавы капітал). У першым томе, названым "Структуры штодзённасці", Брадэль вывучаў сферу паўсядзённага жыцця людзей. Лічачы, што "матэрыяльнае жыццё - гэта людзі і рэчы, рэчы і людзі", ён падрабязна разгледзеў дынаміку насельніцтва розных раёнаў свету, сістэмы харчавання, адзежу, жыллё, тэхніку, транспарт, грашовы зварот, ролю гарадоў, супярэчнасці паміж багатымі і беднымі, адшукваючы "правілы, якія занадта доўга ўтрымлівалі свет у даволі цяжка вытлумачальнай стабільнасці".

У другім томе Брадэль паставіў перад сабой задачу даследаваць "усю сукупнасць механізмаў абмену", а менавіта "рынкавую эканоміку" і "капіталізм", да якога аўтар адносіў банкаўскі крэдыт, спекуляцыю, гандаль на далёкія адлегласці і ўтварэнне сусветнага рынка. У абагульненай форме Брадэль разглядаў таксама "сацыяльныя іерархіі", ролю дзяржавы і, - яшчэ больш каротка, - "рэвалюцыі і класавыя баі". У трэцім томе "Час міру", - уся сусветная эканамічная гісторыя была прадстаўленая ў храналагічным парадку на працягу чатырох стагоддзяў як чаргаванне і ўзаемадзеянне некалькіх буйных "эканамічных светаў": Еўра-Атлантычнага, Урала-Азіяцкага і Далёкаўсходняга. Гэтая праца ўнесла вялікі уклад у вывучэнне матэрыяльнай культуры і эканомікі грамадства, хоць, палітычным падзеям было нададзена мала ўвагі.

Значнае месца ў французскай гістарыяграфіі 70-80-х гадоў заняла праблема Вялікай французскай рэвалюцыі. З пачатку 70-х гадоў група гісторыкаў на чале з **Франсуа Фюрэ** распачала спробу перагледзець ("рэвізаваць") ранейшыя ўяўленні аб рэвалюцыі, выкладзеныя ў працах прыхільнікаў "якабінскага" кірунку (ад Мацьеза да Сабуля) і даць "новую інтэрпрэтацыю" рэвалюцыйных падзей. Самым вядомым творам гэтага кірунку, ("рэвізіяністскага"), была кніга Ф.Фюрэ

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

"Асэнсаваць рэвалюцыю" (1978). Фюре і яго аднадумцы атакавалі марксісцкую і наогул "традыцыйную" канцэпцыю, па якой Вялікая французская рэвалюцыя насіла антыфеадальны, буржуазны характар, а яе вышэйшым этапам з'яўлялася якабінская дыктатура. З іх пункта гледжання, у 1789 г. адбылася "не адна рэвалюцыя, а сутыкненне трох рэвалюцый": рэвалюцыі ліберальнай эліты, рэвалюцыі сялян і рэвалюцыі санкюлотаў. Толькі "рэвалюцыя эліты" - адукаванага ліберальнага дваранства і буйной буржуазіі, якія імкнуліся да абнаўлення, з'яўлялася, па меркаванні Фюрэ, прагрэсіўнай. Наадварот, сялянская і санкюлоцкая рэвалюцыі, прасякнутыя эгалітарнымі ідэямі, перашкаджалі прагрэсіўнаму развіццю грамадства па шляху капіталізму. Асабліва адмоўную ролю адыграла тут якабінская дыктатура, бо ў гэты час рэвалюцыю, па выразе Фюрэ, "занесла" ў бок ад правільнага шляху, вызначанага ліберальнай элітай. Толькі тэрмідарыянскі пераварот паклаў канец гэтаму “заносу”, і французская гісторыя "аднавіла свой ход, які больш чым на стагоддзе становіцца ліберальным і буржуазным".

Фюрэ абвясціў "міфам" марксісцкую трактоўку рэвалюцыі як пераходу ад феадалізму да капіталізму. Ён даказваў, што яна не парвала з феадалізмам які, па яго меркаванню, знік яшчэ да рэвалюцыі. Дарэвалюцыйнае французскае грамадства пры Людовіку XVI, паводле Фюрэ, больш за ўсё падобна на французскае грамадства пры Луі-Піліпе ў першай палове XIX ст., і, такім чынам, рэвалюцыя не паскорыла, а замарудзіла эканамічнае развіццё Францыі. Галоўным зместам рэвалюцыі Фюрэ лічыў не сацыяльна-эканамічныя пераўтварэнні, а стварэнне дэмакратычнай палітычнай культуры. Па яго меркаванню, гэта была "ідэалагічная і палітычная рэвалюцыя Асветніцтва", якая не можа аналізавацца ў рамках эканамічных і сацыяльных супярэчнасцяў.

У наступных працах ён працягваў крытыкаваць прыхільнікаў сацыяльнай інтэрпрэтацыі рэвалюцыі, даказваючы, што яе вынікам было сцвярджэнне парламенцкага рэжыму і дэмакратычных парадкаў. У кнізе "Рэвалюцыя. Ад Цюрго да Жуля Феры. 1770-1880" ён пашырыў храналагічныя рамкі рэвалюцыі на цэлае стагоддзе, таму што толькі перамога рэспубліканцаў над манархістамі ў 1876-1877 гадах дае новай Францыі рэжым, які надоўга забяспечвае дзеянне ўсёй сукупнасці прынцыпаў 1789 г. Крытыкі рэвалюцыі вінавацілі яе ў разбурэнні эканомікі, у масавым тэроры, у стварэнні таталітарнага рэжыму.

У 80-я - 90-я гады ў французскай гістарыяграфіі адрадзіўся цікавасць да "падзеі" і "кароткага часу"; апісанне ізноў сталі лічыць неад'емнай часткай гістарычнага даследавання нараўне з аналізам гістарычных праблем. Некаторыя французскія гісторыкі пачалі займацца "мікрагісторыяй", гэта значыць глыбокім вывучэннем асобных, параўнальна дробных, падзей грамадскага або прыватнага жыцця.

Галоўнае месца ў французскай гістарыяграфіі 80-*х* - 90-*х* гадоў заняла абноўленая палітычная гісторыя і культуралогія. Традыцыйнае вывучэнне палітычных падзей і ўстаноў яна ўзбагацілася новымі падыходамі, якія дазволілі вывучаць працэсы прыняцця рашэнняў, матывы калектыўных паводзін, фармаванне вобразу сваёй краіны і іншых краін, ролі знакаў і стэрэатыпаў мыслення. Разам з палітычнай гісторыяй вярнулася абноўленая ваенная гісторыя.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Гісторыю войн, бітваў і паходаў яна дапоўніла вывучэннем адносін войска і грамадства, сацыяльнага складу і псіхалогіі вайскоўцаў.

Вывучэнне ментальнасці і гістарычнай антрапалогіі засталося важным кірункам навуковых даследаванняў, аднак цэнтр увагі перамясціўся ў вобласць гісторыі культуры. Культуралогію французскія навукоўцы разглядаюць вельмі шырока, уключаючы ў яе ўсе формы духоўнага жыцця, сістэмы каштоўнасцяў, ідэалагічныя і рэлігійныя плыні, праца, забавы, рытуалы і шматлікае іншае. Культуролагі заняліся і такімі тэмамі, якія раней наогул не вывучаліся, напрыклад, гісторыяй маргінальных груп насельніцтва, гісторыяй сэксуальнасці, гісторыяй жанчын. У 1991 г. пад рэдакцыяй Ж. Дзюбі і М. Перо была выдадзеная пяцітомавая "Гісторыя жанчын з антычнасці да нашых дзён", якая паслужыла ўзорам для аналагічных выданняў у іншых краінах.

Бурны ўздым перажывае вывучэнне гісторыя сучаснасці. Гісторыкі ўсвядомілі, што "гістарычная дыстанцыя" зусім не гарантуе бесстароннасці даследавання, а архіўныя дакументы не заўсёды з'яўляюцца найбольш пэўнымі. У 1979 г. тэрмін доступу да архіўных дакументаў скараціўся з 50 да 30 гадоў. З 1982 г. гісторыя пасляваеннага часу была ўключана ў школьныя праграмы і падручнікі. З'явіўся навуковы часопіс "Дваццатае стагоддзе", у якім сучасная гісторыя займае вельмі вялікае месца.

## ТЭМА: Гістарычная навука ў Вялікабрытаніі другой паловы XX – пачатку XXI стагоддзя

1. Метадалагічныя прынцыпы развіцця англійскай гістарыяграфіі з сярэдзіны XX стагодддзя і вывучэнне праблем знешнепалітычнай гісторыі.
2. Даследаванне палітычнай гісторыі XVII-XX ст.
3. Праблемы гісторыі складання індустрыяльнага грамадства і працоўнага руху ў Вялікабрытаніі.

ЛІТАРАТУРА

Согрин У.У., Зверава Г.И., Репина Л.П. Современная историография Великобритании. – М.,1991.

Шарифжанов И.И. Современная английская историография буржуазной революции XVII в.: основные идейно-методологические тенденции и направления. – М., 1982.

Виноградов К.Б. Очерки английской историографии нового и новейшего времени. – Л., 1975.

1. На мяжы 40-50-*х* гадо. **А. Тойнбі** завяршыў сваю працу "Зразуменне гісторыі". У паданні Тойнбі рытмы сацыяльнага распаду і росту цывілізацый узгадняліся з функцыянаваннем схемы Выкліку-і-Адказу. Выклік чалавецтву з боку Бога факусаваўся, па меркаванні гісторыка, у лёсе асобнага чалавека, у выбары ім свайго жыццёвага шляху. У канчатковым рахунку, крытэрый

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

гістарычнага прагрэсу выяўляецца ў "духоўным *непокое*, які з'яўляецца ўнутраным стымулам новага, дасягненняў".

Па перакананні іншага буйнага гісторыка **Батэрфілда**, уся гісторыя чалавецтва вызначалася Божскім Промыслам. Паняцці прагрэсу і парадку Батерфілд лічыў спекулятыўнымі канструкцыямі, народжанымі рацыяналістычнай культурай XVII-XIX ст. Батэрфілд усведамляў сябе неад'емнай часткай традыцыйнай гістарыяграфіі, якая імкнулася да наратыўнай формы і пазнавала мінулае ў яго канкрэтнасці, асаблівасці. Ён падкрэсліваў значнасць інтуітыўнага, мастацкага спосабу зразумення гісторыі, важнасць творчага ўяўлення для таго, каб адлюстраваць усё тое, што вольна і непрадказальна ў дзеяннях індывідаў. Па яго перакананню, паняцці "закон" і "неабходнасць" не павінны былі прысутнічаць у гістарычным даследаванні.

Генералізуючая, абагульняючая гістарыяграфія ў сярэдзіне XX ст. выяўляла сябе ў абліччы "новай гістарычнай навукі". Яна вырасла з крытыкі прынцыпаў традыцыйнай (пазітывісцкай, эмпірычнай) гістарыяграфіі. Магчымасці абнаўлення гістарыяграфіі звязваліся з адраджэннем ідэі прагрэсу, з аптымістычным канстатаваннем магчымасцяў развіцця чалавечага розуму, навукова-тэхнічнага і гаспадарчага росту, стабілізацыі эканамічных і сацыяльных адносін.

Да метадалагічных прац гэтага кірунку, у першую чаргу, можна аднесці лекцыі **Э. Кара,** апублікаваныя ў 1962 г. пад назовам "Што такое гісторыя?". Аўтар рашуча выказваўся супраць ідэі "нейтральнасці" гісторыі. Па меркаванні Кара, немагчыма было пісаць гісторыю "такой, як яна была", паколькі няма гісторыі без гісторыка і гістарычнага тлумачэння. "Новая гістарычная навука" самаідэнтыфікавалася падчас пошукаў "новых шляхоў" узнаўленні цэласнай гісторыі, дасягнення гістарычнага сінтэзу.

Да другой паловы 80-*х* гг. прыкметна ўзмацніліся крытычныя настроі адносна магчымасцяў "новай гісторыі". Яна апынулася не ў стане пераадолець тэарэтыка-метадалагічную і канцэптуальную раз'яднанасць гістарычнага ведання. Праблема ўключэння лакальна-гістарычных сюжэтаў у шырэйшы кантэкст і ўзнаўленні сацыяльнага цэлага заставалася нявырашанай.

Вядучае становішча ў англійскай гістарыяграфіі па-ранейшаму захоўвала палітычная гісторыя. Аднак у 60-70-я гады XX ст. істотна пашырыліся яе праблемныя палі. "Чыстая" палітычная гісторыя стала прэтэндаваць на стварэнне ўсёабдымнай "новай старой" гісторыі, якая б аб'ядноўвала вакол ядра палітычнай гісторыі элементы сацыяльнай, інтэлектуальнай, эканамічнай гісторыі.

У брытанскай навуцы гістарыяграфія знешняй палітыкі традыцыйна застаецца галіной палітычнай гісторыі. Да сярэдзіны 60-х гадоў XX ст. яна ўяўляла сабой насычаны гістарычнымі фактамі палітычны наратыў – паслядоўнае апісанне падзей знешнепалітычнай гісторыі брытанскай дзяржавы і дзейнасці яе найбольш значных палітыкаў, дыпламатаў, палкаводцаў. З 70-х гадоў гістарыяграфія знешняй палітыкі стала больш аналітычнай.

У апошнія дзесяцігоддзі асноўная ўвага надаецца вывучэнню гісторыі вылучэння краіны ў разрад вялікіх дзяржаў у канцы XVIII - першай палове XIX ст. і фармавання прынцыпаў яе еўрапейскай палітыкі, пошукам прычын паступовай згубы манапольнай пазіцыі брытанскай дзяржавы ў міры ў канцы XIX – першай

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

палове XX ст., а таксама тлумачэнню новай знешнепалітычнай рэальнасці для Вялікабрытаніі пасля другой сусветнай вайны. Найбольш актуальным у палітычнай гістарыяграфіі стала даследаванне суадносін імперскіх каштоўнасцей Вялікабрытаніі з яе еўрапейскімі інтэрасамі ў новы і навейшы час.

Брытанская знешняя палітыка ранняга новага часу інтэрпрэтавалася ў працах 60-80-х гадоў як палітыка, абумоўленая запатрабаваннямі і "камерцыйнымі інтэрасамі" дзяржавы, задачай забеспячэння нацыянальнай бяспекі. У выніку суперніцтва Брытаніі з Нідэрландамі, Скандынаўскімі краінамі і асабліва з Францыяй уяўлялася неабходнасцю і нават сродкам самаабароны. Тымі ж прагматычнымі (эканамічнымі, тэхналагічнымі, абарончымі) чыннікамі тлумачылася і актывізацыя брытанскай каланіяльнай экспансіі ў другой палове XVII – XVIII ст. Апалагетычная трактоўка замежнапалітычнага курсу пераважала і ў працах, прысвечаных пытанням гісторыі Вялікабрытаніі канца XVIII – першай паловы XIX ст. Сярод асноўных праблем, разглядаемых у кантэксце дыпламатычнай і імперскай гісторыі, – узаемаадносіны з рэвалюцыйнай і напалеонаўскай Францыяй і стварэнне пры дзейсным удзеле Вялікабрытаніі еўрапейскай "канцэртнай" сістэмы, а таксама пачатак пераўтварэнні "старой" каланіяльнай імперыі ў "новую" у сувязі з Амерыканскай рэвалюцыяй і прамысловай рэвалюцыяй у Вялікабрытаніі.

Большасць аўтараў ліберальнага кірунку (**Д. Хорн, К. Борн**) зыходзілі з таго, што брытанская дзяржава зусім не імкнулася да велічы і сусветнага першынства. Усё гэта адбылося натуральным шляхам – дзякуючы геаграфічным асаблівасцям краіны (астраўному становішчу, недахопу прыродных рэсурсаў і неабходнасці развіваць флот), высокім тэмпам індустрыялізацыі, ранняму (у параўнанні з іншымі краінамі) усталяванню дэмакратычных палітыка-канстытуцыйных прынцыпаў. Знешняя і ўнутраная палітыка брытанскай дзяржавы, такім чынам, абумоўлівалі адзін аднаго і цесна перапляталіся. Нацыянальная бяспека і гандлёвыя інтэрасы ў Еўропе і ў заморскіх тэрыторыях былі асноўнымі матывамі ў выпрацоўцы доўгатэрміновага знешнепалітычнага курсу, якога прытрымваліся брытанскія кабінеты незалежна ад іх партыйнай арыентацыі.

Ліберальныя гісторыкі паслядоўна праводзілі думку аб тым, што Вялікабрытанію пастаянна імкнулася ажыццявіць ідэю "еўрапейскага канцэрту" і роўнасці становішча з такімі дзяржавамі, як Францыя, Аўстрыя, Расія і Прусія, у імя захавання міру і бяспекі на кантыненце. Брытанскія палітычныя дзеячы прыйшлі да ажыццяўлення гэтай ідэі практычным шляхам падчас напалеонаўскіх войн, прытрымваючыся канкрэтнай мэты не дапусціць працягу французскай агрэсіі, якая падрывала еўрапейскую стабільнасць. "Канцэртная" сістэма міжнародных адносін, якая склалася на Венскім кангрэсе, няўхільна выконвалася брытанскім урадам, хоць уяўляла сабой прылад захавання кансерватыўнага статут-кво. Гэтай практычнай мэце служылі часавыя саюзы з рознымі еўрапейскімі краінамі (Іспаніяй, Бельгіяй, Партугаліяй і інш.). Той жа задачай кіравалася Вялікабрытанія, уступаючы ў Крымскую вайну ("ухіліць рускую гегемонію ў Чорным моры") і займаючыся вырашэннем Усходняга пытання.

У працах кансерватыўных гісторыкаў (**Дж. Джонс, І. Крысці**) прыводзілася падобнае тлумачэнне прычын узвышэння Вялікабрытаніі ў XVIII – першай палове

РЭПАЗІТОРЫЙ ГДУ ІМЯ Ф. СКАРЫНЫ

XIX ст. Тым не менш, у адрозненне ад ліберальных аўтараў яны прытрымваліся версіі аб першапачаткова існаваўшым першынстве Вялікабрытаніі сярод еўрапейскіх краін, якое давала ёй падставы выступаць арганізатарам і гарантам міру ў Еўропе. Брытанія свядома імкнулася стаць першай дзяржавай міру. Гэта быў шанс засцерагчы сябе ад пагрозы ўварвання з кантынента, выжыць у цяжкай, працяглай барацьбе са шматлікімі сапернікамі. Вызначальным у аргументацыі кансерватыўных гісторыкаў служыў "нацыянальны інтарэс". Пад ім разумелася сукупнасць асабістых і групавых інтэрасаў у англійскім гнрамадстве (манарха, арыстакратыі, гандлёвых і прамысловых кругоў).

Разнастайнай па праблематыцы і падыходам выглядае гістарыяграфія знешняй палітыкі Вялікабрытаніі другой паловы XIX – пачатку XX ст. К. Борн, **З. Стэйнер** і іншыя вядомыя гісторыкі кансерватыўнай і ліберальнай арыентацыі ў працах 70-90-х гадоў тлумачылі пераход Вялікабрытаніі ад "бліскучай ізаляцыі" да блокавай палітыкі ў пачатку XX ст. яе імкненнем захаваць "баланс сіл" у міры і ў Еўропе, спыніць тэрытарыяльную экспансію Францыі, Расіі, Германіі. Разам з тым у працах выразна гучаў папрок ураду, які, думаючы аб міры, дазволіў іншым дзяржавам "уцягнуць" Вялікабрытанію ў першую сусветную вайну.

У гістарыяграфіі другой паловы XX ст. шмат у чым па-новаму асветлены праблемы палітыкі міжваеннага перыяду 1918 – 1939 гадоў і прычыны ўступлення Вялікабрытаніі ў другую сусветную вайну. Кансерватыўныя гісторыкі даказвалі, як мала магчымасцяў для манеўру меў брытанскі ўрад ва ўзаемаадносінах з фашысцкімі і мілітарысцкімі дзяржавамі напярэдадні другой сусветнай вайны. Гісторыкі-рэвізіяністы (**Д. Томсон**) імкнуліся зацвердзіць тэзу аб "вымушанасці" палітыкі "замірэння" для Чэмберлена, які дамагаўся падтрымання еўрапейскага міру і статут-кво ў Еўропе, досыць рэалістычна ацэньваючы складанае становішча ў Еўропе. Палітыка "замірэння", такім чынам, выглядала ў іх інтэрпрэтацыі асабліва прагматычнай (тады як ліберальныя гісторыкі нярэдка ацэньвалі яе як вынік замежнапалітычных ілюзій, ідэалізму кабінета кансерватараў).

У шэрагу прац ліберальных гісторыкаў (**П. Кэнэдзі, Р. Паркер**) утрымоўвалася спроба даць больш аб'ектыўнае абгрунтаванне замежнапалітычнага курсу брытанскага ўрада ў 1930-е гады., увязаць прыняцце ім адказных рашэнняў у адносінах да Германіі і краін Цэнтральнай і Ўсходняй Еўропы з эканамічнай нестабільнасцю ўнктры краіны, нежаданнем павялічваць і без таго вялікі цяжар гонкі ўзбраенняў. Пазбягаючы адкрытага сутыкнення з Германіяй, імкнучыся адцягнуць тэрміны ваеннага канфлікту, Вялікабрытанія, тым не менш, рыхтавалася да вайны. У канчатковым рахунку, не здымаючы з кансерватыўнага ўрада адказнасці за "замірэнне", аўтары характарызавалі гэты курс як частку дзяржаўнай "абарончай" палітыкі.

Велізарны масіў сучаснай гістарыяграфіі ўяўляе навуковая літаратура па праблемах брытанскага імперыялізму і дэкаланізацыі: гісторыі каланіяльнай экспансіі ў XIX – пачатку XX ст., арганізацыі адміністрацыйнага кіравання калоніямі і дамініёнамі і ўзаемаадносін брытанскай метраполіі з рознымі краінамі, якія ўваходзілі ў склад імперыі. Уся гісторыя Брытанскай імперыі ўмоўна падзялялася на некалькі перыядаў: 1) "першая" імперыя, якая засноўвалася на заваяванні і каланіяльным кіраванні і спыніла сваё існаванне ў выніку

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Амерыканскай рэвалюцыі; 2) "другая" імперыя, якая трымалася больш на вольнай гандлёвай экспансіі ў калоніях, чым на прамым адміністрацыйным кіраванні імі; 3) "новы імперыялізм" апошняй трэці XIX – пачатку XX ст., які выяўляў сябе галоўным чынам у тэрытарыяльнай экспансіі, выкліканай лішкам капіталаў.

Пачатак перагляду гэтай гісторыяграфічнай трактоўкі ў 50-е – пачатку 60-х гадоў заклалі кансерватыўныя гісторыкі **Р. Робінсан і Д. Галахер**. Аснову іх канцэпцыі склала ідэя аб тым, што імперыялізм як знешняя экспансія толькі часткова быў абумоўлены ўнутрыеўрапейскімі эканамічнымі і палітычнымі фактарамі. Паводле версіі Робінсана і Галахера, на працягу XIX ст. брытанская імперская палітыка зводзілася да мінімуму і выяўляла сябе галоўным чынам у "нефармальным кантролі" залежных тэрыторый. Ён ажыццяўляўся ў асноўным сіламі мясцовай адміністрацыяй і белымі перасяленцамі. Па іх версіі, ажыццяўленне каланізацыі, якая насіла "натуральны" характар, вызначалася не столькі ўрадамі Вялікабрытаніі, колькі прагматычнымі інтэрасамі мясцовых эліт і перасяленцаў. Пераход да адкрытай анэксіі афрыканскіх краін у 80 – 90-е гады. XIX ст. быў абумоўлены, па іх меркаванню, не адмовай Вялікабрытаніі ад выпрабаванай палітыкі, а небяспекай, якая зыходзіла ад нацыяналістычных рухаў у Егіпце і Паўднёвай Афрыцы. Яны пагражалі імперскім інтэрасам Вялікабрытаніі, бяспецы яе гандлёвых марскіх маршрутаў у Індыю і Аўстралію. Апасенні брытанскага ўрада з нагоды бяспекі суднаходства праз Суэцкі канал прывялі да захопу Егіпта Вялікабрытаніяй. Гэта, у сваю чаргу, справакавала актыўнасць Францыі ў Заходняй Афрыцы з мэтай не дапусціць узрастання брытанскага ўплыву на афрыканскім кантыненце. У канчатковым рахунку, як лічылі Робінсан і *Галлахер*, еўрапейскія дзяржавы сапернічалі ў Афрыцы паміж сабой, а зусім не за ўладанне Афрыкай. Калі жа падзел быў завершаны, Вялікабрытаніі не заставалася нічога іншага, як узяць новыя тэрыторыі пад прамы кантроль. Так паўстала "фармальная" Брытанская імперыя. У дадзеным выпадку палітычныя і дыпламатычныя меркаванні еўрапейскіх краін пераважалі над эканамічнымі меркаваннямі. Эканамічнае асваенне калоній паўстала толькі з прычыны падзелу.

**2.** Падчас сцвярджэнняў "новай гістарычнай навукі" адбываецца адыход даследчыкаў ад падзейнай гісторыі – да гісторыі без падзей, у якой нішто не здзяйснялася ў асобнасці. Засваенне "новымі" брытанскімі гісторыкамі вопыту па стварэнні "серыйнай" гісторыі французскай школы "Аналаў", пацягнула за сабой змену прыярытэтаў у выбары праблемных палёў у гісторыі новага часу. Не адмаўляючы такіх феноменаў як Англійская рэвалюцыя, перыпетыі палітычнай барацьбы ў парламенце і ў краіне ў XVIII ст., прамысловая рэвалюцыя, калізіі супрацьстаяння партый у XIX стагоддзі і інш., стваральнікі "новай гістарычнай навукі" засяродзіліся на больш значных, па іх перакананню, абласцях, вывучэнне якіх дазваляла зразумець прыроду пераўтварэння даіндустрыяльнага брытанскага грамадства ў сучаснае: дэмаграфічная гісторыя; структуры, інстытуты і камунікацыі, якія вызначалі паўсядзённае існаванне чалавека; цыклы жыцця звычайных людзей.

Характэрнай рысай "новай гісторыі" стала цікавасць да даследавання сацыяльных груп і пластоў, якія адрозніваліся паходжаннем, адукацыяй, статутам (арыстакратычная эліта, джэнтры, гандляры, рамеснікі, сяляне). Гэта абумовіла

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

павышаную ўвагу гісторыкаў да групавых паводзін, рухаў сацыяльнага пратэсту, народнай культуры, рэлігійных вераванняў, сацыяльным настроям "простых людзей". Імкненне гісторыкаў вывучаць "даіндустрыяльны" перыяд як эпоху павольных змен вяло да пошукаў элементаў ломкі тых структур, якія знешне выглядалі нерухомымі, стабільнымі і складалі паўсядзённае жыццё чалавека (нараджальнасць, шлюбнасць, смяротнасць, голад, хваробы, эпідэміі, формы сацыяльнай мабільнасці). У якасці цэнтральнага інстытута "даіндустрыяльнага грамадства" і ядра лакальнага грамадства для даследчыкаў выступала сям'я і яе асноўныя кампаненты (мужчыны, жанчыны, дзеці, пажылыя людзі). Важную ролю ў фармаванні гэтага праблемнага поля згуляла праца **Л. Стоуна** "Сям'я, пол і шлюб у Англіі ў 1500-1800 гады" (1977).

У 70-80-*е* гады XX ст. прыкметна ўзрасла цікавасць гісторыкаў да вывучэння гісторыі масавай свядомасці і народнай культуры ранняга новага часу. "Новая" гістарыяграфія тлумачыла народную культуру пашырана, як культуру "не эліты", уяўляўшую сабой сістэму паняццяў, каштоўнасцяў, пазіцый, знакаў, якія падзяляла большасцю грамадства. Вывучэнне праблем народнай культуры злучалася, як правіла, з даследаваннем асаблівасцей "народнай ідэалогіі" XVI – XVII ст. Адмысловую ўвагу аўтары надавалі пытанням народнай этыкі, маралі, рэлігіі. Мір народнай культуры цесна ўвязваўся з масавымі сацыяльнымі рухамі даіндустрыяльнай эпохі і настроямі іх удзельнікаў.

У гэты перыяд адбылося істотнае пераасэнсаванне зместу англійскай рэвалюцыі. Розныя па сутнасці тлумачэння прыроды Англійскай рэвалюцыі сфакусаваліся ў гісторыяграфічнай палеміцы канца 40 – пачатку 60-х гадоў - у "спрэчцы аб джэнтры". У цэнтры гэтай працяглай дыскусіі апынуліся процілеглыя тэзісы радыкальнага гісторыка **Р. Тоуні** і яго прыхільнікаў аб "узвышэнні джэнтры" і кансерватыўнага гісторыка **Х. Трэвар-Роўпера** аб "заняпадзе джэнтры" як фактары, вывучэнне якога дазваляла зразумець прычыны палітычнага канфлікту ў сярэдзіне XVII ст.

Р. Тоўні тлумачыў паходжанне Англійскай рэвалюцыі зменамі ў матэрыяльным дабрабыце заможных сацыяльных груп. Гэтыя змены здзяйсняліся з часоў Рэфармацыі, калі царкоўныя землі сталі перамяшчацца спачатку ад кароны да арыстакратыі, а пазней – ад збяднелай арыстакратыі да джэнтры. У той час як арыстакратыя перажывала эканамічны заняпад і страту палітычнага ўплыву, джэнтры ўмацоўвалі свае пазіцыі. Спробы манархіі спыніць гэты працэс прывялі, у канчатковым рахунку, да канфлікту ў 1640 г., які перарос у рэвалюцыю.

У сваю чаргу Х. Тревор-Роупер у шэрагу прац, якія вышлі ў першай палове 50-х гадоў, выступіў з крытыкай канцэпцыі Тоўні. Ён падвергнуў сумневу правільнасць статыстычных падлікаў Тоўні аб эканамічным заняпадзе арыстакратыі і звярнуў увагу на тое, што рост уплыву зямельнага сярэдняга класа быў звязаны галоўным чынам з яго актыўнасцю ў сферах гандлю, прамысловасці. Па меркаванні гэтага гісторыка, "сапраўдныя" джэнтры, дробныя землеўладальнікі пакутавалі ад інфляцыі, якая прагрэсавала і знаходзіліся ў цяжкім эканамічным становішчы. Менавіта адчай, а не ўпэўненасць у сабе, падштурхнуў іх да ўдзелу ў "Вялікім мецяжы" і затым радыкалізаваў яго змест.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

У другой палове XX ст. працэс абнаўлення гістарыяграфіі Англійскай рэвалюцыі здзяйсняўся ў значнай ступені пад уплывам ідэй школы "Аналаў" і гісторыяграфічных навацый у ЗША. Так, амерыканскі гісторык **П. Загорын** яшчэ ў 50 – пачатку 60-х гадоў сфармуляваў і абгрунтаваў ідэю аб рэвалюцыі ў Англіі ў 1640-1641 гады як канстытуцыйнай і палітычнай. У аснове канфлікту, па яго меркаванню, ляжалі супярэчнасці паміж прадстаўнікамі аднаго правячага класа. Знешне яны праяўляліся ў супрацьстаянні "двара" – кароны і яе прыхільнікаў і "краіны" – яе сапернікаў. Гэты канфлікт перарос у супрацьборства "партыі караля" і "партыі парламента", у якім апазіцыя выявіла не толькі кансерватыўнасць, але і рэвалюцыйныя магчымасці сваёй рэлігійнай і палітычнай ідэалогіі. Загорыным адзначалася паступовае пашырэнне маштабаў рэвалюцыі ў сувязі з пераходам ініцыятывы ў рукі грамадскіх груп, якія перш адыгрывалі другарадную ролю, і іх спроб здзяйснення дэмакратычнага перавароту і разбурэнні саслоўна-іерархічнай сацыяльнай сістэмы. У канчатковым рахунку, асноўным вынікам рэвалюцыі стала фармаванне новай палітычнай сістэмы краіны ў другой палове XVII ст.

Падобная інтэрпрэтацыя была прапанаваная ў працах брытанскага ліберальнага гісторыка **Дж. Эйлмера**. Ён выявіў палітыка-канстытуцыйныя і рэлігійныя разыходжанні ў пазіцыях бакоў, а таксама адрозненні сацыяльна-эканамічнага парадку. Дж. Эйлмер тлумачыў іх своеасаблівасцю эканамічных адносін і сацыяльнай структуры ў розных раёнах Англіі і асаблівасцямі размяшчэння насельніцтва ва ўсходніх і паўднёваўсходніх "парламенцкіх" графствах і цэнтральных і паўночных "раялісцкіх" графствах. На падставе гэтага гісторык рабіў выснову аб перавазе сярэдніх класаў на боку парламента, а арыстакратыі і вярхушкі джэтры – на боку караля. Ён адзначаў якасныя змены, якія адбыліся за гады рэвалюцыі ў сістэме землеўладання і ў грамадска-палітычнай сферы ў карысць сярэдніх пластоў. У прыватнасці, Эйлмер канстатаваў, што пасля "Вялікай рэвалюцыі" 40-50-*х* гадоў XVII ст. у Англіі паўсталі ўмовы, неабходныя для прадпрымальніцкай дзейнасці. Гэтая падзея змяніла свядомасць грамадства, абумовіўшы ў наступным непрыманне ім грамадзянскіх войн.

Важная роля ў абнаўленні ліберальнай канцэпцыі Англійскай рэвалюцыі ў духу новай сацыяльнай гісторыі прыналежыла Л. Стоўну. Ён інтэрпрэтаваў рэвалюцыю як барацьбу саслоўяў і ўтрысаслоўных груп ("правячых эліт") па палітыка-канстытуцыйным, рэлігійным і іншых пытанням. Перадумовы рэвалюцыі тлумачыліся гісторыкам, зыходзячы з азначэння ім палітычнага рэжыму Сцюартаў як крызіснага. Гэты крызіс ("крызіс арыстакратыі"), па меркаванні Стоўна, выяўляўся ў нядзольнасці сістэмы прыстасавацца да эканамічных і сацыяльных змен і ў паступовым адыходзе ад яе часткі правячага класа. Гісторык прызнаваў магчымасць такога сацыяльнага размежавання "правячай эліты", якое мела на ўвазе адасабленне буржуазных джэнтры-прадпрымальнікаў і феадальных джентры-ранцье.

Сярод гісторыкаў марксісцкай арыентацыі, якія займаліся вывучэннем рэвалюцыі, вядучае становішча прыналежыла **Кр. Хілу**. У 60-80-е гады прадметам яго даследавання сталі не столькі эканамічныя і сацыяльна-палітычныя, колькі ідэйна-рэлігійныя і ідэалагічныя перадумовы рэвалюцыі. Самастойнае значэнне ў працах Хіла набыло вывучэнне дынамікі і геаграфіі радыкальных плыняў у

РЭПАЗІТОРЫЙ ГГУ ІМЕНІ Ф. СКАРЫНЫ

Англійскай рэвалюцыі. У працах "Пурытанізм і рэвалюцыя" (1958) "Духоўныя вытокі Англійскай рэвалюцыі" (1980) і іншых Кр. Хіл праводзіў думку аб патэнцыяльных магчымасцях дэмакратычнай плебейскай рэвалюцыі ў 40-50-е гады XVII ст., якім не было наканавана рэалізавацца.

У глыбіні народнай, "трэцяй", па выразе Хіла, культуры ў гады рэвалюцыі выспявалі сацыяльныя асновы плебейскага радыкалізму, які адмаўляў іерархію традыцыйнага грамадства і дзяржаўнай царквы. Па меркаванні гісторыка, Англійская рэвалюцыя XVII ст. завяршылася перамогай уласнікаў і зацвярджэннем іх ідэалогіі. Яе вынікам стала "стварэнне значна больш спрыяльных умоў для развіцця капіталізму, чым тых, якія пераважалі да 1640 г."

У апошняй чвэрці XX ст. праблематыка гісторыі рэвалюцыі вывучалася кансерватыўнымі гісторыкамі ў рамках канцэпцыі "ўсеагульнага крызісу XVII ст.". Яна інтэрпрэтавалася як палітычны канфлікт, запознены варыянт рэфармацыйнага руху, аснову якога склалі супярэчнасці паміж "дваром" – дзяржаўнай уладай, якой былі ўласцівыя ўзмацненне цэнтралізацыі, павелічэнне выдаткаў на ўтрыманне бюракратыі, рэвалюцыйныя пераўтварэнні ў сферы палітыкі і рэлігіі, і "краінай" – грамадствам, ад імя якога імкнуўся выступаць кансерватыўны парламент, які супраціўляўся зменам.

Гісторыкі-кансерватары пастулявалі выпадковы характар узнікнення Грамадзянскай вайны, яны імкнуліся давесці, што гэты канфлікт не меў пад сабой сацыяльна-эканамічных падстаў. Яны адмаўлялі наяўнасць у Англіі арганізаванай парламенцкай апазіцыі і імкнуліся давесці абмежаванасць яе ўплыву на грамадства, паколькі парламент, які збіраўся нерэгулярна, не быў для правінцыйнага грамадства прызнанай нацыянальнай установай. Унутры самой парламенцкай апазіцыі, разрозненай, супярэчлівай, адбываліся, па перакананні гісторыкаў-кансерватараў, сталыя сутыкненні інтэрасаў. "Двор" таксама не быў маналітнай сілай, унутры яго ішла барацьба прыдворных груповак. Аўтары сцвярджалі, што канфлікт парламента з манархіяй уяўляў сабой форму змагання розных груповак за ўлада.

Новыя тэндэнцыі адбіліся на інтэнсіўнасці распрацоўкі сюжэтаў, якія датычыліся уздзеяння падзей у Шатландыі ў 1637 – 1651 гадах на Англійскую рэвалюцыю, і з'яўленне даследаванняў, у якіх гэтыя падзеі вызначаліся як Шатландская рэвалюцыя. Аж да другой паловы XX ст. рэлігійна-палітычныя падзеі ў Шатландыі 30-40-х гадоў XVII ст. разглядаліся брытанскімі гісторыкамі як фон або перыферыя працэсаў, адбываўшыхся ў Англіі. Перыяд 1637 – 1651 гадоў шатландскай гісторыі вызначаўся як палітыка-рэлігійны канфлікт, цэнтральным пунктам якога з'яўлялася барацьба каралеўскай улады Сцюартаў з прэсвітэрыянамі, якія адлюстроўвалі сілы радыкальнай Рэфармацыі царквы. Паміж гісторыяй аб'яднання Англіі і Шатландыі перыяду кіравання Кромвеля і ўніяй 1707 г. праводзілася лагічная сувязь, хоць у першым выпадку паказвалася на прымусовы характар саюза, а ў другім – на яго добраахвотнасць.

**3.** Да другой паловы XX ст. найбольш дынамічнай субдысцыплінай гістарычнага ведання стала "новая сацыяльная гісторыя". Важкі ўклад ў яе станаўленне ўнеслі даследаванні навукоўцаў марксісцкай арыентацыі і гісторыкаў, блізкіх да марксізму: Кр. Хіла, **Э. Хобсбаўма**, **А.Л. Мортана**. Галоўным прадметам

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

новых сацыяльна-гістарычных даследаванняў стала ўнутраны стан грамадства (асобных яго груп і індывідаў). У 70-80-*е* гады XX ст. брытанскія гісторыкі падкрэслівалі інтэгравальную функцыю сацыяльнай гісторыі ў сістэме гістарычных дысцыплін, ставілі перад ёй задачу сінтэзу даследаванняў розных бакоў і працэсаў гістарычнага мінулага. Аднак на практыцы большасць "новых" сацыяльных гісторыкаў канцэнтравала ўвагу на вывучэнні сацыяльных груп, інстытутаў, рухаў з пазіцыі "гісторыі знізу". У гістарыяграфіі з'явіліся такія субдысцыпліны, як дэмаграфічная гісторыя, сацыяльна-інтэлектуальная гісторыя, псіхагісторыя. У 80-е гады вызначыліся такія даследчыя вобласці, як гісторыя сям'і, дзяцінства, адукацыі, горада, злачыннасці, сацыяльная гісторыя медыцыны, сацыяльная гісторыя рэлігіі, "новая працоўная гісторыя", "жаночая гісторыя", "сялянскія даследаванні" і інш. Увага гісторыкаў стала паварочвацца ад вывучэння сацыяльных паводзін, актыўнасці чалавека ў групе і калектыўных паданняў да даследавання індывідуальнай свядомасці, паводзін і іх матывацыі. У 50-60-я гады, калі шырокае распаўсюджванне атрымалі тэорыі мадэрнізацыі і эканамічнага росту, аптымістычная трактоўка прамысловай рэвалюцыі была пацверджаная працамі ліберальных гісторыкаў, якія стваралі новую эканамічную гісторыю (**У.Ростоу**). Ход прамысловай рэвалюцыі ацэньваўся імі як пазітыўны прыклад устойлівага росту эканомікі краіны, следствам якога стала пераадоленне беднасці і скарачэнне сацыяльнай няроўнасці. У працах ліберальных гісторыкаў (**Г.Перкін**) перыяд прамысловага перавароту характарызаваўся карэннымі зменамі ў грамадскай структуры і інстытутах, дзяржаве, умовах жыцця, мысленні сацыяльных пластоў і груп. Сама ж Вялікабрытанія ў адпаведнасці з гэтай інтэрпрэтацыяй выглядала як прыклад дэмакратызацыі грамадства, якая адбылася ў выніку прамысловай рэвалюцыі.

У канцы 50-х – 60-я гады адрадзілася спрэчка (пачатак якой адносіцца да мяжы XIX – XX ст.) аб сацыяльных наступствах індустрыялізацыі. Яна вялася паміж "аптымістамі" – ліберальнымі гісторыкамі і "песімістамі" – гісторыкамі радыкальна-дэмакратычнага і марксісцкага кірункаў аб жыццёвым узроўні рабочых у перыяд прамысловай рэвалюцыі. Ліберальныя гісторыкі імкнуліся даказаць, што прамысловая рэвалюцыя, у канчатковым рахунку, прывяла да паляпшэння жыцця і побыту рабочых і абумовіла прынцыповую змену іх паводзін – ад сляпога бунту да кансенсусу з правячымі класамі (Г. Перкін). Бедствы фабрычных працоўных і разараўшыхся рамеснікаў яны лічылі часавымі сацыяльнымі выдаткамі ранняй стадыі прамысловага капіталізму. Асноўная выснова большасці гісторыкаў зводзіўся да таго, што падчас прамысловай рэвалюцыі ў Вялікабрытаніі склалася "дынамічна стабільнае грамадства". Сярэдні клас, яго эканамічныя пазіцыі, сацыяльныя характарыстыкі, каштоўнасныя арыентацыі, вызначалі аблічча віктарыянскага грамадства ў цэлым.

